Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

**А. А. Трусаў**

# АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь
у якасці вучэбнага дапаможніка
для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці
«Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны»*

Мінск
БДУКМ
2025

УДК 069.44(075.8)
ББК 79.19
Т 789

Р э ц э н з е н т ы :
*кафедра* гісторыі Беларусі і славянскіх народаў
установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка»;
*А. А. Гужалоўскі,* прафесар кафедры этналогіі,
музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага
ўніверсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар;
*Д. В. Дзятко,* загадчык кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі
ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка», доктар філалагічных навук, прафесар

**Трусаў, А. А.**
Т 789 Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей : вучэбны дапаможнік / А. А. Трусаў ; Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2025. – 108 с.
ISBN 978-985-522-386-4.

Выкладзены звесткі па гісторыі кансервацыі і рэстаўрацыі ад зараджэння да сучаснага стану. Асноўнае месца займаюць матэрыялы па кансервацыі, рэстаўрацыі і музеефікацыі помнікаў беларускага дойлідства, а таксама шматлікіх артэфактаў, якія знаходзяцца ў музейным фондзе краіны. Прыводзяцца прыклады кансервацыі і рэстаўрацыі Мірскага і Лідскага замкаў, у якіх прымаў непасрэдны ўдзел аўтар дапаможніка. Дапаўняюць тэкст тэрміналагічны слоўнік і багаты ілюстрацыйны матэрыял, якія прызначаны для актуалізацыі ведаў, замацавання тэарэтычнага матэрыялу і ўдасканалення ўменняў выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы.

Адрасуецца выкладчыкам, студэнтам і магістрантам устаноў вышэйшай адукацыі, а таксама музейным супрацоўнікам і экскурсаводам.

**УДК 069.44(075.8)**
**ББК 79.19**

**ISBN 978-985-522-386-4**

© Трусаў А. А., 2025
© Афармленне. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2025

## Змест

**Уводзіны** ………………………………………………..………. 5

**Р А З Д З Е Л 1**
**ЗАРАДЖЭННЕ І РАЗВІЦЦЁ РЭСТАЎРАЦЫЙНАЙ ПРАКТЫКІ АД АНТЫЧНАСЦІ ДА XX ст.**

1.1. Рэстаўрацыя помнікаў: асноўныя даты і віды …..…….. 7

1.2. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР ………………………………………………………..… 10

1.3. Сістэма крытэрыяў вызначэння гісторыка-культурных каштоўнасцей у СССР і Рэспубліцы Беларусь ………………… 14

**Р А З Д З Е Л 2**
**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСТАЎРАЦЫІ І АХОВЫ ПОМНІКАЎ**

2.1. Вывучэнне, кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры ў БССР і Рэспубліцы Беларусь ………………… 18

2.2. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гістарычнага цэнтра Мінска ……………...……………………... 29

2.3. Рэстаўрацыя мемарыяльных садоў і паркаў …………… 35

2.4. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў ……………………………………………………….. 40

2.5. Гісторыя музейнай рэстаўрацыі ў Беларусі ……….…… 48

**Р А З Д З Е Л 3**
**ЗАХАВАННЕ, КАНСЕРВАЦЫЯ**
**І РЭСТАЎРАЦЫЯ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ**

3.1. Захаванне і кансервацыя вырабаў з дрэва. Археалагічнае дрэва. Археалагічны музей у Бярэсці ………………….. 51

3.2. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя керамічных вырабаў ……………………………………………………… 54

3.3. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў са скуры, косці, шкла і антрапалагічных калекцый ……………… 58

3.4. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з металу …………………………………………………... 63

3.5. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя твораў выяўленчага мастацтва (жывапіс, скульптура, графіка) ………………... 67

**Заключэнне** …………………………………………….. 70

**Спіс нарматыўных прававых актаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны** ………………………………………. 71

**Спіс выкарыстаных крыніц** ……………………………… 72

**Слоўнік архітэктурных і рэстаўрацыйных тэрмінаў** …... 75

**Ілюстрацыі** ……………………………………………... 81

## Уводзіны

Вытокі сучаснай рэстаўрацыі і кансервацыі сягаюць у эпоху першых чалавечых цывілізацый, калі адной з асноўных прымет кожнай з іх стала манументальная архітэктура. Архітэктурныя збудаванні маглі быць створаны толькі вялікай групай людзей пад кіраўніцтвам адмысловых спецыялістаў, якія ўмелі чытаць і пісаць, валодалі навыкамі ў сферы матэматыкі і іншых дакладных навук.

Такія будынкі станавіліся сімваламі дзяржавы, альбо гістарычнай эпохі, у якую яны былі створаны, іх стараліся захаваць альбо аднавіць пасля войнаў, пажараў, прыродных катастроф. У сваю чаргу гэтыя збудаванні імкнуліся знішчыць альбо капітальна перабудаваць заваёўнікі ці рэлігійныя рэфарматары. Так, напрыклад, было на тэрыторыі Іспаніі, калі ў эпоху Рэканкісты каталікі перабудоўвалі мусульманскія мячэці ў хрысціянскія храмы.

> Кожны народ з павагай ставіцца да сваёй гістарычнай спадчыны, аб’ектаў як матэрыяльнай, так і нематэрыяльнай духоўнай культуры. Аднак звычайна новае пакаленне людзей па-свойму адносіцца да культурнага асяроддзя, фарміруе пры гэтым свае ўяўленні аб прыгажосці і гісторыі мінулага. Таму помнікі архітэктуры і мастацтва ўвесь час перабудоўваліся, прыстасоўваліся да патрэб пакаленняў. Адны хацелі пакінуць старажытны помнік такім, які ён ёсць, як памяць пра слаўнае мінулае, а другія намагаліся яго перарабіць і прыстасаваць да новых умоў жыцця ці наогул знішчыць, каб на яго месцы пабудаваць нешта іншае.

У XVIII ст., асабліва ў эпоху Асветніцтва людзі пачалі больш цікавіцца сваёй нацыянальнай гісторыяй, параўноўваць яе з гісторыяй суседніх народаў, вывучаць гісторыю такіх старажытных цывілізацый, як Егіпет, Старажытная Грэцыя і Рым, Візантыя, краіны Блізкага і Далёкага Усходу.

У эпоху рамантызму (канец XVIII – пачатак XIX ст.) кардынальна змяніліся адносіны да Сярэдневякоўя, асабліва ў Францыі, дзяржавах на тэрыторыі Італіі і Германіі, Аўстрыі і Расіі. Так, ў Заходняй Еўропе ўзніклі такія мастацка-архітэктурныя напрамкі, як псеўдаготыка і неаготыка, а ў Расійскай імперыі – псеўдавізантыйскі і псеўдарускі стылі.

Якраз у эпоху рамантызму адбываюцца першыя спробы рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры ў Францыі, Англіі, Германіі, Аўстрыі і Расіі. Дзякуючы раману Віктора Гюго «Сабор Парыжскай Божай Маці» французы звярнулі ўвагу на адзін з галоўных помнікаў архітэктуры Парыжа і ўсёй Францыі. У Расіі, дзякуючы дзейнасці гісторыка М. М. Карамзіна, была звернута ўвага на помнікі архітэктуры

Масквы. У часы караля Станіслава Аўгуста вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры пачалося і на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Пасля яе раздзелаў Кракаў становіцца цэнтрам падрыхтоўкі кадраў польскіх рэстаўратараў XIX ст. Вялікую ролю ў вывучэнні помнікаў гісторыі мастацтва былой Рэчы Паспалітай адыграў Віленскі ўніверсітэт у першай палове (да 1831 г.) XIX ст.

Гісторыя беларускай рэстаўрацыі налічвае некалькі стагоддзяў, і за гэты час адносіны да гісторыка-культурнай спадчыны неаднаразова змяняліся. Першыя спробы кансервацыі і захавання некаторых унікальных помнікаў гісторыі і культуры адносяцца да канца XVIII – пачатку XIX ст. Пасля 1921 г., калі Беларусь была падзелена паміж Расіяй і Польшчай, у Заходняй Беларусі плённа працавалі польскія кансерватары, а на тэрыторыі БССР пачалося шматгадовае змаганне з рэлігіяй, а пасля 1930 г. масавае знішчэнне ці перабудова архітэктурных аб’ектаў. Сітуацыя стала мяняцца да лепшага з канца 60-х гг. XX ст. Да 1968 г. складзены спіс помнікаў першачарговай важнасці. Пры Міністэрстве культуры БССР была створана спецыяльная рэстаўрацыйная арганізацыя, якая мела вытворча-рэстаўрацыйныя ўчасткі ў Полацку, Гомелі, Брэсце, Магілёве, Мсціславе і Міры. Больш чым на 20-ці аб’ектах пачаліся кансервацыйныя і рэстаўрацыйныя работы, у тым ліку ў Полацку (Сафійскі сабор), Заслаўі (Спаса-Праабражэнская царква), Гомелі (капліца-пахавальня Паскевічаў), Магілёве (Свята-Мікольскі манастыр і царква), Мсціславе (Кармеліцкі касцёл), Брэсце (Брэсцкая крэпасць-герой). У 1969 г. быў прыняты закон «Аб ахове помнікаў культуры».

У 80–90-х гг. XX ст. склалася айчынная школа беларускай рэстаўрацыі, сярод прадстаўнікоў якой архітэктары *Валерый Рыгоравіч Слюнчанка, Сяргей Аляксандравіч Друшчыц, Сяргей Георгіевіч Багласаў,* майстры па аднаўленні фрэсак, абразоў і скульптуры – *Аркадзь Самуілавіч Шпунт, Пётр Рыгоравіч Журбей, Уладзімір Васільевіч Ракіцкі, Юрый Іванавіч Маліноўскі.*

З 1980 г. праводзілася рэканструкцыя Траецкага прадмесця ў гістарычным цэнтры Мінска. У 1988 г. архітэктары Беларускага рэстаўрацыйна-праектнага інстытута прадставілі канцэпцыю рэгенерацыі гістарычнай забудовы прадмесцяў сталіцы. У 1992 г. прынялі Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны».

У незалежнай Беларусі аднаўляюцца некаторыя шэдэўры архітэктуры і музейныя артэфакты, і праблема кансервацыі і рэстаўрацыі набывае першароднае значэнне.

Вучэбны дапаможнік «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей» прызначаны для будучых спецыялістаў у галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Таксама дапаможнік уяўляе цікавасць для студэнтаў кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва.

Падчас працы над дапаможнікам аўтар выкарыстоўваў матэрыялы айчынных і замежных даследчыкаў: Л. В. Аляксеева, Ю. У. Аляксеева, С. Г. Багласава, В. В. Глінніка, В. В. Калніна, А. І. Лакоткі, С. С. Пад’япольскага, В. Р. Слюнчанкі і інш.

# РАЗДЗЕЛ 1

# ЗАРАДЖЭННЕ І РАЗВІЦЦЁ РЭСТАЎРАЦЫЙНАЙ ПРАКТЫКІ АД АНТЫЧНАСЦІ ДА XX ст.

## 1.1. Рэстаўрацыя помнікаў: асноўныя даты і віды

Як толькі ў Еўропе ўзнікае манументальнае дойлідства, спачатку ў Грэцыі, а потым і ў Рыме, каменныя будынкі, асабліва храмы, падтрымліваюць, ахоўваюць, стараюцца аднаўляць пасля пажараў і войнаў. Калі старыя будынкі разбураліся, будаўнічыя матэрыялы і некаторыя іх дэталі выкарыстоўвалі пры будаўніцтве новых. Так, у новыя збудаванні пераносілі найбольш цікавыя архітэктурныя фрагменты, асабліва калоны і гарэльефы.

У часы Рымскай імперыі, калі хрысціянства стала новай дзяржаўнай рэлігіяй, старыя культавыя будынкі (базілікі) пачалі выкарыстоўваць як храмы, захоўваючы планіроўку і канструкцыі. У 458 г. н. э. імператар Маярыян выдаў спецыяльны эдыкт з мэтай захавання архітэктурнай спадчыны.

У эпоху Сярэдневякоўя некаторыя кіраўнікі новых краін, якія паўсталі на руінах Заходняй Рымскай імперыі, спрабавалі выкарыстоўваць антычную спадчыну ў сваіх інтарэсах.

Так, остгоцкі кіраўнік Італіі Тэадорых Вялікі (493–526) актыўна аднаўляў гарадскія ўмацаванні, масты, дарогі і водаправоды ў Рыме і сталіцы яго каралеўства Равене.

Непадалёку ад Равены быў пабудаваны маўзалей Тэадорыха, узор дараманскага мастацтва, які захаваўся да нашага часу. Прававая сістэма дзяржавы грунтавалася на выдадзеным каля 500 г. Эдыкце Тэадорыха, зборніку законаў, які складаўся са 155 артыкулаў. У ім гаварылася і аб ахове былой антычнай спадчыны.

У часы праўлення Карла Вялікага (768–814), які ствараў «імперыю франкаў», у 798 г. у Ахене сталі будаваць мураваны храм, які быў асвечаны ў 805 г. Асноўныя залы храма аздоблены шматлікімі мазаікамі ў антычным стылі. Захаваўся мармуровы склеп з магілай імператара, які шанаваў антычную спадчыну і зрабіў у сваёй краіне лацінскую мову дзяржаўнай.

Вялікае значэнне антычнай спадчыне надавалі італьянскія архітэктары і мастакі ў эпоху Рэнесансу.

*Філіпа Брунелескі* – пачынальнік архітэктуры Адраджэння – вярнуў ва ўжытак такія традыцыі Антычнасці, як выкарыстанне калон, пілястраў і арак. Другі італьянскі дойлід *Леон Бацicта Альберці* пры стварэнні пала-

цаў увасабляў вобраз антычнай архітэктуры праз рэльефы плоскіх пілястраў і іншых элементаў.

У Цэнтральнай і Паўночнай Еўропе ў XIV–XV стст. дабудавана шмат гатычных сабораў, у тым ліку і славуты сабор Парыжскай Божай Маці. Сярод прыхільнікаў новага мастацтва рымскія папы Павел II і Сікст IV, якія выдаюць у XV ст. спецыяльныя булы ў яго падтрымку.

У Расіі цар Пётр I выдае спецыяльныя ўказы з мэтай аховы і вывучэння старажытных помнікаў гісторыі і культуры. У Францыі ў канцы XVII ст. праводзіцца першая рэстаўрацыя царквы абацтва Сен-Мексан (святога Максенцыя). У XVIII ст. фарміруецца архітэктурная археалогія. Праводзяцца археалагічныя раскопкі антычных гарадоў Пампеяў і Геркуланума. Раскапаныя руіны захоўваюць і паказваюць турыстам.

Значную ролю ў развіцці еўрапейскай рэстаўрацыі і ахове помнікаў адыграла *Францыя*. Пра гэта сведчаць дэкрэты Нацыянальнага канвента, прынятыя ў канцы XVIII ст. У 1793 г. каралеўскі палац у Луўры становіцца першым публічным музеем. У 1795 г. адкрыўся Музей французскіх манументаў, заснаваны гісторыкам *Аляксандрам Ленуарам*. Пасля егіпецкага паходу Напалеона еўрапейцы даведаліся пра егіпецкую цывілізацыю і яе архітэктуру. Адзін з егіпецкіх абеліскаў быў прывезены і ўсталяваны ў цэнтры Парыжа. У 1830 г. ствараецца першая ў свеце Генеральная інспекцыя па ахове помнікаў.

Аднаўляюць антычныя помнікі ў Італіі. Архітэктар *Рафаэле Стерн* у 1818–1821 гг. праводзіць рэстаўрацыю Калізея і ўмацоўвае знешняе кальцо сцен амфітэатра цаглянымі контрфорсамі. У Рыме ў 1824 г. рэстаўратар *Джузэпэ Валадзье* аднаўляе арку імператара Ціта.

У Расіі ў абарону гістарычных помнікаў Масквы і іншых гарадоў выступае *М. М. Карамзін*. Праводзіцца рэстаўрацыя Маскоўскага Крамля, які пацярпеў у 1812 г. ад войска Напалеона.

Вялікую ролю ў развіцці еўрапейскай рэстаўрацыі адыграла такая мастацкая плынь, як *рамантызм*. У 1795 г. гэты тэрмін з’явіўся ў працах нямецкага філосафа Ф. Шлегеля. У канцы XVIII ст. амаль адначасова рамантызм распаўсюджваецца ў Германіі, Англіі, Францыі і Расіі. У яго аснову пакладзена ўяўленне пра супрацьстаянне ідэальнага свету і рэальнага.

Рамантыкі выказвалі вялікую зацікаўленасць да гісторыі, але не разглядалі яе як прыклад для сучаснасці. У цэнтры іх увагі былі пераломныя гістарычныя эпохі, шырокія народныя рухі і рамантычны герой-лідар. У першую чаргу іх цікавіла не антычная архітэктура, а гатычная. Таму і з’явіліся ў еўрапейскай архітэктуры такія стылі, як псеўдаготыка і неаготыка.

Вялікая заслуга ў развіцці рэстаўрацыі належыць французскаму архітэктару і мастацтвазнаўцу *Эжэну Эмануэлю Віяле-ле-Дзюку*, які займаўся рэстаўрацыяй і вывучэннем помнікаў Сярэдневякоўя.

Першая яго рэстаўрацыйная работа – базіліка абацтва  Сэнт Мадлен (святой Марыі Магдаліны) у Везле. Гэта была раманская пабудова з гатычнымі дабаўленнямі. Пры рэстаўрацыі Віяле-ле-Дзюк прыбраў гатычныя элементы, пакінуўшы толькі больш раннія раманскія, і ўзнавіў царкву ў раманскім стылі.

Наступнай яго работай стала рэстаўрацыя сабора Парыжскай Божай Маці. Былі перароблены вокны ў формах XII ст., адноўлены скульптуры галоўнага партала. Самастойна Віяле-ле-Дзюк аднавіў статуі хімер, якія не захаваліся. Узнаўляючы шпіль над трансептам, архітэктар упрыгожыў яго выявамі сябе і сваіх памочнікаў. Ён займаўся рэстаўрацыяй французскіх замкаў і іншых аб’ектаў. Асабліва вылучаюцца аднаўленне ўмацаванняў г. Каркасона і замка П’ерфон.

Э. Віяле-ле-Дзюк сфармуляваў тэарэтычныя пазіцыі рэстаўрацыі – *стылістычная,* ці *рамантычная, рэстаўрацыя.* Асноўны прынцып такой рэстаўрацыі: узнаўленне будынкаў у першапачатковым выглядзе, стылістычна адзіным, без напластаванняў. Усе пашкоджаныя элементы выдаляліся і замяняліся копіямі.

Стылістычная рэстаўрацыя распаўсюдзілася па ўсёй Еўропе, і ў многіх краінах пачалі праводзіць аднаўленне архітэктурных помнікаў. Аднак не ўсе былі згодны з такім метадам рэстаўрацыі [21; 23]. Сярод іх быў італьянскі архітэктар *Каміла Бóйта,* які выступаў за стварэнне і ўмацаванне адзінага ў Італіі архітэктурнага «нацыянальнага стылю», за захаванне «гістарычнай паціны» на помніках архітэктуры. На яго погляд, помнікі гісторыі і архітэктуры павінны заставацца з усімі зменаннямі і дапаўненнямі, якія былі ўнесены на працягу іх існавання. Ён прапанаваў *новыя метады рэстаўрацыі: «філалагічная», жывапісная* і *архітэктурная.* Яго ідэі падтрымаў аўстрыйскі рэстаўратар *Алоіз Рыгль.* Ён выступаў за захаванне позніх элементаў будынкаў, паказ слядоў іх змен у гістарычным працэсе.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у Еўропе (асабліва ў Грэцыі) узнікае новая рэстаўрацыйная плынь – *археалагічная рэстаўрацыя,* калі вакол помніка і на ім абавязкова праводзяцца археалагічныя даследаванні. Адзін з тэарэтыкаў археалагічнай рэстаўрацыі *Густава Джаваноні* прапанаваў падзяляць яе на 5 этапаў: *умацаванне, анастылоз* (гл. слоўнік), *раскрыццё, дапаўненне, аднаўленне.*

У XIX ст. археалагічная рэстаўрацыя пачала развівацца і ў Расійскай імперыі. Першыя спробы археалагічнай рэстаўрацыі зроблены ў Кіеве (раскопкі і ўмацаванне Залатой брамы) архітэктарам *Вікенціям Бярэці.* Архітэктар *Фёдар Фёдаравіч Рыхтар* упершыню перад рэстаўрацыяй рабіў архітэктурныя абмеры помнікаў дойлідства (Маскоўскі Крэмль).

У 1859 г. у Пецярбургу стварылі Імператарскую археалагічную камісію (1859–1917). З 1889 г. яна дазваляла раскопкі на дзяржаўных, гарадскіх і сялянскіх землях (акрамя памешчыцкіх) і кантралявала іх.

Камісія праводзіла работу па выяўленні і ўліку помнікаў старажытнасці, іх ахове і рэстаўрацыі.

У канцы XIX – пачатку XX ст. у Расійскай імперыі склалася айчынная рэстаўрацыйная школа. Сярод вядомых рэстаўратараў варта адзначыць *Уладзіміра Васільевіча Суслава, Аляксея Віктаравіча Шчусева* і *Пятра Пятровіча Пакрышкіна.*

Так, У. Суслаў да 1900 г. зрабіў рэстаўрацыю Сафійскага сабора XI ст. у Ноўгарадзе, А. Шчусеў у 1904–1911 гг. аднавіў храм Св. Васіля XII ст. у г. Оўручы на Украіне, а П. Пакрышкін – царкву Спаса на Нярэдзіцы паблізу ад Ноўгарада (1903–1904) і храм Спаса на Бераставе ў Кіеве (1909), які раней быў перабудаваны ў стылі ўкраінскага барока [21].

* * *

*Падводзячы вынікі, можна адзначыць, што на працягу XIX – пачатку XX ст. склаліся асноўныя прынцыпы рэстаўрацыйных работ, тэарэтычна і практычна абгрунтаваныя.*

## 1.2. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР

У 1917 г. быў ліквідаваны інстытут прыватнай уласнасці на зямлю і на ўсе будынкі, якія на ёй стаялі, і зроблена іх нацыяналізацыя.

Найбольш пацярпелі вернікі розных канфесій, бо бальшавікі абвясцілі вайну рэлігіі і праводзілі палітыку ваяўнічага атэізму. Пад пагрозай апынуліся тысячы храмаў і манастыроў.

У перыяд з лістапада 1917 г. па 1919 г. царкву пазбавілі права юрыдычнай асобы, а духавенства – палітычных правоў, закрылі некаторыя манастыры і храмы, зрабілі частковую рэвізію маёмасці царквы. У распараджэнні ад 1 мая 1919 г. Ленін загадаў святароў расстрэльваць, а храмы зачыняць, іх памяшканні ператвараць у склады. У Дэкрэце УЦВК ад 23 лютага 1922 г. Ленін распарадзіўся канфіскаваць царкоўныя каштоўнасці. Адбылася канфіскацыя каштоўнасцей галоўнага храма Расійскай імперыі – Хрыста Збавіцеля (5 снежня 1931 г. храм быў узарваны).

У 1925 г. на аснове таварыства сяброў газеты «Бязбожнік» была створана масавая грамадская арганізацыя «Саюз бязбожнікаў», якая потым (да 1947 г.) мела назву «Саюз ваяўнічых бязбожнікаў». Таксама існавала і выдавецтва «Бязбожнік».

Інтэлігенцыя патрабавала ад новай улады аховы помнікаў гісторыі і культуры, у тым ліку старажытных будынкаў. 5 кастрычніка 1918 г. Ленін загадаў правесці першую дзяржаўную рэгістрацыю ўсіх манументальных і рэчавых помнікаў мастацтва і старажытнасці.

18 красавіка 1919 г. на базе Імператарскай археалагічнай камісіі была створана Расійская Акадэмія гісторыі матэрыяльнай культуры. (Пасля Вялікай Айчыннай вайны гэтая ўстанова атрымала назву Інстытут археалогіі АН СССР.)

У перыяд НЭПа сітуацыя ў культурным жыцці краіны палепшылася. Адбылася рэстаўрацыя Крамля, сабора Пакрова Прасвятой Багародзіцы на Рву (храм Васіля Блажэннага), сцен і вежаў Кітай-горада ў Маскве.

У 1924 г. былі створаны Цэнтральныя дзяржаўныя рэстаўрацыйныя майстэрні з філіяламі ў Ленінградзе і Яраслаўлі. Кіраўніком арганізацыі прызначаны *Ігар Эмануілавіч Грабар* – тэарэтык савецкай рэстаўрацыі.

Ён нарадзіўся ў Будапешце ў 1871 г. у інтэлігентнай сям'і. Яго бацька быў дэпутатам венгерскага парламента, а маці займалася адукацыйнай дзейнасцю ў Закарпацці і Галіцыі. У 1876 г. І. Грабар пераехаў у Расію, дзе стаў вядомым мастаком. Ён таксама займаўся гісторыяй мастацтва, а з 1913 г. прызначаны папячыцелем (кіраўніком) Траццякоўскай галерэі ў Маскве (да 1925 г.). Пасля рэвалюцыі з 1919 г. І. Грабар стаў сябрам Расійскай Акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры, а з 1921 г. – прафесарам Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе чытаў курс лекцый па тэорыі і практыцы навуковай рэстаўрацыі на аддзяленні мастацтваў. Свае погляды ён сфармуляваў у лекцыях па рэстаўрацыі, якія прачытаў у 1927 г. у МДУ.

> І. Грабар не падзяляў рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры і іншых аб'ектаў мастацтва на асобныя віды, прычым спецыфіка работ на розных тыпах аб'ектаў устанаўліваецца на стадыі апісання тэхнічных прыёмаў рэстаўрацыі. Рэстаўрацыя, на яго думку, уваходзіць у паняцце *«кансервацыя»,* пад якім ён разумеў *сукупнасць мер, накіраваных на паляпшэнне ўмоў захавання помніка.*
>
> У рэстаўрацыі І. Грабар выдзяляў два асноўныя моманты: *раскрыццё* і *ўзнаўленне*, прычым першае больш пераважнае пры ўмове, што не руйнуецца нічога гістарычна каштоўнага. Любая рэстаўрацыя павінна праводзіцца па неабходнасці, а не дзеля самой рэстаўрацыі. І. Грабар лічыў неабходным абазначаць новыя ўключэнні ў помнік, якія павінны адрозніваццa ад сапраўдных, але быць з падобных матэрыялаў, каб пазбегнуць эфекту іх несумяшчэння [21].

Вялікая работа ў гэтыя гады была праведзена *Пятром Дзмітрыевічам Бараноўскім*: рэстаўрацыя палацаў Галіцына ў Ахотным Радзе, Казанскага сабора на Чырвонай плошчы, Троіцкага Болдзіна манастыра пад Дарагабужам і інш. Работа П. Бараноўскага, дарэчы беларуса, мела шмат рэстаўрацыйных дадаткаў. У некаторых выпадках, як, напрыклад, з палацамі Галіцына, была поўнасцю адноўлена фасадная дэкарацыя. Аднаўлялася яна з рэдкай дакладнасцю і дакументаванасцю, дзякуючы метаду развярстоўкі муроўкі па хваставых частках цэглы, якая засталася каля сцяны. Гэты метад быў прапанаваны П. Бараноўскім упершыню.

П. Бараноўскі выступіў з ініцыятывай зрабіць музеем падмаскоўную царскую рэзідэнцыю ў Каломенскім і ў 1924 г. стаў яго першым дырэктарам. Тут ён стварыў сваю школу рэстаўратараў, якія перавозілі ў Каломенскае ўнікальныя помнікі драўлянага дойлідства, ператвараючы іх у музейныя аб'екты.

У гэты час пачалася рэстаўрацыя помнікаў Сярэдняй Азіі, якой кіраваў *Барыс Мікалаевіч Засыпкін.* Асаблівую ўвагу ён надаваў пытанням археалагічна-архітэктурнага даследавання помнікаў. Праграма такога вывучэння даволі вялікая і, акрамя фіксацыі, уключае тэхнічнае і тэхналагічнае даследаванне, вывучэнне канструкцый, архітэктурных форм, дэкору, выяўленне старажытных частак, раскрыццё і аналіз атрыманых матэрыялаў. Сінтэзам з'яўляецца рэканструкцыя помніка і яго рэстаўрацыя (пад рэканструкцыяй рэстаўратар разумеў частковую ці фрагментарную рэстаўрацыю).

Аднак у 30-я гг. XX ст. пачынаюцца масавыя сталінскія рэпрэсіі, усе рэстаўрацыйныя работы прыпыняюцца, адбываецца сістэматычнае знішчэнне помнікаў, нават адрэстаўраваных (храм Хрыста Збавіцеля, Сухарава вежа і інш.), зачыняюцца Цэнтральныя дзяржаўныя рэстаўрацыйныя майстэрні. П. Бараноўскага арыштавалі, і ён некалькі гадоў быў у адным са сталінскіх лагераў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны 1941–1945 гг. шмат унікальных помнікаў гісторыі і культуры было разбурана, аднак адносіны да праваслаўнай царквы і вернікаў іншых канфесій змяніліся. У 1943 г. Сталін дазволіў абраць патрыярха Сергія кіраўніком Рускай праваслаўнай царквы. На акупаванай тэрыторыі немцы, каб прыцягнуць мясцовае насельніцтва на свой бок, дазволілі дзейнічаць хрысціянскім вернікам, як праваслаўным, так і каталіцкім, аднак масава знішчалі будынкі сінагог. Пасля выгнання немцаў храмы, адчыненыя пры іх, адразу не зачыніліся, а дзейнічалі пэўны час – да новай хвалі змагання з рэлігіяй.

У адпаведнасці з Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 лістапада 1942 г. была створана Надзвычайная Дзяржаўная Камісія па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў і іх саўдзельнікаў і прычыненых імі страт грамадзянам, калгасам, грамадскім арганізацыям, дзяржаўным прадпрыемствам і ўстановам СССР. На месцах ствараліся абласныя камісіі, якія актыўна дзейнічалі і на тэрыторыі БССР.

Да працы галоўнай камісіі ў якасці эксперта быў далучаны і П. Бараноўскі. Пасля вызвалення Чарнігава ён прыехаў сюды, каб абследаваць мясцовыя помнікі архітэктуры. Калі ён вывучаў руіны царквы Параскевы Пятніцы, якую тады адносілі да XVII ст., то заўважыў муры больш ранняга храма канца XII – пачатку XIII ст., пазней перабудаванага. Дзякуючы намаганням П. Бараноўскага царква была адноўлена ў першапачатковым выглядзе.

Да рэстаўрацыйнай працы вярнуўся І. Грабар. З 1944 г. ён зноў узначальвае Цэнтральныя дзяржаўныя рэстаўрацыйныя майстэрні. З 1947 г. па

яго прапанове пачалося аднаўленне ў Маскве Андронікава манастыра, дзе быў створаны музей старажытнарускага мастацтва імя Андрэя Рублёва.

> 14 кастрычніка 1948 г. Савет Міністраў прыняў пастанову, у якой абгрунтоўвалася неабходнасць аховы, вывучэння і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры. У саюзных рэспубліках ствараліся рэстаўрацыйныя арганізацыі. Першыя з іх узніклі ў Літве. Менавіта ў Літве рэстаўратары дасягнулі вялікіх поспехаў. Быў адноўлены Тракайскі замак, гістарычны цэнтр Вільнюса, помнікі Каўнаса і Клайпеды, створаны музей-скансен. У Расіі вялікія рэстаўрацыйныя цэнтры былі створаны ў Маскве, Ленінградзе, Ноўгарадзе, Пскове і Уладзіміры [21].

У Маскве П. Бараноўскі арганізаваў студэнцкае аб'яднанне – клуб «Родина», якое існавала да 1972 г. і дапамагала рабіць кансервацыю і рэстаўрацыю помнікаў гісторыі і культуры.

Чарговы ўдар па культавай архітэктуры СССР нанесла хрушчоўская канцэпцыя змагання з рэлігіяй. Сотні бажніц, што належалі вернікам розных канфесій, былі зачынены, перароблены ў клубы і зернясховішчы або цалкам знішчаны.

У сярэдзіне 1960-х гг. сітуацыя ў краіне стала паляпшацца. У саюзных рэспубліках былі створаны добраахвотныя таварыствы аховы помнікаў гісторыі і культуры, якія аб'ядноўвалі мільёны ўдзельнікаў. Частка грашовых сродкаў, якія збіралі сябры гэтых арганізацый, ішлі на рэстаўрацыю розных помнікаў гісторыі і архітэктуры. Для аднаўлення помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны Таліна і Рыгі былі запрошаны польскія рэстаўратары.

У часы «перабудовы» адбываюцца станоўчыя змены ў савецкім заканадаўстве, спыняецца змаганне з рэлігіяй. Пасля 1988 г. вернікам пачалі вяртаць забраныя ў іх будынкі храмаў і дазволілі будаваць новыя. Ствараюцца савецкі Фонд культуры і часопіс «Наследие».

* * *

> *Такім чынам, у СССР рэстаўрацыя адбывалася на некалькіх этапах: ад станаўлення ў 1920-я гг. да поўнай забароны ў 1930-я гг. і аднаўлення ў пачатку 50-х гг. XX ст. Росквіт савецкай рэстаўрацыі прыпадае на 70–80-я гг. мінулага стагоддзя.*

## 1.3. Сістэма крытэрыяў вызначэння гісторыка-культурных каштоўнасцей у СССР і Рэспубліцы Беларусь

У сярэдзіне 1960-х гг. стаўленне да рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры ў СССР і БССР змяняецца. У снежні 1966 г. створана Добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, якое да канца 1970-х гг. налічвала каля мільёна чалавек. На грошы, сабраныя сябрамі таварыства, пачалася рэстаўрацыя помнікаў архітэктуры, у тым ліку і культавых будынкаў. У 1968 г. быў складзены спіс помнікаў для рэстаўрацыі першачарговай значнасці. У яго ўвайшлі Сафійскі сабор у Полацку, Спаса-Праабражэнская царква ў Заслаўі, капліца-пахавальня Паскевічаў у Гомелі, Свята-Мікольскі манастыр у Магілёве і некаторыя іншыя аб'екты.

У 70–80-х гг. XX ст. тэарэтыкі савецкай рэстаўрацыі распрацавалі асноўныя *крытэрыі вызначэння каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры* ў СССР:

– гістарычная,
– горадабудаўнічая,
– архітэктурна-эстэтычная,
– эмацыянальна-мастацкая,
– навукова-рэстаўрацыйная,
– функцыянальная.

Яны лічылі, што вярнуць помнікам першапачатковае аблічча, прыстасаваць пад культурна-асветныя ўстановы магчыма толькі на падставе навукова-абгрунтаванай рэстаўрацыі.

> Сучасныя прынцыпы рэстаўрацыі вымагаюць не толькі ўмацавання і адбудовы помнікаў архітэктуры, але і ўключэння іх у архітэктурную кампазіцыю сучаснай забудовы гарадоў і вёсак, прыстасавання да новых культурна-эстэтычных патрабаванняў. Калі толькі ўмацаваць ці нават адбудаваць архітэктурны помнік і не вырашыць праблему яго выкарыстання, ён застанецца нерухомым матэрыяльным аб'ектам. Каб шэдэўр дойлідства ці сціплы прадстаўнік радавой гістарычнай гарадской забудовы паўнакроўна ўвайшоў у сённяшняе жыццё, трэба надаць яму новую, сучасную функцыю, якая б не толькі падкрэсліла яго гістарычна-мастацкую каштоўнасць, але і адзначыла, узмацніла яе, надала ёй новае эстэтычнае гучанне.
>
> Такі прынцып атрымаў назву *«рэваларызацыя»*, што азначае ў дадзеным выпадку пераасэнсаванне ідэйна-эстэтычнай каштоўнасці аб'ектаў.

Рэвалярызацыя ўключае комплекс работ па «ажыўленні» помніка: кансервацыю, навуковую рэстаўрацыю і архітэктурнае прыстасаванне яго да сучасных патрэб грамадства. Менавіта прыстасаванне вызначае выбар сродкаў кансервацыі і рэстаўрацыі і, самае галоўнае, з'яўляецца сувязным звяном паміж мінулым і сучасным бытаваннем помніка. У якасці прык-

ладу можна прывесці адраджэнне Траецкага і Ракаўскага прадмесцяў, забудову вуліц Максіма Багдановіча і Зыбіцкай у Мінску [8].

У СССР з мэтай прапаганды і аховы выдатных помнікаў гісторыі і культуры было запланавана агульнае выданне «Збор помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР». Кожнай саюзнай рэспубліцы былі выдзелены фінансавыя сродкі, але да канца 1991 г. гэтую праграму цалкам выканала толькі БССР. «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» быў выдадзены ў 1984–1988 гг. у Мінску ў 7 тамах (8 кнігах). «Збор» уключае 14 332 артыкулы. Гэта помнікі гісторыі, археалогіі, архітэктуры, манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва пэўных рэгіёнаў. Пасля выхаду кніг у 1988 г. Савет Міністраў БССР пастановай № 32 зацвердзіў спісы нерухомых помнікаў гісторыі і культуры рэспубліканскага значэння з падзелам іх на помнікі гісторыі, архітэктуры, мастацтва і археалогіі [29].

13 лістапада 1992 г. быў прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», у які на працягу гадоў уносіліся змены і дадаткі.

У Законе прапісаны наступныя паняцці і тэрміны: гісторыка-культурная спадчына, культурны пласт, калекцыя, гісторыка-культурныя каштоўнасці і інш.

Закон рэгуляваў выяўленне матэрыяльных аб’ектаў і нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, якія могуць валодаць гісторыка-культурнай каштоўнасцю; наданне ім статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці; іх улік, захаванне, аднаўленне; фінансаванне аховы гісторыка-культурнай спадчыны, а таксама адказнасць за парушэнне закону.

> У адпаведнасці з заканадаўствам быў складзены Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь, зацверджаны пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 мая 2007 г. № 578 і ад 3 верасня 2008 г. № 1288.

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключае помнікі археалогіі, архітэктуры, гісторыі, горадабудаўніцтва, мастацтва, адзначаныя ў «Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», спісы помнікаў гісторыі і культуры рэспубліканскага і мясцовага значэння, зацверджаныя адпаведна пастановай Савета Міністраў БССР ад 18 лютага 1988 г. № 32 і рашэннямі абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, а таксама матэрыяльныя аб’екты, нематэрыяльныя праяўленні творчасці чалавека, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці паводле ўведзенага ў 1992 г. у дзеянне заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

Парадак вядзення Дзяржаўнага спіса зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 чэрвеня 2006 г. № 762. У 2009 г. выйшла выданне «Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей

Рэспублікі Беларусь»*, у якім звесткі аб гісторыка-культурных каштоўнасцях катэгорый «0», «1» і «2» дапоўнены здымкамі, апісаннем і кароткай гістарычнай даведкай.

У 2016 г. быў прыняты «Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры» [15]. Артыкул 83 Кодэкса вызначае наступныя віды матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей:

– дакументальныя помнікі,
– запаведныя мясціны,
– помнікі археалогіі,
– помнікі архітэктуры,
– помнікі гісторыі,
– помнікі горадабудаўніцтва,
– помнікі мастацтва.

У артыкуле 114 пералічваюцца наступныя віды рамонтна-рэстаўрацыйных і іншых работ, якія выконваюцца на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях:

– аднаўленне,
– дапаўненне,
– кансервацыя,
– прыстасаванне,
– перамяшчэнне,
– рамонт,
– раскрыццё,
– рэгенерацыя,
– рэканструкцыя,
– рэстаўрацыя (рэстаўрацыйна-аднаўленчыя работы).

Сістэма беларускага заканадаўства аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны сфарміравана ў выніку дзейнасці ў гэтай сферы на працягу дзесяцігоддзяў спецыялістаў розных прафесій і заснавана на сусветным вопыце захавання старажытнасцей, а таксама адлюстравана ў нацыянальных прававых актах, міжнародных нарматыўных прававых дакументах, гісторыя развіцця якіх налічвае два з паловай стагоддзі.

Законам Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2022 г. № 201-З у Кодэкс былі ўнесены змяненні і дапаўненні, якія набылі моц 1 жніўня 2022 г., 1 студзеня 2023 г., 1 ліпеня 2025 г.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 29 студзеня 2021 г. № 53 зацверджана Дзяржаўная праграма «Культура Беларусі» на 2021–2025 гады. Гэта праграма складаецца з пяці частак (падпраграм). Першая падпраграма «Культурная спадчына» прадугледжвае дзяржаўную падтрымку ў справе аховы культурнай спадчыны, фарміруе спіс рамонтна-рэстаўрацыйных работ на аб’ектах, што з’яўляюцца помнікамі гісторыі і архітэктуры [11].

---

* Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь / склад.: В. Я. Абламскі, І. М. Чарняўскі, Ю. А. Барысюк. – Мінск : БЕЛТА, 2009. – 684 с.: іл.

У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь уключаны больш за 5,6 тысяч гісторыка-культурных каштоўнасцей, у ліку якіх шматлікія помнікі архітэктуры, горадабудаўніцтва, гісторыі, археалогіі, мастацтва.

* * *

*Такім чынам, галоўнымі напрамкамі дзейнасці ў галіне аховы культурнай спадчыны з'яўляюцца кансервацыя, рэстаўрацыя, а таксама прыстасаванне пад новыя функцыі помнікаў архітэктуры.*

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ**

1. Вылучыце асноўныя этапы гісторыі рэстаўрацыі.
2. Назавіце напрамкі рэстаўрацыі ў XIX – пачатку XX ст.
3. Назавіце імёны знакамітых рэстаўратараў XIX ст.
4. Якія змены ў адносінах да гісторыка-культурнай спадчыны адбыліся пасля 1917 г. на тэрыторыі СССР?
5. Назавіце імёны знакамітых савецкіх рэстаўратараў.
6. Якія страты панесла савецкая культура ў гады Вялікай Айчыннай вайны і як змяніліся адносіны да рэстаўрацыі ў пасляваенны перыяд?
7. Дайце характарыстыку савецкай рэстаўрацыі ў 60–80-я гг. XX ст.
8. Калі быў прыняты Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры?

**Р А З Д З Е Л  2**

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСТАЎРАЦЫІ І АХОВЫ ПОМНІКАЎ

## 2.1. Вывучэнне, кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры ў БССР і Рэспубліцы Беларусь

Пачатак рэстаўрацыі і аховы помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі Беларусі – канец XVIII – пачатак XIX ст. – гэта перыяд, калі архітэктары, рэстаўратары, археолагі і гісторыкі мастацтва ўпершыню звярнуліся да вывучэння будаўнічых матэрыялаў і канструкцый старых будынкаў з мэтай аднаўлення іх у першапачатковым выглядзе. Прычым вывучаліся толькі праваслаўныя храмы XI–XII стст. у рэчышчы ідэалогіі Расійскай імперыі (Полацкія Сафійскі сабор, Спаса-Ефрасіннеўская царква і інш.). Даследчыкі ўпершыню звярнулі ўвагу на тыпы муроўкі, старажытную цэглу (плінфу), фрэскі і пліткі падлогі [3].

Кардынальныя змены адбыліся пасля кастрычніка 1917 г., калі бальшавікі ліквідавалі інстытут прыватный уласнасці на зямлю і ажыццявілі нацыяналізацыю прамысловых, свецкіх і культавых будынкаў, пачалі праводзіць палітыку ваяўнічага атэізму. Пад пагрозай апынуліся тысячы храмаў і манастыроў, у тым ліку і на тэрыторыі Беларусі.

Сітуацыю пагоршыла і польска-савецкая вайна 1919–1920 гг., у выніку якой, напрыклад, былі разбураныя два храмы XII–XVII стст. Барысаглебскага Бельчыцкага манастыра ў Полацку.

> 5 кастрычніка 1918 г. Ленін загадаў правесці першую дзяржаўную рэгістрацыю ўсіх манументальных і рэчавых помнікаў мастацва і старажытнасці. Выканкам Савета Заходняй Камуны з цэнтрам у Смаленску прыняў дэкрэт «Аб перадачы культурных каштоўнасцей, маёнткаў і ўстаноў аддзелам народнай асветы і аб арганізацыі іх збору, уліку і аховы». Аналагічную пастанову прыняў 30 студзеня 1919 г. урад БССР і надрукаваў яе ў газеце «Звязда». Значную ролю ў вывучэнні помнікаў беларускага мураванага дойлідства адыгралі спецыялісты Інстытута беларускай культуры, створанага ў 1922 г.

У 1923 г. у Полацк прыехаў з Масквы гісторык архітэктуры *Мікалай Іванавіч Бруноў.* Ён правёў абследаванне Спаса-Праабражэнскай царквы, прапанаваў сваю рэканструкцыю першапачатковага выгляду храма XII ст.

і падтрымаў думку прафесара МДУ Аляксея Іванавіча Някрасава аб моцным уплыве гэтага храма на ранняе маскоўскае дойлідства. Пазней, у 1928 г., ён выказаў меркаванне, што ў Полацку і Смаленску існавала арыгінальная творчая манера дойлідства, якая паўплывала на архітэктуру Ноўгарада [39].

14 чэрвеня 1924 г. у БССР былі вызначаны катэгорыі помнікаў, якія падлягалі ахове. 5 ліпеня 1926 г. прынята пастанова СНК БССР «Аб парадку аховы помнікаў даўніны, мастацтва, быту і прыроды, якія абвешчаны нацыянальным здабыткам». Упершыню ў БССР быў зацверджаны спіс помнікаў (94 назвы), якія абвяшчаліся дзяржаўнай уласнасцю.

Вывучэннем полацкага мураванага дойлідства займаюцца выдатныя беларускія навукоўцы – мастацтвазнаўца *Мікалай Мікалаевіч Шчакаціхін* і археолаг *Іван Макаравіч Хозераў*. У 1926 г. гэтыя даследчыкі вывучалі Сафійскі сабор і даказалі, што заходнія апсіды больш познія. Як і ўсходнія апсіды, яны зроблены з плінфы, але плінфа пакладзеная не на цамяначнай, а на чыста вапнавай рошчыне.

М. Шчакаціхін быў не толькі прафесійным даследчыкам, але і выдатным выкладчыкам. З 1923 г. ён чытае ў Беларускім дзяржаўным універсітэце курс гісторыі беларускага мастацтва, матэрыялы якога ў 1928 г. выдаў асобнай кнігай. Даследчык адзначаў вялікі ўплыў на беларускае мураванае дойлідства візантыйскай архітэктуры, у тым ліку і перарobленых правінцыйных візантыйскіх форм. Акрамя таго, ён падрабязна апісаў муроўкі Полацкага Сафійскага сабора XI ст. і ўказаў сярэднюю таўшчыню плінфы з гэтай муроўкі – 2,5 см. У якасці аналагаў прывёў муроўку кіеўскіх і чарнігаўскіх храмаў.

М. Шчакаціхін дэталёва вывучаў муры Дабравешчанскай царквы ў Віцебску. Ён адзначыў, што муроўка храма вельмі падобная да візантыйскіх узораў. Яна складаецца з тонкай, даўгаватай, але часам і з квадратнай плінфы, якая пакладзена разам з тоўстымі вапняковымі плітамі. Звярнуў увагу навуковец і на муроўку Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку. Гэта чыста цагляная муроўка «...з асобным прыёмам маркіроўкі прамежкавых шэрагаў цэглы з дапамогай досыць шырокіх пластоў надворнага тынку» [42, с. 121]. (Цяпер мы гэтую муроўку называем муроўкай са схаваным шэрагам.)

М. Шчакаціхін падрабязна разгледзеў будаўнічую тэхніку Каложскай царквы XII ст. Ён лічыў, што ўжыванне ў якасці асноўных дэкаратыўных элементаў сцен Каложскага храма разнастайных паліваных плітак і шліфаваных гранітных камянёў, размешчаных у пэўным парадку, мае аналогіі ў мармуровых і алебастравых аздобах, уласцівых для храмаў Візантыі і Усходу.

М. Шчакаціхін быў першым беларускім даследчыкам, які звярнуў увагу на будаўнічую тэхніку замкаў нашай краіны.

Грунтоўнае вывучэнне замкавага дойлідства Вялікага Княства Літоўскага дазволіла яму ўпершыню вылучыць некаторыя рысы беларускай готыкі, напрыклад паступовае ўзнікненне і развіццё гатычнай спічастай аркі і замену яе на паўцыркульную ці пашырэнне зорчатых скляпенняў.

М. Шчакаціхін пісаў пра Мірскі замак, што той зроблены з камянёў і добра абпаленай ды роўна пакладзенай цэглы. Муроўка ўсюды вельмі моцная, а форма цэглы – звычайная, падоўжаная. Фактычна М. Шчакаціхін першым вызначыў розныя напрамкі будаўнічай тэхнікі беларускага мураванага дойлідства XI–XII і XIV–XVI стст.

Адначасова са М. Шчакаціхіным беларускае мураванае дойлідства XI–XII стст. вывучаў І. Хозераў. У выніку даследавання Полацкага Сафійскага сабора ён прыйшоў да высновы, што заходнія апсіды храма былі зробленыя не раней за XV ст. Археолаг вывучаў муроўку заходняй сцяны, да якой пазней прыбудавалі апсіды, і вызначыў, што заходні фасад храма XI ст. быў зроблены ў тэхніцы мяшанай муроўкі. І. Хозераў зрабіў рэканструкцыю першапачатковага плана сабора, у аснове якога ляжаў квадрат са старанамі памерам каля 27 м кожная. У 1926 г. ён даследаваў верхнія часткі Спаса-Праабражэнскай царквы XII ст., дапоўніў рэканструкцыю М. Брунова і прапанаваў сваю. Пры гэтым ён дэталёва вывучаў сістэму муроўкі храма.

У 1928 г. даследчык правёў раскопкі двух храмаў XII ст. Бельчыцкага манастыра. Падчас раскопак Пятніцкай царквы былі знойдзены рэшткі першапачатковай прамавугольнай апсіды і падземная камера (крыпта) пад усім будынкам храма з трыма прытворамі; выяўлена, што ў аснову падмурка пакладзены дубовыя брусы. Знойдзена дзве падлогі: адна ў выглядзе цамяначнай гладкай паверхні, таўшчынёй 10–12 см, і другая, выкладзеная з квадратных плітак. Абодва храмы былі ўпрыгожаны фрэскамі.

І. Хозераў дэталёва вывучаў розныя будаўнічыя матэрыялы, асабліва плінфу. У 1928 г. ён прапанаваў называць выявы, якія выступаюць на плінфе, *знакамі* (гэтыя малюнкі былі выразаныя ў сценках драўлянай формы для вырабу цэглы), а выявы, уціснутыя ў гліняную масу яшчэ вільготнай цагліны адразу пасля яе вырабу адмысловым штампам, – *клеймамі*.

Працу па даследаванні помнікаў архітэктуры ў БССР перапыніў сталінскі тэрор. М. Шчакаціхін быў рэпрэсаваны, яго кніга і іншыя публікацыі забаронены. І. Хозераў, які стала працаваў і жыў у Смаленску, больш не прыязджаў у Беларусь і займаўся вывучэннем архітэктуры Смаленска. У 1937 г. амаль усе беларускія археолагі былі арыштаваныя, пазней растраляны ці сасланы ў ГУЛАГ.

У 1930 г. з храмаў сталі здымаць званы, бо царкоўны звон забаранілі. У пачатку XX ст. у Мінску толькі праваслаўных храмаў было больш за 30, а ў 1937 г. дзейнічала ўжо адна царква Святой Марыі Магдаліны на Старажоўцы. У 1938 г. у БССР засталіся тры адкрытыя царквы: у Бабруйску, Оршы і Мазыры. Неўзабаве закрылі і іх. Царкоўныя будынкі масава знішчаліся або перабудоўваліся.

У Магілёве да 1917 г. было 73 храмы розных канфесій, а да 1941 г. захавалася 5 будынкаў. Толькі ў 1937 г. за адну ноч тут узарвалі 9 царкоўных ансамбляў, каб яны «не псавалі выгляд» на плануемы да ўзвядзення ў цэнтры горада Дом Саветаў. Галоўным спецыялістам па знішчэнні беларускіх храмаў стаў начальнік штаба сапёрнага батальёна Пётр Грыгарэнка, які распрацаваў новую методыку падрыву культавых будынкаў. Менавіта ён у 1934 г. узарваў сабор у Віцебску, Свята-Мікалаеўскі сабор у Слуцку, храмы ў Мінску, Магілёве і Смаленску. Адметна, што пасля вайны ён стаў дысідэнтам і вернікам, выехаў у ЗША, дзе выдаў кнігу ўспамінаў, у якой апісаў і сваю дзейнасць па руйнаванні помнікаў на тэрыторыі Беларусі.

На сярэдзіну XX ст. у Беларусі практычна не засталося спецыялістаў у галіне археалогіі, гісторыі архітэктуры і мастацтвазнаўства.

Пасля падпісання ў 1921 г. Рыжскага мірнага дагавора значная частка Беларусі апынулася ў складзе Другой Рэчы Паспалітай. Тут развіваліся архітэктура і археалогія, дзейнічаў Віленскі ўніверсітэт імя Стэфана Баторыя, жылі і працавалі беларускія і польскія архітэктары, рэстаўратары, археолагі, мастакі і гісторыкі мастацтва.

Пры Віленскім універсітэце існавала Камісія па ахове старажытнасцей на чале з прафесарам, вядомым мастаком *Фердынандам Рушчыцам*. Вялікі уклад у вывучэнне беларускага дойлідства зрабіў архітэктар *Юліуш Клос*.

У Заходняй Беларусі плённа працаваў беларускі мастак *Язэп Драздовіч*. Ён пакінуў замалёўкі замкаў у Міры, Лідзе, Крэве і Гальшанах. Мастак зрабіў серыю замалёвак муроў Навагрудскага замка, а таксама графічную рэканструкцыю ўмацаванняў Навагрудскага замчышча ў 1927–1930-х гг.

У 1920 г. пры Міністэрстве веравызнанняў і народнай асветы (Ministerstwo Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego) у Польшчы было створана Дзяржаўнае аб’яднанне кансерватараў дагістарычных помнікаў (Państwowe Grono Konserwatorów Zabytków Prehistorycznych). Яго задачамі сталі ахова і вывучэнне археалагічных помнікаў. Помнікі архітэктуры Сярэдневякоўя на тэрыторыі Заходняй Беларусі ахоўвалі, вывучалі і аднаўлялі як за дзяржаўныя сродкі, так і за грошы ўласнікаў замкаў, палацаў, гарадскіх дамоў і вясковых фальваркаў.

Падчас рэстаўрацыйных і кансервацыйных работ на некаторых архітэктурных помніках праводзілі археалагічныя раскопкі. Напрыклад, у Навагрудку археолагі адкапалі каменны мур паміж вежамі Касцёльная і Шчытоўка, а таксама падмуркі Малой брамы і Пасадскай вежы. Знайшлі і падмуркі замкавага палаца, які некалі стаяў паміж Касцёльнай вежай і Шчытоўкай, рэшткі муроў і сутарэнняў замкавай царквы, зробленай з цэглы-пальчаткі.

Сваё імя ў справе кансервацыі і аховы помнікаў беларускага мураванага дойлідства пакінуў польскі кансерватар *Ежы Рэмер*.

Матэрыялы пра помнікі беларускай архітэктуры і старажытныя будаўнічыя матэрыялы знаходзіліся ў тагачасных экспазіцыях беларускіх музеяў у Вільні, Гродне, Слоніме і Пінску. Так, у экспазіцыі Віленскага беларускага гісторыка-этнаграфічнага музея імя Івана Луцкевіча былі выстаўлены блокі (некалькі тыпаў), з якіх пабудаваны Віленскі замак, а таксама галаснікі з Каложскай царквы XII ст.

Сярод даследчыкаў гэтага часу вызначаецца *Юзаф Ядкоўскі*, які нарадзіўся ў Гродне і скончыў Маскоўскі археалагічны інстытут. У Гродне ў 1920–1922 гг. ён стварыў гісторыка-археалагічны музей, які дзейнічае да цяперашняга часу, і быў яго кіраўніком да 1936 г. Дзякуючы яго намаганням улады перадалі пад музей будынак Старога замка, дзе раней размяшчаліся вайскоўцы.

На мяжы 1930–1931 гг. музей пераехаў у часткова адрамантаваны палац Старога замка і заняў пад экспазіцыю пяць залаў першага паверха. Пасля веснавой паводкі 1932 г. схілы замкавай гары былі моцна падмыты і замкавыя муры часоў Вітаўта і Баторыя апынуліся пад пагрозай абвалу. Каб прадухіліць небяспеку, вырашылі зрабіць ніваліраванне на тэрыторыі замчышча. Частка зямлі з двара была знята і выкарыстана для ўмацавання схілаў замкавай гары.

Падчас земляных работ у паўднёвай частцы двара каля замкавых муроў знайшлі рэшткі невядомага раней будынка, зробленага з плінфы. Ю. Ядкоўскі выказаў меркаванне, што гэта княжацкі палац («хорам», «церам»). Яго здагадкі пацвердзіў рускі эміграцкі навуковец А. В. Салаўёў, які ў верасні 1934 г. прыехаў у Гродна і агледзеў муры будынка. Ю. Ядкоўскі дэталёва вывучыў муроўку і плінфу знойдзенага збудавання.

Пасля нечаканай знаходкі рэшткаў княжацкага палаца Ю. Ядкоўскі вырашыў распачаць сапраўдныя археалагічныя пошукі, каб знайсці культавыя пабудовы XII ст. У 1933 г. на поўнач ад хорама, на адлегласці 20 м ён знайшоў рэшткі двух цагляных будынкаў. Даследчык вызначыў іх як рэшткі храмаў. У навуковай літаратуры яны вядомы як Верхняя і Ніжняя цэрквы. Падмуркі Ніжняй царквы Ядкоўскі датаваў XI–XII стст. Датаванне Верхняй царквы ў навукоўцаў рознае.

У 1935 г. у сувязі з рамонтам Каложскай царквы Ядкоўскі правёў раскопкі каля яе паўночна-ўсходняй апсіды. Былі знойдзены невялікія пліткі падлогі і плінфа са знакамі на тарцах. Даследаваны рэшткі падлогі XVIII ст. з мармуровых плітак. Пад імі даследчык знайшоў фрагменты падлогі XII ст., зробленай з квадратных і трохкутных паліваных плітак. Глыбей ішоў пласт чорнай зямлі таўшчынёй 5–8 см, а вышэй былі кавалкі непаліваных плітак падлогі з арнаментам таўшчынёй 4,2 см і памерам 19,5 x 19,5 см. Гэта адзіны выпадак знаходак такіх плітак падлогі на тэрыторыі Беларусі. Вынікі даследаванняў Ю. Ядкоўскі надрукаваў у кнізе, якая выйшла ў 1936 г. Яе з'яўленне выклікала канфлікт з варшаўскімі археолагамі, якія крытыкавалі методыку раскопак Ядкоўскага. Акрамя таго, у 1934 г. па выніках разгляду адмысловай камісіяй раскопак на

Замкавай гары Ядкоўскі быў адхілены ад кіравання археалагічнымі працамі. У выніку навуковец адмовіўся ад кіраўніцтва Гродзенскім музеем і пераехаў жыць і працаваць у Варшаву.

Неабходна прыгадаць раскопкі Ю. Ядкоўскім замчышча ў Ваўкавыску ў 1935 г. Там ён знайшоў вялікую колькасць плінфы, складзенай разам у адпаведным парадку. Пазней побач са складам плінфы беларускія археолагі знайшлі падмуркі недабудаванага храма XII ст.

Каб працягнуць раскопкі на тэрыторыі Старога замка, з Археалагічнага музея Варшавы запрасілі доктара археалогіі *Здзіслава Дурчэўскага*, які з 1937 г. да верасня 1939 г. кіраваў даследаваннямі. Працягнулі раскопкі Ніжняй царквы, а таксама закансервавалі падмуркі Верхняй.

У 1937 г. З. Дурчэўскі на аснове закансерваваных раскопаў пачаў ствараць археалагічны музей-павільён на тэрыторыі Старога замка, які існуе па сёння і з’яўляецца першым музеем такога кшталту на тэрыторыі Беларусі. У тым жа годзе Дурчэўскі на мысе Замкавай гары раскрыў частку цаглянага мура з плінфы і даследаваў яго на даўжыню 4,5 м. Рэшткі гэтага мура вывучаў аўтар дадзенага дапаможніка ў 1981, 1985–1986 і 1988 гг.

У 1937 г. будынкі Старога замка даследаваў прафесар *Яраслаў Вайцяхоўскі.* У 1937–1938 гг. ён знайшоў кавалкі каменнага дэкору рэнесансавага палаца, а таксама фрагменты ўнікальнага графічнага роспісу з раслінными міфалагічнымі матывамі. Я. Вайцяхоўскі першы прапанаваў праект рэканструкцыі замка часоў Стэфана Баторыя.

Даследаванні на Замкавай гары ў Гродне працягваліся да верасня 1939 г. Варта адзначыць, што ўсе археалагічныя і архітэктурныя помнікі часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай польскія даследчыкі лічылі здабыткамі польскай нацыянальнай культуры.

> Адносіны да праваслаўнай царквы і вернікаў іншых канфесій змяніліся ў СССР падчас вайны 1941–1945 гг.
>
> Згодна з пастановай СНК СССР № 299 ад 16 марта 1943 г. працавала Надзвычайная Дзяржаўная Камісія па ўстанаўленні і расследаванні злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На месцах ствараліся абласныя камісіі. Так, Магілёўская абласная камісія дзейнічала з 6 снежня 1943 г. па 29 снежня 1944 г. У сакавіку 1945 г. яна абследавала 9 храмавых будынкаў. У Магілёве гэта 2 касцёлы і 7 праваслаўных храмаў. З гэтых аб’ектаў на сёння ацалеў толькі Нікольскі манастыр. Астатнія будынкі ніхто не аднаўляў, іх руіны паступова знеслі, а тэрыторыю забудавалі. Найбольшы інтарэс уяўляюць архівы гэтай камісіі, якія пазней былі выкарыстаны рэстаўратарамі для аднаўлення некаторых культавых аб’ектаў на тэрыторыі Беларусі.

Пасля вайны зноў пачаліся археалагічныя раскопкі і вывучэнне помнікаў архітэктуры ў БССР. У 1944 г. прыязджае ў вызвалены Віцебск П. Бараноўскі, каб агледзець і замаляваць рэшткі разбуранай Дабравешчанскай царквы XII ст. У 1946 г. у Беларусь вяртаецца І. Хозераў. Ён

прыехаў у Полацк, дзе вывучаў Сафійскі сабор і Спаса-Праабражэнскую царкву Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. На фасадах Спаса-Праабражэнскай царквы даследчык зрабіў зандажы, дзякуючы якім удалося вызначыць першапачатковую форму вокнаў храма, якія звонку мелі цагляныя аздабленні. У тым жа годзе І. Хозераў абследаваў Каложскую царкву ў Гродне і першы адзначыў, што яна мае ў інтэр’еры чатыры круглыя слупы, якія ў іншых храмах Беларусі XII ст. мелі іншыя формы. На жаль, у 1947 г. І. Хозераў памёр.

У 1947 г. кіраўніцтва Гродзенскага абласнога музея звярнулася ў Акадэмію навук СССР з просьбай закончыць раскопкі Замкавай гары і раскапаць рэшткі Ніжняй царквы. Просьбу разгледзілі станоўча і даручылі справу *Мікалаю Мікалаевічу Вароніну*. Экспедыцыя пад яго кіраўніцтвам працавала з 31 жніўня па 28 кастрычніка 1949 г.

У 1954 г. у Маскве М. Варонін выдаў манаграфію па матэрыялах раскопак 1932–1949 гг. Акрамя агляду помнікаў архітэктуры на тэрыторыі Старога замка даследчык даў грунтоўнае апісанне Каложскай царквы XII ст. Таксама ён апісаў лякальную плінфу (паўкруглая тонкая абпаленая цэгла, якая выкарыстоўвалася для выкладання дэкаратыўных элементаў будынка, напрыклад, паўкалон, броўкі і інш.) і знакі на цэгле.

У кнізе даследуюцца рэшткі Ніжняй царквы – яны захаваліся на глыбіні 3,5 м. Сярод маёлікавых плітак, якімі былі аздоблены сцены, навуковец вылучыў зялёную паліваную чашу дыяметрам 26 см. Аўтар дае апісанне рэштак падлогі XII ст., зробленай з фігурных паліваных плітак, якія захаваліся ў адной з апсід і ў паўночным нэфе храма. У кнізе М. Вароніна ўпершыню змешчана каляровая выява фрагмента маёлікавай падлогі пад купалам храма.

Рэстаўрацыйныя работы на тэрыторыі СССР пачаліся пасля прыняцця 14 кастрычніка 1948 г. пастановы Савета Міністраў СССР, у якой абгрунтоўвалася неабходнасць аховы, вывучэння і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры. У 1949 г. адпаведны дакумент прыняты і ў БССР. На працягу 1953–1957 гг. падрыхтаваны спіс помнікаў гісторыі і культуры Беларусі і апублікавана пастанова «Аб зацвярджэнні спіса помнікаў архітэктуры БССР, якія патрабуюць дзяржаўнай аховы».

Пачаўся новы этап у вывучэнні нашай архітэктурнай спадчыны. Ён характарызуецца вялікім аб’ёмам археалагічных даследаванняў, у выніку якіх знойдзены дзясяткі раней невядомых помнікаў, атрыманы новыя звесткі аб збудаваннях, якія захаваліся. Раскопкі В. Р. Тарасенкі (Мінск), М. К. Каргера (Полацк, Віцебск, Ваўкавыск, Навагрудак, Тураў), П. А. Рапапорта (Полацк, Ваўкавыск), В. А. Булкіна (Полацкая Сафія), І. М. Чарняўскага (Гродна) дазволілі па-новаму зразумець і растлумачыць працэсы станаўлення і развіцця архітэктуры XI–XII стст. на тэрыторыі Беларусі, канчаткова сцвердзіць існаванне полацкай і гродзенскай архітэктурных школ.

Чарговы ўдар па культавай архітэктуры Беларусі нанесла хрушчоўская канцэпцыя змагання з рэлігіяй. Сотні бажніц, што належалі вернікам розных канфесій, былі зачынены, перароблены ў клубы і зернясховішчы або цалкам знішчаны.

На Беларусі выкараняліся не толькі беларуская мова, гісторыя і культура, але і вера нашых продкаў. Шмат касцёлаў і цэркваў былі ўзарваны або перабудаваны да непазнавальнасці. Так, напрыклад, на знішчэнне полацкага касцёла і кляштара езуітаў «мэтавым накіраваннем» з бюджэту Віцебскай вобласці было выдзелена 30 тысяч (тагачасных) рублёў. У студзені 1964 г. касцёл Св. Стэфана ў Полацку і частку калегіума ўзарвалі. Ад выбуху ўтварылася каля 50 тысяч кубічных метраў «дабраякаснай цэглы і шчэбеню, якія прадпрыемствамі і насельніцтвам на працягу года былі выкарыстаны на добраўпарадкаванне горада». «За хорошо выполненные работы по обрушению здания кадетского корпуса в городе Полоцке» ўдзельнікам акцыі была аб’яўлена падзяка, двое з іх былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі гарвыканкама [38, с. 370].

У пачатку 60-х гг. вырашылі знішчыць унікальны помнік XII ст. віцебскую Дабравешчанскую царкву. Спачатку помнік знялі з дзяржаўнай аховы і вырашылі зрабіць на яго месцы танцавальную пляцоўку для моладзі. Калі пра гэта даведаўся П. Бараноўскі, ён прыехаў з Масквы ў Віцебск і пайшоў да мясцовых кіраўнікоў, каб абараніць помнік ад разбурэння. Але яго не паслухалі, і ўлады распачалі знішчэнне царквы. Узарваць храм пабаяліся, бо побач былі жылыя будынкі, тады вырашылі разбіць царкоўныя муры з дапамогай «шар-бабы». Але муры былі вельмі трывалымі, і «работа» па знішчэнні храма ішла марудна.

За гэты час у абарону храма выступілі археолагі. З Масквы ў Віцебск прыслалі ліст акадэміка Б. А. Рыбакова, які прапанаваў рэшткі царквы захаваць і правесці на месцы царквы археалагічныя раскопкі. Улады Віцебска, пасля таго, як іх дзейнасць трапіла ў сатырычную праграму «Фитиль», вымушаны былі спыніць разбурэнне. Пасля раскопак падмуркі царквы закансервавалі і зноў узялі пад дзяржаўную ахову. Але гэта быў толькі адзіны такі выпадак.

Былі знішчаны ўніяцкі храм у Беразвеччы, касцёл Найсвяцейшай Панны Марыі (Фара Вітаўта) у Гродне, езуіцкі касцёл у Пінску, шмат іншых культавых будынкаў. У канцы XX ст. Дабравешчанская царква ў Віцебску была адноўлена. На месцы ўзарванай 29 лістапада 1961 г. Фары Вітаўта ў Гродне ўсталяваны памятны знак (2014) у выглядзе паўразбуранай аркі з памятным надпісам.

У сярэдзіне 1960-х гг. пачалася актыўная дзейнасць грамадства па ахове помнікаў гісторыі і культуры. Было створана Добраахвотнае таварыства, якое збірала сродкі на рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры, у тым ліку і культавых будынкаў.

У 1968–1969 гг. створаны спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні пры Міністэрстве культуры БССР, у штат якіх былі ўведзены археолагі, а ў 1980 г. – археалагічны аддзел, які праводзіў маштабныя раскопкі на помніках манументальнай архітэктуры XII–XIX стст., неабходныя для кансервацыі і рэстаўрацыі.

Працягваецца вывучэнне архітэктуры XI–XII стст. У сувязі з рэканструкцыяй Полацкага Сафійскага сабора з 1975 г. па 1980 г. вялікія раскопкі вакол храма, а таксама ў яго інтэр’ерах правёў ленінградскі археолаг *Валянцін Аляксандравіч Булкін*. Ён высветліў, што ў аснове сабора знаходзіцца адзіны і адначасова фундаментны каркас. У паўднёвай сцяне знайшлі рэшткі дзвярных праёмаў XI ст. Былі сабраны фрагменты фрэсак, плінфы са знакамі на тарцах і аплаўлены свінец з даху сабора.

Полацкая Сафія складалася з двух помнікаў – XI і XVIII стст., і кожны меў высокую мастацкую каштоўнасць. Таму навуковаму кіраўніку рэстаўрацыі архітэктару *Валерыю Рыгоравічу Слюнчанку* давялося вырашыць складаную задачу прыстасавання і музейнага паказу Сафійскага сабора [30; 31].

Спачатку ў ім меркавалася размясціць рэспубліканскі музей гісторыі рэлігіі і атэізму. Але шматлікія экспанаты, уведзеныя ў цудоўны інтэ’ер XVIII ст., маглі засланіць яго мастацкія вартасці. Пасля шматлікіх спрэчак было вырашана зрабіць у верхняй частцы сабора залу арганнай і камернай музыкі. У адпаведнасці з архітэктурна-археалагічнай экспазіцыяй не забылі і пра рэшткі будынка XI–XIII стст. Культурны слой таўшчынёй больш за 2 м, што залягаў пад падлогай XVIII ст., быў выняты да ўзроўню падлогі XI ст., а замест верхняй падлогі зроблена своеасаблівая столь на бэльках, пад якой быў створаны падземны музей старажытнай Сафіі. Каб глядач мог атрымаць большае ўяўленне пра пачатковы выгляд помніка, на яго фасадах былі зроблены зандажы, у якіх відаць старадаўнюю муроўку. У інтэр’ерах адкрыты і замацаваны рэстаўратарамі некалькі фрагментаў старога фрэскавага роспісу.

Канцэртная зала, арганічна ўключаная ў інтэр’ер XVIII ст., дазваляе адчуць архітэктуру позняга барока, дзе музыка, святло, колер, форма і прастора існуюць у непадзельным адзінстве. У будынку Полацкай Сафіі па вялікіх святах адбываюцца праваслаўныя набажэнствы [38].

Аднaчасова з адбудовай Сафіі ў Полацку пачалі аднаўляць помнік класіцызму – Богаяўленскі сабор, дзе ў 1981 г. была адкрыта гарадская мастацкая галерэя, часта тут гучала класічная музыка. Будынак вернуты беларускай праваслаўнай царкве ў 1991 г.

Няпростая сітуацыя склалася падчас выканання праекта адбудовы магілёўскай ратушы. Моцна пацярпелая ў гады Вялікай Айчыннай вайны, але часткова адрамантаваная, у 1957 г. яна была знесена да падмуркаў. Паколькі ратуша з’яўлялася адной з асноўных гарадскіх дамінантаў, Магілёўскі гарвыканкам у 1979 г. прыняў рашэнне аб яе аднаўленні. Правёўшы археалагічныя раскопкі, у выніку якіх была ўдакладнена планіроўка

будынка, і сабраўшы шматлікія пісьмовыя крыніцы, спецыялісты зрабілі праект аднаўлення будынка на канец XVIII ст., бо архіўных матэрыялаў на час пабудовы ратушы (1679 г.) не хапала. Вырашылі ў стылі класіцызму аднавіць толькі фасады, а інтэр'еры зрабіць сучаснымі. Такім чынам, быў выкананы макет у натуральную велічыню знішчанага некалі помніка, які зноў стаў адной з асноўных вертыкалей Старога горада. Была вызначана і ідэя прыстасавання помніка – тут хацелі адкрыць Палац шлюбаў. Будаўнічыя працы пачаліся ў 1992 г., аднак неўзабаве грошы скончыліся і будаўнічы катлаван засыпалі. Грамадзяне Магілёва не здаліся, і дзякуючы іх намаганням Магілёўская ратуша паўстала з нябыту. Цяпер у ёй знаходзіцца музей горада Магілёва.

У 1970–1980-я гг. беларуская інтэлігенцыя рашуча выступіла ў абарону сваёй гістарычнай спадчыны. У выніку гэтага змагання ўдалося захаваць гістарычныя цэнтры Мінска, Магілёва, Гродна і іншых гарадоў.

У сувязі з развіццём беларускай рэстаўрацыі і прыстасаваннем культавых будынкаў пад культурныя патрэбы савецкага грамадства ў 1970–1980-я гг. археолагі, гісторыкі архітэктуры, архітэктары-рэстаўратары пачалі вывучаць манументальнае дойлідства Беларусі XIII–XVIII стст. Гэта былі помнікі эпохі готыкі, рэнесансу і барока. Пачаліся кансервацыя і рэстаўрацыя замкаў у Лідзе і Міры.

Паступова склаліся адпаведныя напрамкі даследаванняў:

– абарончыя збудаванні Беларусі (замкі і гарадская фартыфікацыя);

– культавыя будынкі;

– манастырскія комплексы;

– помнікі грамадзянскага дойлідства (ратушы, палацы, гарадскія мураваныя дамы і г. д.) [39, с. 24].

Асобную галіну складала вывучэнне асобных будаўнічых канструкцый (падмуркі, сцены, дахі, вокны і дзверы) і будаўнічых матэрыялаў (цэгла, камень, дахоўка, кафля, пліткі падлогі і аконнае шкло).

Акрамя беларускіх даследчыкаў гэтымі тэмамі цікавіліся даследчыкі з Масквы і Ленінграда, а таксама з Літоўскай ССР.

Вынікі раскопак і даследаванняў помнікаў XIII–XVIII стст., распачатых у канцы 1960-х гг., надрукаваны ў працах Міхаіла Аляксандравіча Ткачова, Мар'яны Уладзіміраўны Малеўскай, Зянона Станіслававіча Пазняка, Ігара Мяфодзьевіча Чарняўскага, Аляксандра Мікалаевіча Кушнярэвіча, Вольгі Мікалаеўны Ляўко і аўтара дапаможніка. Яны значна дапоўнілі раздзелы гісторыі архітэктуры Беларусі, прысвечаныя фартыфікацыі, гатычнай, рэнесансавай і барочнай архітэктуры.

Вялікую работу за апошнія 50 гадоў XX ст. правялі мастацтвазнаўцы і гісторыкі беларускай архітэктуры: Міхаіл Сяргеевіч Кацар, Уладзімір Аляксандравіч Чантурыя, Тамара Ігнатаўна Чарняўская, Юрый Аляксандравіч Якімовіч, Анатоль Мікалаевіч Кулагін, Валянціна Браніславаўна

Караткевіч, Надзея Фёдараўна Высоцкая, Вольга Васільеўна Церашчатава, Адольф Аляксандравіч Сяліцкі, Інэса Мікалаеўна Слюнькова, Аляксандр Іванавіч Лакотка і шэраг іншых даследчыкаў.

Значным унёскам у справу вывучэння і аховы нашай архітэктурнай спадчыны з'яўляюцца сямітомны «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі» (1981–1988), пяцітомная «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» (1984–1987), шасцітомнае выданне «Гісторыя беларускага мастацтва» (1987–1994). Разбураным помнікам айчыннага дойлідства прысвечаны зборнік «Страчаная спадчына», які выйшаў у 1988 г. [34].

У 1988 г. сітуацыя ў СССР і БССР у адносінах да рэлігіі кардынальна змянілася. Кіраўніцтва СССР дазволіла афіцыйна адсвяткаваць 1000-годдзе хрышчэння Русі, спынілася ваяўнічая атэістычная прапаганда, вернікам пачалі вяртаць храмы і дазволілі будаваць новыя.

За першыя гады адноўленай беларускай незалежнасці вернікам Беларусі былі аддадзены сотні бажніц, пачалося іх актыўнае аднаўленне. Былі адбудаваныя такія ўнікальныя помнікі нашага дойлідства, як, напрыклад, Дабравешчанская царква ў Віцебску, цэрквы ў вёсках Сынкавічы і Мураванка, касцёлы Святой Варвары ў Віцебску і Святога Андрэя ў Слоніме, брыгіцкі касцёл у Гродне, сабор Пятра і Паўла ў Гомелі, замкі ў Міры, Нясвіжы, сядзіба Касцюшкі ў Косаве. Актывізавалася работа па аднаўленні замка ў Лідзе. У сучасны перыяд аднаўляюцца Стары Замак у Гродне, замкі ў Крэве і Любчы. Ператвораны ў музейныя аб'екты сядзіба Агінскіх ў Залессі, Лошыцкая сядзіба і парк у Мінску, палац Пуслоўскіх у Косаве.

Кантроль за рэстаўрацыяй і кансервацыяй помнікаў гісторыі, архітэктуры і мастацтваў ажыццяўляе Упраўленне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Прапановы па ўключэнні помнікаў спадчыны Беларусі з мэтай іх кансервацыі і рэстаўрацыі ў дзяржаўную інвестыцыйную праграму робяць абласныя ўпраўленні культуры і Мінскі гарвыканкам. Фінансаванне па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў, якія ўключаны ў рэспубліканскі спіс, што падлягаюць ахове дзяржавы, праводзяцца ў першую чаргу з рэспубліканскага бюджэту. Фінансаванне аднаўлення і захавання аб'ектаў мясцовага значэння ў асноўным ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласных бюджэтаў.

Зараз у сістэме Міністэрства культуры дзейнічаюць 204 музеі (з іх 53 філіялы), якія адыгрываюць асобую ролю ў захаванні і папулярызацыі матэрыяльнай і нематэрыяльнай спадчыны. Так, напрыклад, супрацоўнікі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь праводзяць для ўсіх жадаючых (у першую чаргу калекцыянераў) кансультацыі па атрыбуцыі мастацкіх твораў, іх візуальны агляд, тэхніка-тэхналагічныя і рэнтгенаграфічныя даследаванні.

## 2.2. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гістарычнага цэнтра Мінска

Першаасновай Мінска быў дзядзінец XI ст., размешчаны не на ўзвышшы, а ў нізіне, у месцы ўпадзення ракі Нямігі ў Свіслач. Ва ўмацаваннях такога тыпу выкарыстоўваліся абарончыя ўласцівасці балоцістай, затапляльнай мясцовасці. На фарміраванне планіровачнай структуры горада вялікі ўплыў зрабіла пераважная трасіроўка міжгарадскіх гандлёвых шляхоў з захаду і паўднёвага захаду на паўночны.

У 1948 г. падчас раскопак на Мінскім замчышчы *Васіль Радзівонавіч Тарасенка* знайшоў каменныя вапняковыя пліткі са слядамі апрацоўкі і яму для гашэння вапны памерам 5 х 5 м. У 1949 г. археолагі знайшлі рэшткі каменнага храма. Яны адкапалі падмуркі, складзеныя з вялікіх і сярэдніх бутавых камянёў на вапне. Былі прасочаны сляды апалубкі, зробленай з тонкіх дошак, забітых вертыкальна ў зямлю на мяжы ямы падмуркавага рова. Унізе дошкі былі завостраныя ў выглядзе трохкутніка. Вышэй за ўзровень падмурка і вышэй за мяжу верху дошак апалубкі ішлі муры сцен храма на вышыні 30–40 см.

У 1951 г. раскопкі былі прадоўжаны. Знойдзены рэшткі чатырох каменных слупоў. Прасочана сістэма аблямоўкі ніжніх частак сцен звонку і знутры каменнымі пліткамі, прычым шэраг больш тоўстых плітак змяняе шэраг больш тонкіх. Захаваліся чатыры ярусы аблямоўкі сцен (два з больш тонкіх і два з больш тоўстых плітак).

Памер асноўнага аб’ёму храма 12 х 12 м (разам са сценамі таўшчынёй 1,5 м). Агульная даўжыня з апсідай 16 м. В. Тарасенка лічыў, што храм быў пабудаваны і пэўны час дзейнічаў. Датаваў храм першай паловай XII ст.

Пазней мінскі храм вывучаў *Эдуард Міхайлавіч Загарульскі*. Ён даказаў, што храм не быў да канца пабудаваны, і лічыў часам яго будаўніцтва XI ст. Потым ён удакладніў гэтую дату як 1071–1085 гг. Даследчык разважаў так: калі з 1069 г. па 1073 г. Менскам кіраваў кіеўскі князь Яраполк Ізяславіч, маці якога была з польскага каралеўскага роду, то з яе дапамогай у Менск і былі запрошаны будаўнікі з Польшчы, якія пачалі ўзводзіць храм у раманскай традыцыі.

Аднак не ўсе даследчыкі пагадзіліся з датаваннем Э. Загарульскага. Так, Л. В. Аляксееў лічыў, што меў рацыю В. Тарасенка, і прыводзіў аргумент, што чатырохслуповыя храмы з квадратнымі ў плане слупамі з’явіліся на Русі з сярэдзіны XII ст. Версію Л. Аляксеева падзялялі М. М. Варонін і Г. В. Штыхаў. У 1976 г. Г. Штыхаў зрабіў шурф побач з паўночна-ўсходнім кутом храма, дзе было месца, у якім археолагі не дайшлі да мацярыка, і высветліў, што пясок з падмуркавага рова перакрыў пласт пажару таўшчынёй 15 см, які ляжаў на мацярыку. У гэтым пласце даследчык знайшоў венчык гаршка канца XI ст. і бронзавую частку падсвечніка. Ён выказаў меркаванне, што тут раней стаяла драўляная царква, якая згарэла.

Доўгі час меркаванне Э. Загарульскага наконт датавання мінскага храма большасць даследчыкаў не падзяляла. Аднак у 2003 г. яго падтрымаў А. М. Кушнярэвіч, які датаваў мінскі храм 70-мі гадамі XI ст., спасылаючыся на Э. Загарульскага. Ён лічыў, што храм маглі будаваць майстры з Вялікапольшчы.

Сучасныя гісторыкі схіляюцца да таго, што храм пачаў будаваць першы незалежны менскі князь Глеб Усяславіч, які ў 1104 г. замяніў у Менску князя Давыда.

Магчыма, Глеб здолеў атрымаць з Польшчы майстроў для пабудовы каменнага храма, бо з Полацкам прамых сувязей у яго не было. Але мы прапануем іншую версію.

Жонкай Глеба Менскага была княжна Анастасія, дачка валынскага князя Яраполка і нямецкай графіні Кунігунды Арламюндскай. Кунігунда за сваё жыццё была тройчы ў шлюбе і мела ўплывовыя сувязі ў нямецкіх землях (зараз гэта Саксонія). Таму Глеб мог звярнуцца да сваёй уплывовай цешчы і атрымаць майстроў з Саксоніі. Сярод іх маглі быць і мясцовыя славяне, якія здолелі хутка паразумецца з жыхарамі Менска. У 1116 г. Глеб захапіў і абрабаваў багаты горад Слуцк і атрымаў грошы на будоўлю храма. Таму будоўля магла пачацца ў 1116–1118 гг. Адразу ўзнікла праблема, дзе ўзяць камень і вапну для будаўніцтва. Самае вялікае радовішча даламіту, добрага вапняку, знаходзілася ў ваколіцах Віцебска ў пасёлку Руба, які зараз стаў часткай абласнога горада. Відаць, Глеб змог дамовіцца з князем Віцебска (горада, які да 1021 г. не належаў да Полацкага княства), каб атрымаць камень для будоўлі.

У Кіеве да ўлады прыйшоў Уладзімір Манамах, пачалася новая вайна, Глеб трапіў у палон і ў Кіеве 13 верасня 1119 г. памёр. Будаўніцтва храма было спынена [39].

На месцы Мінскага храма былі могілкі: выяўлена 21 пахаванне ў дамавінах. Л. Аляксееў лічыў, што гэтыя пахаванні не мелі дачынення да каменнага храма і былі звязаны з драўлянай капліцай, якая раней знаходзілася побач.

Архітэктар *Сяргей Георгіевіч Багласаў* распрацаваў праект музеефікацыі Мінскага замчышча разам з падмуркамі каменнага храма. Аднак гэтыя планы пакуль не ажыццёўлены [8].

У XVI ст. Менск стаў цэнтрам ваяводства і вялікім горадам.

У XVII–XVIII стст. умацаванні горада ўключалі замак і паўкальцо земляных валоў і равоў з паўднёвага, найбольш слабага боку. Горад, кампактны ў плане, крыху перавышаў паўкруг і па характары вулічнай сеткі адносіўся да двухцэнтравага тыпу, радыяльна-паўкальцовага з прамавугольнымі элементамі. Цэнтрамі сыходжання вуліц радыяльнай накіраванасці былі замак з Ніжнім рынкам, а таксама Высокі рынак; у раёне апошняга планіровачная структура набліжалася да прамавугольнай.

Ансамбль забудовы Высокага рынку (пазней – Саборная плошча), які фарміраваўся на працягу XVI – пачатку XX ст., – выдатная з'ява ў гісторыі дойлідства. На малой тэрыторыі канцэнтравалася вялікая колькасць дамінантаў, што абумовіла насычанасць архітэктурнай кампазіцыі. У прасторавай структуры ансамбля спалучаліся ўласцівасці сярэдневяковай і рэнесансна-барочнай горадабудаўнічых культур.

Асноўнымі збудаваннямі ансамбля з'яўляліся: ратуша, звесткі аб якой сустракаюцца ўпершыню ў канцы XV ст., адбудаваная ў XVI і XVII ст., гасціны двор, згаданы ў XVI ст.; комплекс мужчынскага і жаночага базыльянскіх манастыроў першай паловы XVII–XVIII стст. з самым буйным у Мінску храмам, асобнай званіцай і развітым комплексам іншых пабудоў; мужчынскі і жаночы бернардзінскія кляштары першай паловы XVII–XVIII стст. з барочнымі касцёламі; дамініканскі кляштар таго ж часу, які меў своеасаблівую браму перад галоўным фасадам храма; будынак гарадскога тэатра канца XVIII ст., рэканструяваны на працягу XIX і пачатку XX ст.; гасцініца пачатку XIX ст., перабудаваная ў 1884 г. і ў стылі мадэрн – у 1906–1908 гг., якая атрымала назву «Еўропа» і стала найбуйнейшым грамадзянскім будынкам Мінска; сінагога XVIII ст. з парадным дваром.

У XIX ст. разбураны ці перабудаваны асобныя выдатныя архітэктурныя помнікі. У многім гэты працэс быў абумоўлены ўнутрыпалітычнай сітуацыяй, якая настала пасля паўстанняў 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг.

Яшчэ ў 1920–1930-х гг. цэнтр Мінска ўяўляў сабой цэласнае і буйнамаштабнае гісторыка-горадабудаўнічае ўтварэнне, якое сінтэзавала ў сабе культурную спадчыну розных эпох, хаця і тады знішчаліся каштоўныя грамадскія будынкі.

У 20-я гг. XX ст. Савет народных камісараў БССР прыняў дакумент аб ахове помнікаў даўніны, у якім былі названы Мінскае замчышча, а таксама дамініканскі, езуіцкі і бернардзінскі касцёлы. Аднак ужо ў 1930-я гг. некаторыя помнікі дойлідства былі знішчаны, у тым ліку і славутая царква Святога Духа (базыльянскага кляштара) на Высокім рынку.

Шмат унікальных помнікаў былі моцна пашкоджаны падчас вайны ў 1941–1944 гг. Ужо пасля вайны ў 1950 г. знеслі рэшткі дамініканскага касцёла і кляштара.

У гэты ж час быў перабудаваны будынак езуіцкага касцёла (Марыінскі кафедральны сабор) і разбурана вежа з гадзіннікам каля яго галоўнага фасада, а праз Мінскае замчышча пракладзена Паркавая магістраль (зараз – праспект Пераможцаў).

У канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг. пачалося разбурэнне вуліцы Нямігі. Мясцовыя архітэктары сталі выступаць за ліквідацыю гістарычнага цэнтра Мінска, асабліва Верхняга горада, дзе прапаноўвалі зрабіць сістэму фантанаў, каб быў прыгожы выгляд «на водна-зялёны дыяметр беларускай сталіцы» [38, с. 418]. Тым не менш пад націскам беларускай

інтэлігенцыі гістарычны цэнтр Мінска – Верхні горад, Траецкае і Ракаўскае прадмесці ў 1979 г. былі ўзяты пад ахову дзяржавы. Тут забаранялася новае будаўніцтва, якое магло парушыць гістарычнае асяроддзе.

> Адзін з першых мураваных будынкаў у Верхнім горадзе – гэта гарадская ратуша. Яе будаўніцтва пачалося ў 1591 г. Яна размяшчалася ў цэнтры былога Высокага рынку (цяпер плошча Свабоды). З XVI ст. да 30-х гг. XIX ст. ратуша з'яўлялася галоўным гандлёвым, адміністрацыйным і культурным цэнтрам. Вандроўнікі, якія наведалі Мінск у XVII ст., пісалі, што ратуша з'яўляецца адным з самых славутых будынкаў на плошчы. У канцы XVIII ст. мінскі архітэктар Ф. Крамер перабудаваў ратушу і надаў ёй рысы класіцызму.

Паводле праектных чарцяжоў, ратуша ўяўляла прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак, пасярэдзіне якога ўзвышалася вежа са шпілем. Тарцы галаўнога фасада і порцік перад уваходам былі ўпрыгожаны калонамі іанічнага ордара. Памяшканні ратушы ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. займалі гарадскі суд, магістрат і гаўптвахта. У 30-х гг. XIX ст. тут знаходзілася музычная школа, а з 1844 г. і гарадскі тэатр. Але ў 60-я гг. XIX ст. будынак ратушы быў ушчэнт разбураны.

Ідэя аднавіць мінскую ратушу ўзнікла ў 1970-я гг. Падчас раскопак 1979 г. і 1988 г. археолагі *Валянцін Енісеевіч Собаль* і *Зянон Станіслававіч Пазняк* выявілі падмуркі ратушы і фрагменты цаглянай муроўкі сцен, а таксама падлогу ў двух памяшканнях першага паверха, заглыбленых у мацярык на 0,5–0,6 м. Будынак ратушы быў зроблены з малафарматнай цэглы-пальчаткі памерам 25–27 х 12–13,5 х 5–6 см у тэхніцы мяшанай муроўкі з выкарыстаннем камянёў. Таксама знойдзены рэшткі калон ад галоўнага і заходняга порцікаў, пабудаваных у XVIII ст. У цэнтральнай частцы ратушы археолагі выявілі рэшткі кафельнай печы XVII ст. з паліванай кафлі зялёнага колеру з раслінным арнаментам.

Рэстаўратары распрацавалі праект поўнага аднаўлення цікавага помніка архітэктуры. Работы выканала архітэктурна-праектная майстэрня ААТ «Трайпл» па замове ААТ «Стары Менск». Навуковы кіраўнік праекта – вядомы беларускі рэстаўратар *Сяргей Георгіевіч Багласаў*. Знешні выгляд будынка зроблены паводле выяў і чарцяжоў, якія захаваліся. На вежы размясцілі герб Мінска з ветранікам і прыгожы гарадскі гадзіннік. На другім паверсе знаходзілася зала гарвыканкама для ўрачыстых сустрэч. Першы і падвальны паверхі былі адведзены аўтарамі праекта пад музейную экспазіцыю. У яе сярэдзіне прапанавалі размясціць вялікі макет гістарычнага цэнтра Мінска пачатку XIX ст. Адбудова ратушы адбылася за год (2003) [8]. Зараз гэта прыгожы і велічны будынак у цэнтры нашай сталіцы.

У 1986 г. у Мінску на Кастрычніцкай (былой Цэнтральнай) плошчы былі адкапаны рэшткі дамініканскага касцёла (першая чвэрць XVII ст.). Выявілася, што помнік быў прыстасаваны да абароны, бо на адным з яго фасадаў захаваліся байніцы ніжняга бою.

Кіраваў раскопкамі З. Пазняк. Археолаг знайшоў шмат рознакаляровых паліваных плітак падлогі і значную колькасць паліванай дахоўкі зялёнага і светла-карычневага колеру. Касцёл быў пабудаваны так, што байніцы для гармат знаходзіліся на бакавым фасадзе, які размяшчаўся паралельна земляным бастыёнам, што абаранялі Менск у XVII ст. Пасля раскопак аб'ект быў закансерваваны з мэтай аднаўлення ў будучым.

У канцы 60-х гг. XX ст. зноў з'явілася рэальная пагроза гістарычнаму цэнтру Мінска. Архітэктары С. С. Мусінскі, Д. П. Кудраўцаў і Л. А. Каджар прапанавалі праект рэканструкцыі вуліцы Нямігі, паводле якога старажытная забудова зносілася, а вуліца значна пашыралася. Нягледзячы на супраціў грамадскасці і крытычныя артыкулы ў цэнтральных савецкіх газетах, Нямігу знеслі, і на адным з яе бакоў пабудавалі жылы дом, які атрымаў найменне «Дом Мусінскага».

Рэальная пагроза ўзнікла і для Петрапаўлаўскай царквы, помніка архітэктуры XVII ст., прыстасаванай пад дзяржаўны архіў (да 1991 г. у будынку размяшчаліся Цэнтральны дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі БССР і Цэнтральны дзяржаўны архіў (з 1976 г. – архіў-музей) літаратуры і мастацтва БССР). Помнік удалося захаваць, але пастаўлены побач «Дом Мусінскага» знішчыў аб'ект як дамінанту старажытнага Мінска. Дарэчы, падчас зямельных работ на вуліцы Нямізе будаўнікі натрапілі на ганчарны горан канца XVI – пачатку XVII ст., у якім захавалася шмат посуду і кафлі.

У гэты ж час архітэктары на чале з Ю. В. Шпітам і Ю. П. Грыгор'евым задумалі знесці гістарычную забудову Верхняга горада і Траецкага прадмесця разам з Купалаўскім тэатрам.

Дзякуючы намаганням беларускай інтэлігенцыі і асабіста Уладзіміру Караткевічу гэтыя планы ўдалося прыпыніць. У другой палове 70-х гг. XX ст. узнікла грамадская ініцыятыва зрабіць праект адбудовы і рэканструкцыі гэтай часткі гістарычнага цэнтра. Сфарміравалася група спецыялістаў, у якую ўвайшлі маладыя архітэктары-рэстаўратары на чале з Сяргеем Георгіевічам Багласавым: гісторык Уладзімір Мікалаевіч Дзянісаў, археолаг і мастацтвазнаўца Зянон Станіслававіч Пазняк, археолаг Валянцін Енісеевіч Собаль, аўтар гэтага дапаможніка і іншыя энтузіясты адраджэння Мінска.

> Да 1979 г. быў зроблены дэталёвы праект гістарычнай рэканструкцыі Мінска, а таксама макет аднаўлення Верхняга горада з ратушай, гандлёвымі радамі, царквой Святога Духа і іншымі страчанымі, або знявечанымі храмамі і кляштарамі; некаторыя з іх зараз адноўленыя [38].

Альбом з праектам захавання Мінска праз супрацоўніка ЦК КПБ Уладзіміра Аляксандравіча Гілепа перадалі кіраўніку краіны – першаму сакратару ЦК КПБ Пятру Міронавічу Машэраву. Праект яму спадабаўся, і яго зацвердзілі, адмяніўшы папярэднія прапановы. У 1980 г. пачалася

рэканструкцыя Траецкага прадмесця, а пазней Верхняга горада. Цалкам грамадскі праект быў рэалізаваны ў 2012 г.

У сакавіку 1980 г. прынята пастанова Мінскага гаркама КПБ і гарвыканкама «Аб рэканструкцыі гістарычнай часткі горада Мінска». У адпаведнасці з ёй, трэба было аднавіць гарадскую старажытную забудову, надаць ёй новую, культурную функцыю. Планавалася аднавіць тры гістарычныя раёны нашай сталіцы: Верхні горад (кварталы, абмежаваныя вуліцамі Інтэрнацыянальнай, Рэспубліканскай, Нямігай і ракой Свіслач), Траецкае прадмесце (вуліцы Максіма Горкага, Янкі Купалы і рака Свіслач) і Ракаўскае прадмесце (вуліцы Астроўскага, Віцебская, Вызвалення і Замкавая).

Спачатку будаўнікі пачалі работы ў Траецкім прадмесці, каб, назапасіўшы неабходны вопыт, перайсці да комплекснай рэгенерацыі найбольш каштоўнай і старажытнай часткі Мінска – Верхняга горада. Траецкае прадмесце – квартал, забудаваны ў XIX ст. невысокімі камяніцамі з характэрным дэкорам, утульнымі маленькімі дворыкамі, злучанымі праходамі ў адзінае цэлае, – дайшоў да нас у вельмі дрэнным стане. Незваротна страчаны амаль усе малыя формы: брамы, каваныя агароджы, калодзежы, ліхтары, лесвіцы, частка балконаў, зменена форма дахаў, многія будынкі перабудаваны, страцілі першапачатковае аблічча і знаходзіліся ў дрэнным тэхнічным стане, бо капітальных рамонтаў пасля апошняй вайны тут не было.

Усё гэта зрабіла немагчымым акадэмічную рэстаўрацыю, бо квартал згубіў старое наваколле. Таму пры яго аднаўленні быў вызначаны кірунак на рэгенерацыю. Для гэтай мэты былі скарыстаны розныя архітэктурна-рэстаўрацыйныя сродкі. Па-першае, рэстаўрацыя фасадаў, аднаўленне па архіўных дакументах, старых фотаздымках і ўзорах XIX ст. аконных і балконных рашотак, філёнгавых дзвярэй, ліхтароў, шыльдаў, брам, высокіх дахаў, накрытых чырвонай дахоўкай. Па-другое, аднаўленне страчаных рагавых будынкаў. Планавалася зрабіць іх па захаваных чарцяжах, але, на жаль, гэта не было зроблена, і іх новая архітэктура не зусім упісваецца ў планіроўку квартала.

* * *

*Нягледзячы на шматлікія страты, гістарычны цэнтр Мінска цікавы для айчынных і замежных турыстаў, мае шэраг музеяў і прыцягальны не толькі для гасцей, але і для мясцовых жыхароў. Зараз гэта месца гарадскога адпачынку.*

## 2.3. Рэстаўрацыя мемарыяльных садоў і паркаў

Садова-паркавая архітэктура – гэта спалучэнне прыродных кампанентаў (рэльефу мясцовасці, рэчак, ручаёў, азёраў, лугоў і лясоў) са штучнымі пасадкамі, сажалкамі, каналамі, алеямі, тэрасамі, садова-паркавымі скульптурамі, рознымі збудаваннямі. Радзімай садова-паркавага мастацтва з'яўляецца Італія. У XVI ст. архітэктары ў ваколіцах Рыма, Фларэнцыі, Падуі і іншых гарадоў стваралі ўнікальныя сады-вілы. У эпоху Рэнесансу і ранняга барока гэтая з'ява распаўсюдзілася на краіны Заходняй Еўропы і неўзабаве трапіла ў Беларусь. Каб ствараць такія паркі і архітэктурныя ансамблі, былі патрэбныя не толькі архітэктары, але і мастакі, скульптары, батанікі, садоўнікі і іншыя спецыялісты, якіх магнаты і шляхта запрашалі з-за мяжы.

Пасля таго, як *Мікалай Крыштаф Радзівіл «Сіротка»* наведаў Італію, ён быў у захапленні ад краявідаў і архітэктуры горада Альбы, дзе яшчэ з часоў Рымскай імперыі знаходзіліся загарадныя дамы-вілы рымскіх патрыцыяў. Яны былі размешчаны вакол возера сярод маляўнічай прыроды. Таму такі парк як месца летняга адпачынку Сіротка вырашыў стварыць у ваколіцах *Нясвіжа*, на беразе ракі Ушы. Магчыма, што работы пачаліся яшчэ ў канцы XVI ст. Выява парка Альбы ёсць на гравюры Тамаша Макоўскага 1604 г., паркавы комплекс меў плошчу да 400 гектараў.

Вялікі ўплыў на развіццё падобных комплексаў на Беларусі зрабілі архітэктары Францыі. Да стварэння садова-паркавага мастацтва краіны меў дачыненне архітэктар *Андрэ Ленотр* (1613–1700). Менавіта ён стварыў славуты Версальскі парк як загарадную рэзідэнцыю французскіх каралёў. Так узнік французскі рэгулярны парк, створаны на грунце італьянскага. Такі парк займаў вялікую тэрыторыю, знаходзіўся на плоскім рэльефе альбо тэрасе, што паступова спускалася да вады (ракі ці канала). Таму і радзівілаўскі парк Альба сталі называць «беларускім Версалем». Парк канчаткова сфарміраваўся ў XVIII ст. Прыкладна ў 1740-я гг. *Міхал Казімір Радзівіл «Рыбанька»* пабудаваў невялікія палацы: у Альбе – эрмітаж (фр. – месца адзіноты) і недалёка ад Нясвіжскага замка – кансаляцыя (лац. consolatio – заспакаенне), пры якіх залажыў парк. Аснова яго кампазіцыі – гэта галоўная алея, даўжынёю болей за два кіламетры. З алеяй перасякаўся вялікі канал шырынёй 20 м і даўжынёй каля кіламетра. Адзін з самых прыгожых участкаў парка – «звярынец» быў падобны на Версальскі парк. Ён быў створаны ў выглядзе кола, у якім восем прамянёў-каналаў вялі да круглай сажалкі з востравам, у сярэдзіне якога стаяў паляўнічы павільён. Вада ў каналы трапляла з ракі Ушы. Над каналамі былі масткі з белага каменю, а на іх берагах стаялі 4 млыны. Тут быў і сапраўдны звярынец плошчаю 90 га, дзе ўтрымліваліся як мясцовыя, так і экзатычныя жывёлы як аб'екты паляванняў. Самая старая частка парку – «італьянскі парк» – злучалася з Нясвіжам галоўнай ліпавай алеяй. Тут размяшчаліся двухпавярховы палац і «зялёны тэатр», дзе спектаклі праходзілі пад адкрытым небам. У Альбе дзейнічалі розныя мануфактуры і былі

ават ваенныя вучэльні – артылерыйская і мараходная. Аднак пасля ліквідавання Рэчы Паспалітай ужо ў пачатку XIX ст. усё было занядбанае.

У канцы мінулага стагоддзя тут хацелі стварыць пейзажны парк і рабілі пэўныя пасадкі, але працы спыніліся. У пачатку XXI ст. вырашылі аднавіць Альбу як месца адпачынку. Былі праведзены археалагічныя раскопкі, расчышчана рэчышча Ушы, некалькі гадоў працаваў маладзёжны валанцёрскі лагер. Калі будуць адноўлены былыя інфраструктура і адмысловыя будынкі, Міншчына атрымае новую зону адпачынку, бо Альба знаходзіцца ў 25 км ад трасы Брэст – Масква.

Не забыў Сіротка і пра сваю новую маёмасць – *Мірскі замак*, які стаў належаць Радзівілам пасля 1569 г. Вакол гатычнага замка былі насыпаны зялёныя валы з бастыёнамі па кутах, абведзеныя вакол ровамі з вадой. На поўнач ад вала заклалі «італьянскі сад», а з усходу – фальварак з гаспадарчымі будынкамі.

За 3 км ад замка зрабілі звярынец, дзе былі прасекі-промні дзеля кругавога абстрэлу, а навокал – загоны, у якіх трымалі дзікіх звяроў. Мірскі парк моцна пацярпеў у часы вайны 1654–1667 гг. У 1688 г. у інвентары Мірскага замка паведамлялася, што «італьянскі сад ад маскоўшчыны спустошаны, у якім больш за ўсіх дрэў – ляшчына» [12, с. 79].

«Італьянскі парк» быў адноўлены пасля 1738 г. Пісьмовыя крыніцы сведчаць, што тут было каля 400 рэдкіх дрэў, якія вырошчваліся ў бочках у аранжарэі, збудаванай з бярвенняў. Улетку яны выстаўляліся на адкрытае паветра. Тут раслі цытрусы, фігі, мірт, кіпарыс, самшыт, чырвонае і лаўровае дрэвы, італьянскі арэх. Аднак у канцы XVIII ст. парк зноў заняпаў. Яго адраджэнне пачалося ў 1933 г., калі апошні гаспадар князь *Міхаіл Святаполк-Мірскі* перасяліўся ў Мірскі замак. Вакол замка і на яго двары сталі вырошчваць ружы. Былі запрошаны іншаземныя садоўнікі, дзякуючы якім парк атрымаў рамантычны каларыт. Тут пасаджаны экзатычныя дрэвы: піхта Фразера, ёлка Энгельмана, сасна Веймутава, дугласія шэрая і інш. Паміж паркам і замкам квітнелі вялікія кусты язміну [12, с. 118].

У кастрычніку 1978 г. уладамі БССР было прынята рашэнне аб рэстаўрацыі Мірскага замка і яго наваколля. Першая чарга рэстаўрацыі замкавага комплекса ў г. п. Мір была завершана ў 2011 г. Аднаўленне «італьянскага сада» ў ваколіцах замка працягваецца [16].

Пасля эпохі барока ў Еўропе распаўсюджваецца класіцызм, які супадае па часе з рамантызмам, што пранік у літаратуру і мастацтва з канца XVIII ст. і бытаваў да 30–40-х гг. XX ст. Ён знайшоў адлюстраванне ва ўсіх відах архітэктуры і мастацтва.

У 70-я гг. XVIII ст. гродзенскі стараста *Антоній Тызенгаўз* запрасіў у *Гродна* з Францыі медыка і батаніка *Жана Эмануэля Жылібера*, які заснаваў у горадзе ўнікальны батанічны сад, самы вялікі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. У першай палове XIX ст. сад атрымаў назву гарадскога, у ім у другой палове XIX ст. з'явілася «швейцарская даліна».

Пасля Вялікай Айчыннай вайны былы батанічны сад стаў паркам культуры і адпачынку. У 60-х гг. ХХ ст. тут пасадзілі шмат новых дрэў і асабліва кустоў, паставілі савецкія скульптуры з гіпсу і фантан. У парку захаваліся два будынкі, узведзеныя ў часы Тызенгаўза – Гродзенскі тэатр лялек (тэатр Панятоўскага) і былая каралеўская медычная акадэмія. Сучасны парк носіць імя Жылібера.

Цікавы сімбіёз рамантызму і класіцызму назіраецца ў садова-паркавым ансамблі ў *в. Залессе* Смаргонскага р-на. У другой палове XVIII ст. тут з'явіўся маёнтак Агінскіх, уплывовых беларускіх магнатаў. Спачатку быў пабудаваны драўляны палац і пасаджаны рэгулярны парк. У 1802 г. у палацы пасяліўся вядомы грамадскі і палітычны дзеяч *Міхал Клеафас Агінскі*. Ён вырашыў цалкам перабудаваць маёнтак і запрасіў зрабіць гэта прафесара архітэктуры Віленскага ўніверсітэта *Міхала Шульца*. Да 1815 г. быў узведзены цагляны палац у стылі класіцызму вельмі адметнай архітэктуры, дзе чаргуюцца адна- і двухпавярховыя аб'ёмы. Побач пабудаваны аранжарэі і дом садоўніка. Летам ва ўнутраны дворык каля палаца з аранжарэй выносілі вазоны з кветкамі і цеплалюбівымі раслінамі.

Новы залескі парк меў рамантычны характар – разнастайныя павільёны, альтанкі, масткі і памятныя камяні, адзін з якіх пастаўлены ў гонар Касцюшкі. Побач з англійскім паркам былі два звярынцы. У адным размяшчаліся дзікія жывёлы, а другі быў прызначаны для прагулак.

Каля старой сажалкі з'явіўся вадзяны млын. Шмат было клумбаў з рознымі кветкамі. Парк меў цяністыя бярозавыя і тапаліныя алеі, дзе было вельмі ўтульна ў летнія спякотныя часы. Сябры Агінскага, якія не аднойчы наведвалі маёнтак, назвалі гэты комплекс «Паўночныя Афіны». У канцы XIX ст. сядзіба занепала. Яна моцна пацярпела ў часы Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў. Аднак новая гаспадыня сядзібы *Марыя Жабракоўская* ў перыяд з 1927 г. па 1939 г. аднавіла палац і прывяла да парадку парк. У 1953 г. ансамбль узялі пад дзяржаўную ахову і зрабілі дом адпачынку. З 1996 г. тут знаходзіўся філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Потым ён стаў сядзібай М. К. Агінскага і філіялам Музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры. Першыя спробы рэстаўрацыі адбыліся ў 90-х гг. ХХ ст. Аднавілі каплічку, памянялі дахі, сталярку, узвялі млын і аднавілі альтанку Амеліі, названую ў гонар старэйшай дачкі кампазітара. Потым палац доўга стаяў на кансервацыі. Рэстаўрацыя ансамбля завяршылася ў 2012 г. У 2014 г. адбылося афіцыйнае адкрыццё музея-сядзібы М. К. Агінскага.

Пісьмовыя крыніцы канца XVIII – пачатку ХХ ст. сведчаць, што абавязковай часткай шляхецкай рэзідэнцыі быў парк, разбіты па італьянскаму (у пачатку стагоддзя), французскаму або англійскаму (у канцы стагоддзя) узору. Паркі аздабляліся альтанкамі і статуямі ў антычным стылі, штучнымі гротамі, каналамі, вадаспадамі. У засені старых дрэў будавалася каплічка. Значную частку шляхецкай рэзідэнцыі займаў сад, дзе за ліпавымі прысадамі раслі яблыні, грушы, вішні і слівы.

У XIX ст. змяніліся беларускія гарады, дзе таксама з'явіліся паркі, скверы і бульвары. Так, у 1805 г. губернатар *Захар Карнееў* заклаў у *Мінску* гарадскі парк, які потым у яго гонар назвалі Губернатарскім. Гэта быў парк пейзажнага тыпу. Свіслач дзяліла яго на дзве тэрасы. Ніжнюю частку парка аздаблялі штучны ручэй і дэкаратыўныя вадаёмы. Захаваліся апісанні парка, зробленыя ў 1810 г. Вадроўнікі ім захапляліся і адзначалі, што мінскі сад размешчаны па ўзоры англійскіх садоў. Пасля 1858 г. планавалі вялікую рэканструкцыю і пашырэнне парка, але планы не былі рэалізаваныя. У 1912 г. тут пабудавалі аранжарэю. У пачатку XX ст. у парку з'явіўся велатрэк, дзе гараджане маглі ездзіць на роварах, як на сваіх, так і ўзятых напракат. (На жаль, у 1970-я гг. велатрэк знеслі.) Пасля 1917 г. парк атрымаў назву сад «Прафінтэрн», а ў 1936 г. яму надалі імя Максіма Горкага. У 1981 г. у ім устанавілі помнік у гонар пісьменніка.

Пасля вайны тэрыторыя парка павялічылася за кошт суседніх зруйнаваных кварталаў і дасягнула памераў у 22 га. Тут пасадзілі шмат новых дрэў і кустоў, збудавалі летні «зялёны тэатр» на 1800 месцаў. Тэрыторыю абнеслі цаглянай агароджай з металічнымі кратамі, заасфальтавалі алеі і пляцоўкі. З 1952 г. гэта быў парк культуры і адпачынку, а з 1960 г. – дзіцячы парк з адпаведнымі атракцыёнамі. На месцы велатрэка пабудавалі крыты каток для хакеістаў і фігурыстаў. У 1952 г. быў зроблены ў стылі неакласіцызму галоўны ўваход у парк па праекце архітэктара Г. У. Заборскага. У парку расце больш за 60 відаў дрэў і кустоў у асноўным мясцовых парод, але ёсць і рэдкія расліны: хвоя кедровая, піхта каліфарнійская, лістоўніца еўрапейская і інш.

Другім старадаўнім гарадскім паркам Беларусі з'яўляецца гомельскі. Ён узнік у гістарычным гарадскім цэнтры Гомеля на месцы дзядзінца і пазнейшых драўляных замкаў эпохі Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Пасля першага раздзелу Рэчы Паспалітай *Гомель* быў перададзены расійскаму магнату *графу Румянцаву*, які збудаваў тут вялікі палац і заснаваў побач парк у пейзажным стылі. Перад галоўным фасадам палаца быў парадны партэр, абмежаваны групамі дрэў і алеямі. Каля другога боку палаца на беразе Сажа зрабілі парадны дворык (курданёр), дзе раслі дэкаратыўныя кусты і знаходзіўся прыгожы газон. Пасля 1834 г. у палаца і парка з'явіўся новы гаспадар – *граф Паскевіч*. Ён сур'ёзна заняўся іх перабудовай. Зімой 1848 г. з навакольнага лесу прывезлі і пасадзілі тут вялікіх памераў дуб, клён, граб, вяз і ясень, а наступнай зімой з Варшавы яшчэ 50 відаў вялікіх і 300 дробных дрэў, а таксама шмат цяплічных раслін. Такім чынам пашырыўся парадны партэр, а кампазіцыя парка набыла рамантычны характар. На дне глыбокага яра і ручая пад назвай Гамяюк зрабілі Лебядзінае возера, над якім узнік вісячы мосцік, што вёў у пладовы сад. У парку з'явіліся гроты, памятныя камяні і на алеях скульптуры старажытных філосафаў, воінаў і паэтаў, а ў садзе над Сажом – бюст Паскевіча ў рымскіх латах.

У канцы XIX – пачатку XX ст. парк зноў павялічыўся, да 25 га. Тут пасадзілі шмат экзотаў і кветнікаў.

Парк добра захаваўся да нашых дзён, яго прысады і насаджэнні вылучаюцца вялікай разнастайнасцю. У ім растуць рэдкія экзоты, прывезеныя з Парыжа – дуб чэрашчаты, каралінскія і амерыканскія ліпы. Паўднёвы парк – гэта ўнікальная зона адпачынку.

> У другой палове XIX – пачатку XX ст. на садова-паркавую архітэктуру паўплывалі гістарызм і эклектыка, а потым і мадэрн. Адбылося ўскладненне структуры паркаў з падзелам на пейзажныя і рэгулярныя зоны. Рысы мадэрну надалі сядзібнаму дойлідству асіметрычнасць, кампазіцыю з рознавялікіх аб’ёмаў пад адным складным дахам.

Пошук новага праявіўся ў знешнім дэкоры *Лошыцкай сядзібы* (1890) на тагачаснай ускраіне Мінска.

Ужо ў XVI ст. існавалі феадальныя двары Лошыцкі і старыя Лошыцы, якімі валодалі князі Друцкія-Горскія. У XVIII ст. маёнтак належаў Прушынскім, якія ў другой палове XVIII ст. стварылі тут барочную сядзібу. Ад яе захавалася ўязная ліпавая алея, якая знаходзіцца на асноўнай кампазіцыйнай восі былога барочнага ансамбля.

Захаваўся інвентар сядзібы 1772 г., які сведчыць, што тут быў вялікі сад і прамавугольны вадаём з мостам. Пасля 1890 г. парк страціў сваю рэгулярнасць, на месцы баскетаў з’явіліся пейзажныя кампазіцыі. Дом з флігелем утвараюць вялікі парадны двор з некаторымі барочнымі элементамі: тэрасіраваныя схілы і клумба з ліпавымі дрэвамі. Часткова захавалася ўязная ліпавая алея, што ішла ад былога Ігуменска-Мінскага тракту. Яна вылучаецца магутнымі ліпамі, узрост якіх складае каля 250 гадоў. У аснове кампазіцыі пейзажнай паўночнай часткі парку ляжыць паляна, ахопленая з боку сада паласою дрэў. Частку парку на крутым грэбені тэрасы складаюць ліпы XVIII ст. і адзінкавыя (яшчэ больш старыя) дубы. Другая паляна знаходзіцца ў паўночнай частцы парку ў пойме рэчкі Лошыцы. Да гістарычнай сядзібы прымыкаюць сады, былыя гадавальнікі і калекцыі беларускага аддзела Усесаюзнага інстытута раслінаводства. Агульная плошча парку складае 100 га.

Пасля Другой сусветнай вайны ў гарадах Беларусі ўзнікалі новыя паркі, скверы і бульвары. Адзін з іх заснаваны ў цэнтры Мінска ў 1949 г. на месцы гарадской забудовы, знішчанай падчас вайны. Паколькі тут да вайны быў дом *Янкі Купалы*, то ў 1962 г. парк атрымаў імя ў гонар класіка беларускай літаратуры.

У 1950 г. тут было пасаджана больш за 4 тысячы дрэў, вялікая колькасць дэкаратыўных кустоў і вызначаны асноўныя алеі. Берагі Свіслачы, якая працякае праз парк, атрымалі каменную і бетонную абламоўку. Каля галоўнага ўваходу ў парк зрабілі фантан са скульптурнай кампазіцыяй «Купалле», ці «Вянок». У 1959 г. у парку пабудавалі музей імя Янкі Купалы, пастаўлены на месцы яго былога дома, які згарэў у 1941 г. Парк з’яўляецца цікавым прыкладам архітэктурнай спадчыны савецкага перыяду.

## 2.4. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў

Адзін з першых даследчыкаў абарончай архітэктуры Беларусі *Міхаіл Аляксандравіч Ткачоў* называў Беларусь краінай замкаў, і ён меў рацыю [32, с. 248, 269, 270]. Большасць беларускіх замкаў XIV–XVIII стст. былі драўлянымі і канчаткова разбураны пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Мураваныя замкі моцна пацярпелі падчас шматлікіх войнаў і ў XIX ст. у асноўным былі разбураныя і не мелі ўладальнікаў, бо раней знаходзіліся ў дзяржаўнай уласнасці альбо страцілі былых гаспадароў.

З усіх беларускіх замкаў найбольш пашанцавала Нясвіжскаму, пабудаванаму Мікалаем Радзівілам у канцы XVI ст. Спачатку *Нясвіжскі замак* уяўляў сабой чатырохвугольнік (170 х 120 м), абведзены высокім земляным валам з бастыёнамі па кутах. Добра ўмацаваны, ён у 1654 г. і 1659 г. паспяхова вытрымаў асады варожага войска. Аднак у 1706 г. шведскія войскі захапілі замак і ўзарвалі яго бастыёны. У 20-я гг. XVIII ст. замак адноўлены. Радзівілы стварылі цудоўны палацава-замкавы комплекс, дзе захоўваліся іх шматлікія багацці. Чарговы ўладальнік замка Дамінік Радзівіл браў удзел у вайне 1812 г. на баку Напалеона. Пасля вайны царскія ўлады канфіскавалі і разрабавалі замак. Новыя ўладальнікі ім не цікавіліся і ў ім не жылі.

Пасля 1860 г. Радзівілы ўжо іншай радавой лініі вярнуліся з Германіі ў Нясвіж і адрадзілі замак. Пасля 1875 г. Антоній Радзівіл і яго жонка Марыя дэ Кастэлян адрамантавалі палац і заснавалі парк плошчай 11 га ў паўночна-ўсходняй частцы горада, які атрымаў назву «Парк Антонія». Побач існуе другі Стары парк (16 га) з рамантычнымі павільёнамі. У 1896 г. тут пастаўлены помнік вернаму сабаку. У 1990-х гг. створана алея скульптурных партрэтаў слынных дзеячаў гісторыі і культуры Нясвіжа. У 1913–1914 гг. англійскія садоўнікі пасадзілі Японскі сад, а насупраць Старога парку ўзнік Новы, або Марысін парк (22 га). Каля Новага парку, на левым беразе замкавай сажалкі, зрабілі іпадром, альбо Англійскі парк (10 га). Замак перажыў Першую сусветную вайну, рэвалюцыю, польска-савецкую вайну. Пасля Рыжскай дамовы 1921 г. Нясвіж апынуўся ў складзе Польшчы і ў замку зноў да верасня 1939 г. жылі Радзівілы. Перажыў замак і Другую сусветную вайну.

Пасля вайны тут размясціўся санаторый, і таму палац быў дагледжаны. У 2001 г. санаторый закрылі, і ў замку пачалася рэстаўрацыя. У 2001 г. замкавы комплекс перадалі Нацыянальнаму гісторыка-культурнаму музею-запаведніку «Нясвіж». Падчас рэстаўрацыі 24 снежня 2002 г. у палацы адбыўся пажар, ад якога згарэлі паддашак галоўнага корпуса, фрагменты даху, былі пашкоджаны фрэскі і іншыя элементы дэкору. Пасля пажару драўляныя дэталі апрацавалі спецыяльным растворам, драўляныя перакрыцці і кроквы замянілі на жалезабетонныя, памянялі дах – накрылі яго дахоўкай, зрабілі круглыя вокны з вітражамі. Была зроблена гідраізаляцыя сцен і падмуркаў палаца.

У 2004 г. галоўную вежу замка аднавілі паводле гравюры Т. Макоўскага ў стылі рэнесансу. Аднак навукоўцы выступілі супраць гэтага і патрабавалі зрабіць вежу ў стылі барока, як гэта было ў XVIII ст. у часы Казіміра Радзівіла Рыбанькі. Навукова-метадычны савет па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры прыняў рашэнне змяніць выгляд замкавай вежы па стане на XVIII ст.

Навуковым кіраўніком рэстаўрацыі Нясвіжскага замка прызначаны вядомы беларускі рэстаўратар *Сяргей Аляксандравіч Друшчыц*. Рэстаўрацыя палацава-паркавага ансамбля вялася з 2001 г. па 2012 г., Нясвіжскі замак у 2005 г. уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Зараз у Нясвіжскім замку дзейнічае каля 30 экспазіцыйных залаў, якія штогод наведваюць тысячы турыстаў. Так, у 2023 г. з нагоды юбілею Нясвіжа ў палацы Радзівілаў школа фларыстыкі арганізавала фестываль кветак, а ў Англійскім парку зладзілі фестываль гістарычных рэканструкцый «Нясвіжская фартэцыя».

*Мірскі замак* быў збудаваны магнатам Ільінічам у першай палове XVI ст. у стылі беларускай готыкі каля паселішча Мір. Аднак будаўніцтва замка не было скончана. У 1569 г. ён перайшоў да Радзівілаў. Новы ўладальнік Радзівіл Сіротка ў канцы XVI ст. значна перабудоўвае замак у стылі рэнесансу і барока. Вакол замка насыпалі валы з бастыёнамі, вакол іх зрабілі равы з вадою. Унутры замка каля паўночнай і ўсходняй сцен узвялі трохпавярховы палац з глыбокімі сутарэннямі, а звонку – уздоўж паўднёвай і заходняй – аднапавярховыя службовыя прыбудовы. Галоўная ўваходная вежа атрымала дадатковае ўмацаванне паўкруглай формы – перадбрам’е. Каменнай разьбой былі аздоблены балясы, парэнчы, прыступкі на лесвіцах, ганках, агароджах масткоў і балконаў. Інтэр’еры палаца мелі шыкоўныя кафляныя печы, аблямаваныя зялёнапаліванай і паліхромнай кафляй.

Першы раз замак моцна пацярпеў ад ваенных дзеянняў у сярэдзіне XVII ст. У 1655 г. Мір захапілі казакі Івана Залатарэнкі, а потым рускія. Пра разбурэнне замка сведчыць інвентар 1660 г. Каля 30 гадоў палац быў занядбаны. Аднаўляць замак пачалі ў 1681 г. Асноўныя работы ішлі з 1686 г. па 1689 г. У 1706 г. у Мір уварваліся войскі шведскага караля Карла XII, замак быў спалены і разбураны. Аднаўленчыя работы пачаліся пасля 1729 г. і былі скончаны ў 1738 г. У адноўленым палацы з’явіліся партрэтная зала і зала для танцаў. Тут мелася 16 комінаў і 17 кафляных печаў. З цягам часу замак стаў прыходзіць у заняпад, пра што сведчаць яго апісанні, зробленыя ў 1778 г. і 1794 г. У пачатку XIX ст., калі ім валодаў Дамінік Радзівіл, замак крыху аднавілі [12, с. 101].

У 1812 г. пад сценамі замка адбываліся ваенныя дзеянні, і ён пачаў інтэнсіўна разбурацца. У 1827 г. пісалі, што ён цалкам разбураны і пакі-

нуты. Паступова на замак пачалі звяртаць увагу навукоўцы і мастакі. Сітуацыя крыху змянілася да лепшага, калі яго набыў князь Святаполк-Мірскі. Каля замка выкапалі глыбокі стаў, пабудавалі на падмурках былога будынка канца XVI – пачатку XVII ст. новы палац, і пасля смерці князя Мікалая Святаполк-Мірскага ў 1904 г. сямейную капліцу-пахавальню. Гаспадаром замка стаў сын Мікалая – князь Міхаіл. У 1921 г. ён вярнуўся ў Мір і вырашыў замак аднавіць. У 1924 г. праект адбудовы зрабіў варшаўскі архітэктар Тэадор Бурш, і аднаўленчыя работы пачаліся. Аднавілі толькі адну залу – «слановую». Быў зроблены новы дах на драўляных кроквах. У 1933 г. князь Міхаіл перасяліўся ў замак. Для яго зрабілі асобны балкон на паўднёвым фасадзе палаца з відам на двор і стаў. Да 1939 г. часткова аднавілі тры замкавыя вежы і частку ўсходняга крыла палаца [12, с. 117, 118]. Памёр князь у 1938 г., а ў верасні 1939 г. у замку з'явіліся новыя гаспадары.

У пачатку вайны фашысты зрабілі ў замку гета, а пасля вайны тут пасяліліся жыхары з наваколля замка, што згубілі падчас вайны сваё жытло. Паступова яны збудавалі свае дамы, і замак зноў стаяў пусты і занядбаны. Як толькі ў БССР стварылі спецыяльныя навукова-рэстаўрацыйныя вытворчыя майстэрні, у 1971 г. была зроблена часовая кансервацыя замкавых муроў і ўсе вежы замка накрылі гонтам.

> У кастрычніку 1978 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову аб рэстаўрацыі Мірскага замка. Пасля гістарычных і археалагічных даследаванняў і архітэктурных абмераў у 1981 г. быў зроблены праект рэстаўрацыі (аўтары – архітэктары *В. Ю. Аттас, С. І. Верамейчык, В. В. Калнін*, археолаг *А. А. Трусаў*). За аснову ўзялі выгляд замка, які склаўся ў XVII ст., з выяўленнем і частковай рэстаўрацыяй некаторых фрагментаў XVI–XX стст.

Архітэктурны аб'ект падзялілі на тры зоны. У самай захаванай частцы замка – зоне адраджэння – прапанавалі зрабіць музей. У другой – зоне адаптацыі (частка замка, адноўленая ў 20–30-х гг. XX ст.) планавалі размясціць вытворчыя майстэрні мастацкага прафтэхвучылішча. Трэцяя зона – прастора трансфармацыі (частка замка, пазбаўленая ўнутраных перакрыццяў і сцен) прызначалася для музея рэстаўрацыі замка, сувенірных крамаў і кавярні. Аднак за доўгія часы рэстаўрацыі, якая пачалася з закладкі першай рэстаўрацыйнай цагліны 25 чэрвеня 1983 г., сітуацыя змянілася. Быў прызначаны новы кіраўнік праекта рэстаўрацыі – архітэктар Д. С. Бубноўскі. 12 кастрычніка 1992 г. у прысутнасці кіраўніцтва Рэспублікі Беларусь урачыста адкрылі першую музейную экспазіцыю ў адноўленай паўднёва-заходняй вежы [16]. У 2000 г. замкавы комплекс «Мір» уключаны ў спіс Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Урачыстае адкрыццё ўсяго музейнага комплексу адбылося ў снежні 2010 г. з удзелам кіраўніцтва краіны. Замак меў 39 музейных экспазіцый і ўнікальны гатэль на 16 нумароў.

Складаны шлях па кансервацыі і рэстаўрацыі прайшоў *Лідскі замак.* Гэты замак-кастэль быў пабудаваны вялікім князем Гедымінам у пачатку XIV ст. каля паселішча Ліда. Замак памерам прыкладна 80 х 80 м паўстаў на пясчанай выспе ў балоцістай сутоцы дзвюх рэчак – Лідзейкі і Каменкі. Работы па ўзвядзенні замка вяліся 5–7 гадоў. Замак пабудаваны з палявога каменю і тоўстай цэглы. Таўшчыня сцен унізе 2 м, уверсе яны звужаюцца да 1,5 м і пераходзяць у баявую галерэю. Спачатку замак меў толькі адну вежу – у паўднёва-заходнім куце двара памерам 9 х 9 м. У канцы XIV – пачатку XV ст. замак капітальна перабудаваў князь Вітаўт і прыстасаваў яго да агнястрэльнай зброі. Была збудавана яшчэ адна вежа – паўночна-ўсходняя. Унутры замка да яго сцен прымыкалі драўляныя аднапавярховыя будынкі (казармы), шырынёй каля 4 м. Таксама быў асобны будынак на каменных падмурках (6 х 4м), дзе мог жыць камендант (кашталян). Ва ўсходняй частцы двара выкапаны два калодзежы.

У XIV–XV стст. замак не раз пацярпеў у ваенных дзеяннях, але заўсёды аднаўляўся і быў адным з самых значных у ВКЛ. Летам 1659 г. замак аблажыла вялікае войска царскага ваяводы Івана Хаванскага, якое пасля доўгай аблогі яго захапіла і разбурыла.

Наступны ўдар у пачатку XVIII ст. замку нанеслі шведы, якія ўзарвалі замкавыя вежы. Аднак яшчэ ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. сцены стаялі, а рэшткі вежаў захоўваліся да ўзроўню трэцяга паверха.

Замак не раз малявалі мастакі, вывучалі гісторыкі. У 1891 г. Ліда моцна пацярпела ад пажару, і гарадскія ўлады пачалі разбіраць муры замка на будаўнічыя матэрыялы. Аднак грамадскасць горада пачала скардзіцца ў Санкт-Пецярбург, і разбурэнне замка спынілася. Прыехалі навукоўцы, сярод іх быў *Пётр Пятровіч Пакрышкін*, які зрабіў абмеры муроў і іх фотафіксацыю. У 1909 г. замак ачысцілі ад смецця, а паверхні сцен абмазалі цэментнай рошчынай, якая стала прыцягваць вільгаць і паскорыла разбурэнне муроўкі.

У 20-я г. XX ст. польскія кансерватары крыху паднавілі муры замка, злучылі каменнай агароджай заходнюю і паўднёвую сцены, часткова залажылі разбураны паўднёва-ўсходні кут і замуравалі бакавыя ўваходы. У замак вяла драўляная брама, зробленая на месцы разбуранага паўночна-заходняга замкавага кута. Летам тут мог быць вандроўны цырк альбо звярынец, а зімою залівалі каток. У гады вайны фашысты спачатку трымалі на замкавым двары ваеннапалонных, а потым зрабілі склады боеприпасаў.

У 1953 г. Лідскі замак узялі пад дзяржаўную ахову, а ў 1967 г. перадалі пад нагляд мясцоваму будаўнічаму трэсту, які зрабіў на двары спартыўную пляцоўку. Першыя археалагічныя раскопкі тут праводзілі *Міхаіл Аляксандравіч Ткачоў* (1970) і *Яраслаў Генрыхавіч Звяруга* (1974). Аднак замак працягваў разбурацца. У 1975 г. гарадскія ўлады г. Ліды вырашылі зрабіць кансервацыю замка і звярнуліся ў Міністэрства культуры БССР.

Навуковым кіраўніком кансервацыі Лідскага замка прызначаны архітэктар *Сяргей Георгіевіч Багласаў,* а гісторыкам і археолагам – аўтар дапаможніка. У 1977–1978 гг., а таксама ў 1980 г. і 1985 г. былі праведзены раскопкі на замкавым двары, расчышчаны рэшткі замкавых вежаў, сабраны вялікі археалагічны матэрыял XIV–XVII стст. Упершыню ў Беларусі на базе гістарычнага факультэта БДУ быў арганізаваны спецыяльны студэнцкі будаўнічы атрад імя У. І. Пічэты, які прымаў актыўны ўдзел у раскопках і будаўнічых работах.

Летам 1978 г. у Лідзе быў створаны вытворчы ўчастак для рэстаўрацыйных работ. Дапамагала адбудоўваць замак кіраўніцтва горада, асабліва старшыня гарвыканкама *Уладзімір Міхайлавіч Логаш* і галоўны архітэктар *Анатоль Сяргеевіч Пархута*. Кансервацыю замка планавалі скончыць да 1985 г., на тэрыторыі зрабіць гісторыка-археалагічны музей з паказам на мясцовасці планаў былой драўлянай забудовы, а ў цэнтры двара размясціць адкрыты гарадскі тэатр. Аднак фінансаванне рэстаўрацыйных работ у сярэдзіне 1990-х гг. спынілася, і пачалося разбурэнне незакончаных замкавых муроў. Новы праект поўнага аднаўлення замка падрыхтавалі ў 2003 г.

У верасні 2005 г. у Лідзе прайшоў сярэдневяковы фестываль «Замак Гедыміна». Сродкі, атрыманыя ад яго правядзення, былі патрачаны на рэканструкцыю Лідскага замка. За два дні на фестывалі пабывала 10 тыс. гледачоў. Пасля турніру рыцараў супрацоўнікі Лідскага гістарычна-мастацкага музея пачалі ладзіць у замку рэгулярныя экскурсіі [37]. У траўні 2007 г. у Лідскім замку прайшоў фэст рыцарскіх баёў.

Асноўныя рэстаўрацыйныя работы адбываліся ў замку вясной і летам 2010 г. Дабудавалі паўднёва-заходнюю вежу, сцены з драўлянай галерэяй, прывялі ў парадак замкавы двор. У снежні 2017 г. адчынена выставачная экспазіцыя «Лідскі замак – гістарычныя падзеі і постаці».

Скончылася рэстаўрацыя ў 2019 г. Замак стаў цэнтрам рыцарскіх фэстаў, з 2020 г. дзейнічае яшчэ адна музейная экспазіцыя.

Старажытнае беларускае мястэчка *Гальшаны* ў 1555 г. стала ўласнасцю знакамітых беларускіх магнатаў Сапегаў. Адзін з іх падканцлер ВКЛ Павел Сапега ў пачатку XVII ст. пабудаваў тут рэзідэнцыю – палацава-паркавы комплекс бастыённага тыпу. За землянымі ўмацаваннямі быў узведзены двухпавярховы палац з вялікімі вокнамі, уязной брамай, галерэямі, невялікай капліцай (насупраць галоўнага ўваходу ў замкавы дворык) і вежамі па кутах. Інтэр’еры замка мелі шыкоўныя кафляныя печы, аблямаваныя паліхромнай кафляй з гербам Сапегаў, падлогі выканаaны з паліваных плітак – цаглін, скляпенні зроблены ў галандскім стылі. У Паўночную вайну замак разбурылі шведскія войскі. Былі тут і напалеонаўскія салдаты ў 1812 г. Замак заняпаў, а новыя гаспадары яго не шкадавалі. У 1880 г. адзін з іх, памешчык Гарбанёў пачаў ламаць вежы і сцены, а цэглу прадаваў на пабудову карчмы. У XX ст., калі пасля апошняй вайны ацалелую частку палаца перадалі пад вучылішча, вучняў

прымушалі разбіраць замкавыя муры на цэглу для пабудовы на месцы замка кароўніка і Дома культуры ў цэнтры Гальшанаў. Вадкі гной з фермы вылівалі на былы замкавы двор і ў замкавыя лёхі. Здавалася, што замак нічога не ўратуе. Аднак у 80-я г. XX ст. прыйшлі археолагі і рэстаўратары, зрабілі археалагічныя раскопкі, архітэктурныя абмеры і прапанавалі рэканструкцыю былога палаца Сапегаў у стылі галандскага маньерызму [39, с. 137].

Пасля 1991 г. Беларусь стала незалежнай краінай. Былы кароўнік закрылі. Мясцовыя жыхары хутка разабралі яго сцены, а накоплены гадамі гной вывезлі на свае палеткі. Паступова замак становіцца турыстычным аб'ектам, а каля яго муроў кожнае лета адбываюцца гістарычныя фестывалі. Грамадскасць патрабуе захавання замкавых муроў.

> У чэрвені 2016 г. паводле пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Гальшанскі замак атрымаў фінансы на кансервацыю з рэспубліканскага бюджэту. У 2018 г. зрабілі гідраізаляцыю падмуркаў, аднавілі паўночную вежу, умацавалі яе перакрыцці, зрабілі над ёю дах з прыгожым ветранікам (флюгерам). 6 мая 2021 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё паўночнай вежы Гальшанскага замка і турыстычна-інфармацыйнага цэнтра пры ім.

У другой палове XVI ст. каля мястэчка *Любча* беларускі магнат Ян Кішка на левым беразе Нёмана пабудаваў каменны замак у стылі рэнесансу. Памеры замка блізкія да квадрата (85 x 85 м). Па яго кутах узвышаліся шмат'ярусныя вежы з байніцамі. Да паўночна-заходняга замкавага мура ў канцы XVI – пачатку XVII ст. прыбудавалі каменны палац, накрыты пляскатай чырвонай дахоўкай. Падлога была зроблена з тоўстых паліваных керамічных плітак, сцены замка і палаца атынкаваныя. Пазней замак перайшоў да Багуслава Радзівіла, які зрабіў яго капітальны рамонт пасля вайны 1654–1667 гг.

У XIX ст. на тэрыторыі замка пабудавалі цагляны жылы корпус, які пацярпеў падчас Першай сусветнай вайны. Яго аднавіла ў 20-х гг. XX ст. графіня фон Пейкер.

Пасля апошняй вайны муры замка былі занядбаныя, пакуль на яго не звярнуў увагу настаўнік Любчанскай школы, краязнавец *Мікалай Андрэевіч Вінар,* які стварыў у Любчы гісторыка-краязнаўчы музей і дамогся аднаўлення галоўнай брамнай замкавай вежы. Пры яе аднаўленні знайшлі замкавы геральдычны ветранік з датай будаўніцтва «1581». Другім ініцыятарам аднаўлення замка стаў дырэктар завода «Лідсельмаш» *Мікалай Міхайлавіч Скрабец,* ураджэнец Любчы, былы вучань мясцовай школы. Ён хацеў ператварыць замак у дом адпачынку з музеем і паркам. У 1986 г. пачаліся археалагічныя раскопкі, архіўныя пошукі, натурныя даследаванні. Першы праект аднаўлення замка зрабіў архітэктар Л. Баркун. У першую чаргу аднаўлялі Кутнюю вежу. Замак планавалі аднавіць як палацава-паркавы комплекс па стане на пачатак XX ст. у якасці прафілакторыя для рабочых завода. Аднак гэты праект не быў рэалізаваны.

У 2003 г. стварылі дабрачынны фонд «Любчанскі замак» на чале са сталічным прадпрымальнікам *Іванам Антонавічам Пячынскім*, таксама мясцовым, адным з былых вучняў Любчанскай сярэдняй школы. З дапамогай выкладчыкаў і студэнтаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта была зроблена праектная дакументацыя для далейшых рэстаўрацыйных работ. Праект 2004 г. прадугледжваў завяршэнне Кутняй вежы і пабудову абарончай сцяны паміж Кутняй і Брамнай вежамі. На аснове новых натурных даследаванняў 2009–2010 гг. зрабілі карэкціроўку праекта, які ў 2013 г. узгаднілі з Міністэрствам культуры. У 2011–2012 гг. археолагі знайшлі рэшткі мураванай сцяны паміж Брамнай і паўночна-заходняй вежамі, падмурак якой таксама знойдзены.

> Зараз у Любчанскім замку адноўлена Брамная вежа (памерам 10 х 10 м), што з паловы вышыні пераходзіць у васьмярык, завершаны рэнесансным купалам з ліхтаром. Таксама аднавілі квадратную ў плане (8,3 х 8,3 м) паўднёва-ўсходнюю вежу XVII ст., ад якой засталіся толькі падмуркі. На адбудове замка больш за 20 гадоў працуюць валанцёры-студэнты і вучні Любчанскай сярэдняй школы.

Доўгую гісторыю вывучэння, кансервацыі і рэстаўрацыі мае *гродзенскі Стары замак.* Гэты замак быў збудаваны князем Вітаўтам на мяжы XIV і XV стст. на месцы былога гарадскога дзядзінца XII–XIII стст., дзе былі драўляныя і, магчыма, цагляныя ўмацаванні, якія загінулі падчас крыжацкіх нападаў на Гродна ў XIV ст. Замак меў магутныя каменныя муры, абарончыя вежы і двухпавярховы палац на замкавым двары. Палац быў перакрыты гатычнымі скляпеннямі, зробленымі з нервюрнай цэглы. Да сцен і замкавых вежаў прымыкалі скляпеністыя каменныя казематы ваенна-гаспадарчага прызначэння. На замкавым двары стаялі драўляныя будынкі і каменная Верхняя царква, перабудаваная ў гатычным стылі. Перад княжацкімі палацам і брамай была брукаваная плошча.

У 80-я гг. XVI ст. ужо ў значнай ступені занядбаны замак Вітаўта быў амаль што разабраны. На яго месцы па загадзе караля Стэфана Баторыя пабудавалі новы рэнесансны замак-палац як каралеўскую рэзідэнцыю [32, с. 285]. Палац меў тры паверхі з шыкоўнымі каралеўскімі пакоямі, дзе стаялі печы з паліхромнай кафляй, падлогі зрабілі з тоўстых паліваных плітак. Фасады мелі прыгожыя балконы-эркеры і дэкаратыўны роспіс у тэхніцы «зграфіта». Захаваліся малюнкі палаца і замка пачатку XVII ст. Замак моцна пацярпеў падчас вайны 1654–1667 гг., але потым рамантаваўся і перабудоўваўся. У сярэдзіне XVIII ст. яго капітальна перабудавалі саксонскія архітэктары. Быў моцна зменены фасад, зніклі шчыпец і атык, паменшыліся вокны, з’явіўся новы дэкор – рустоўка і барочныя картушы. У XIX ст. новыя гаспадары (расійскія вайскоўцы) ператварылі палац у казармы, на брукаваным двары быў пляц для салдацкіх практыкаванняў.

Пасля 1921 г. у замку да 1924 г. знаходзілася польская армія. Потым яго перадалі пад гарадскі музей і з 1928 г. пачалі падрыхтоўку да рэстаў-

рацыі. Доўгі час грошай на гэта не было. Аднак у 1933 г. кіраўніцтва Польшчы стварыла ваяводскі камітэт па аднаўленні замка да юбілею Стэфана Баторыя. Аднаўленне і даследаванне замка даручылі прафесару *Яраславу Вайцяхоўскаму,* які да верасня 1939 г. паспеў зрабіць некаторыя кансервацыйныя работы, археалагічныя раскопкі і прапанаваў аднаўленне палаца ў стылі рэнесансу. Пасля вайны, паколькі музей у замку застаўся, у канцы 1940–1950-х гг. зрабілі рамонт фасадаў будынка.

З 1987 г. вытворчае аб'яднанне «Белрэстаўрацыя» пачало распрацоўваць праект комплекснай рэстаўрацыі ўнікальнага архітэктурнага ансамбля «Стары замак» у Гродне з мэтай выяўлення і экспазіцыі трох асноўных перыядаў гісторыі замка – XII, XV і XVI стст. Навуковым кіраўніком праекта стаў архітэктар *Уладзімір Васільевіч Бачкоў.*

Пасля гістарычных даследаванняў і археалагічных раскопак У. В. Бачкоў распрацаваў наступную схему рэканструкцыі: XII ст. – кансервацыя рэшткаў Ніжняй царквы і «церама», знойдзеных археолагамі; XIV–XV стст. – гатычная эпоха часоў Вітаўта і XVI ст. – замак рэнесансу Стэфана Баторыя. Пазней Бачкоў перайшоў на працу ў «Гроднаграмадзянпраект», дзе вымушаны адмовіцца ад гатычнага перыяду і спыніцца толькі на эпосе Рэнесансу. У канцы 1994 г. праект быў гатовы, але ў 1996 г. яго фінансаванне надоўга спынілася. 6 студзеня 2012 г. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь зацвердзіў Дзяржаўную праграму «Замкі Беларусі на 2012–2018 гады», згодна з якой былі выдзелены сродкі на аднаўленне Старога замка.

Паводле праекта У. В. Бачкова аднаўленне замка планавалася ў двух варыянтах:

1) кансервацыйны павільён для захавання падмуркаў будынкаў XII ст.;

2) палац Стэфана Баторыя разам з дзвюма вежамі. Палац трохпавярховы з вежай (барбаканам), крытай галерэяй, брамай, «мернай избой», камяніцай і з двума пралётамі замкавага маста (адзін драўляны XVI ст. і каменны – XVII–XIX стст.). У палацы планаваліся розныя тэматычныя музейныя кампазіцыі, а таксама невялікі гатэль для ўдзельнікаў навуковых канферэнцый.

Праект і асабліва яго рэалізацыя выклікалі занепакоенасць і крытыку з боку грамадскасці, асабліва некаторых гісторыкаў. Асноўныя будаўнічыя работы пачаліся летам 2017 г. У лістападзе 2021 г. адкрылі першую частку новай музейнай экспазіцыі ў аднoўленай частцы замка.

На сённяшні дзень актыўна праводзіцца вывучэнне і рэстаўрацыя *Крэўскага замка.* Ідуць археалагічныя раскопкі. Знойдзена трэцяя замкавая вежа, аднаўляюцца замкавыя муры. У праекце аднаўленне галоўнай замкавай вежы.

## 2.5. Гісторыя музейнай рэстаўрацыі ў Беларусі

Пасля вайны ў БССР пачалася праца па аднаўленні музейных фондаў, якія часткова былі знішчаны альбо вывезеныя акупантамі за межы краіны. У першую чаргу ўвага звярталася на творы як свецкага, так і культавага мастацтва.

Паколькі ў БССР адсутнічалі адпаведныя кадры рэстаўратараў, пачалі звяртацца за дапамогай да спецыялістаў з Масквы і Ленінграда. У перыяд з 1952–1954 гг. і па 1975 г. імі былі адноўлены і раскрыты ад позніх запісаў асобныя творы старажытнага беларускага жывапісу з фондаў Дзяржаўнага мастацкага музея. Прычым некаторыя рэстаўрацыйныя работы выконваліся ў самім музеі, што давала магчымасць падрыхтаваць мясцовых спецыялістаў.

Пачынаючы з 1957 г. у рэстаўрацыйных майстэрнях музея пачалі працаваць мясцовыя спецыялісты.

> У 1989 г. у Дзяржаўным мастацкім музеі стварылі рэстаўрацыйны аддзел, які займаецца рэстаўрацыяй станковага алейнага і тэмпернага жывапісу. З 2008 г. аддзелам навукова-рэстаўрацыйных майстэрняў, дзе працуюць 18 спецыялістаў з вышэйшай, першай і другой катэгорыяй мастака-рэстаўратара, кіруе *Аркадзь Самуілавіч Шпунт.*

Супрацоўнікі аддзела прайшлі стажыроўку ў рэстаўрацыйных цэнтрах Расіі і Польшчы. Акрамя жывапісу займаюцца рэстаўрацыяй паліхромнай скульптуры, твораў мастацтва з тэкстылю, фарфору, скуры і графікі. Супрацоўнікі аддзела праводзяць тэхніка-тэхналагічныя і рэнтгеналагічныя даследаванні жывапісу, удзельнічаюць у экспертызах і атрыбуцыі твораў мастацтва.

У 1988 г. Дзяржаўны гістарычны музей БССР выдаў метадычныя рэкамендацыі па першапачатковай кансервацыі музейных прадметаў ва ўмовах музея на грамадскіх пачатках. У іх адзначалася, што рэстаўрацыяй і рэканструкцыяй могуць займацца толькі высокакваліфікаваныя спецыялісты пры наяўнасці добра абсталяваных майстэрняў.

Рэкамендацыі прапаноўваліся ў залежнасці ад матэрыялу, з якога зроблены музейны прадмет: вырабы з металу (асабліва манеты), дрэва, скуры, саломкі, тканіны і паперы. Асаблівая ўвага надавалася прадметам мяккай этнаграфіі (ручнікі, посцілкі, аддзенне і г. д.). Складальнікі рэкамендацый раілі выкарыстоўваць методыку Дзяржаўнага Эрмітажу (г. Ленінград).

У лістападзе 1999 г. у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Рэстаўрацыя і кансервацыя музейнай каштоўнасці: праблемы і метады іх вырашэння», дзе ўпершыню за гісторыю існавання беларускіх музеяў сабраліся беларускія рэстаўратары, якія звярнулі ўвагу на тое, што ў краіне адсутнічае падрыхтоўка рэстаўрацыйных кадраў. Да канферэнцыі адкрылі выставу «Другое

жыццё музейных каштоўнасцей». Удзельнікі канферэнцыі прынялі зварот да ўрада і грамадскасці Рэспублікі Беларусь, у якім прапанавалі стварыць у краіне Нацыянальны цэнтр па праблемах захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей, рэстаўрацыі і кансервацыі з навукова-даследчай лабараторыяй. У 2000 г. матэрыялы канферэнцыі былі надрукаваны [28].

У зборніку «Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва № 2» (2000) начальнік аддзела музеяў і выставак С. І. Маслоўскі паведамляў, што па стане на 1 студзеня 2000 г. у краіне існаваў 131 дзяржаўны музей з 54 філіяламі, у фондах якіх было 2,4 млн адзінак захоўвання. З іх патрабавалі рэстаўрацыі 125 555 музейных прадметаў асноўнага фонду.

За 1999 г. аднавілі 264 музейных прадмета, што складае 2,7 % ад агульнай колькасці. У краіне было 63 мастака-рэстаўратара па рухомых музейных каштоўнасцях, прычым з іх у Мінску – 49. У музеях Мінскай і Гомельскай абласцей не было зусім.

22 сакавіка 2000 г. стан і праблемы рэстаўрацыі прадметаў музейнага фонду разглядаліся на калегіі Міністэрства культуры, дзе прынялі рашэнне аб арганізацыі Рэспубліканскага рэстаўрацыйнага цэнтра. Прайшло больш за 20 гадоў з тых часоў, але сітуацыя да лепшага не змянілася.

На сённяшні дзень асноўны цэнтр музейнай рэстаўрацыі знаходзіцца, як і раней, у Нацыянальным мастацкім музеі. Група рэстаўратараў працуе ў музейным фондзе Нацыянальнага гістарычнага музея, але ў апошнія гады іх колькасць значна зменшылася.

Невялікі рэстаўрацыйны аддзел (5 чалавек) існуе ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Рэстаўратары аддзела займаюцца рэстаўрацыяй і кансервацыяй рухомых помнікаў, аглядаюць музейныя калекцыі з мэтай іх прафілактыкі і выяўлення прадметаў, якія патрабуюць рэстаўрацыі, і кантралююць стан помнікаў, што прайшлі рэстаўрацыйную дакументацыю. Супрацоўнікі музея распрацавалі методыку рэстаўрацыі прадметаў музейнай керамікі на аснове бутылметакрылата. Зараз музей супрацоўнічае з Інстытутам мікрабіялогіі НАН Беларусі ў сферы прафілактыкі ў змаганні з пашкоджаннямі музейных прадметаў цвіллю.

Са студзеня 1980 г. дзейнічае рэстаўрацыйная майстэрня ў Гродзенскім дзяржаўным музеі гісторыі рэлігіі. З 1982 г. тут актыўна працуе мастак-рэстаўратар *Уладзімір Нікадзімавіч Кіслы*. За час існавання майстэрні адноўлена больш за 800 музейных прадметаў. У музеі ёсць рэстаўрацыйны савет, які сочыць за станам захавання экспанатаў на экспазіцыі, адборам музейных прадметаў на рэстаўрацыю, зацвярджае методыкі рэстаўрацыі.

Усе аперацыі рэстаўрацыі дакументуюцца. Кожны прадмет мае рэстаўрацыйны пашпарт, дзе ёсць інфармацыя аб этапах рэстаўрацыйнага працэсу, уключаючы фотафіксацыю.

У музеі праводзіцца рэстаўрацыя абразоў, манет, медалёў, посуду, дробнай меднай пластыкі, кніг і помнікаў археалогіі. Асобная ўвага надаецца рэстаўрацыі абразоў (тэмперны і алейны жывапіс). На Першым музейным форуме «Музеі Беларусі» ў 2012 г. гродзенскі музей атрымаў дыплом за перамогу ў намінацыі «Лепшая работа рэстаўратара» за рэстаўрацыю партрэта XVII ст.

* * *

*У 2012 г. быў надрукаваны каталог беларускіх абразоў XVII–XIX стст., дзе ўпершыню былі прадстаўлены каштоўныя калекцыі з музейных фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, якія прайшлі рэстаўрацыю і раней не былі вядомыя шырокай публіцы.*

## ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ

1. Як змяніліся адносіны да розных катэгорый помнікаў гісторыі і культуры на тэрыторыі БССР пасля 1917 г.?
2. Раскажыце пра дзейнасць М. М. Шчакаціхіна і І. М. Хозерава.
3. Якія адносіны да гістарычнай спадчыны былі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў складзе польскай дзяржавы?
4. Якія змены да гістарычнай спадчыны на тэрыторыі Беларусі адбыліся ў 1943–1953 гг.?
5. Якія страты нашай гістарычнай спадчыне нанесла хваля ваяўнічага атэізму (1953–1965)?
6. Якія змены адбыліся ў адносінах да помнікаў гісторыі і культуры ў 1970–1990-х гг.?
7. Раскажыце пра стан беларускай рэстаўрацыі ў часы існавання незалежнай Беларусі.

# РАЗДЗЕЛ 3

# ЗАХАВАННЕ, КАНСЕРВАЦЫЯ І РЭСТАЎРАЦЫЯ МУЗЕЙНЫХ ПРАДМЕТАЎ

## 3.1. Захаванне і кансервацыя вырабаў з дрэва. Археалагічнае дрэва. Археалагічны музей у Бярэсці

Дрэва вельмі распаўсюджаны матэрыял для вытворчасці артэфактаў. Адна з галоўных задач музейнай практыкі – захаванне помнікаў драўлянага дойлідства. У першую чаргу гэта ахова іх ад вільгаці і знешняга ўздзеяння атмасферы. Для гэтага праводзілі хімічную апрацоўку і насычэнне драўніны рознымі сродкамі. У СССР выкарыстоўвалі прэпарат СД, які змяшчае ў сабе сульфат амонія і дыямонійфасфат. Яго ўжывалі ў рэстаўрацыйных майстэрнях, а таксама ў музеях. Асноўныя недахопы прэпарата: лёгкая вымывальнасць і гіграскапічнасць, з-за якой пры высокай вільготнасці (болей 70 %) апрацаваная драўніна ўвільгатняецца.

Выкарыстоўвалі і фторыстыя саставы. Практыка прымянення гэтых саставаў у Прыбалтыцы не выявіла істотных недахопаў. У Расіі ў музеі «Кіжы» ўжываўся прэпарат ББ (бура, борная кіслата). Гэты прэпарат добра пранікае ў матэрыял, драўніна не мяняе колеру і даволі добра абараняе ад агню. Прэпарат ПЗС забяспечвае ахову ад біялагічных шкоднікаў, аднак пажаранебяспечны і мае непрыемны фенольны пах. Падобны па якасцях прэпарат пентахлорфеналят натрыя (ПХФН), але ён мае нізкую пранікальную здольнасць. Найбольш распаўсюджаныя прэпараты – вадзяны біявогнезасцерагальны раствор ПББ-211 і ПБС. Іх асаблівасць у тым, што ў матэрыяле ўтвараецца двухслаёвая ахоўная абалонка.

Вялікую колькасць музейных прадметаў складаюць этнаграфічныя экспанаты, зробленыя з розных парод дрэва. Значную шкоду для іх ствараюць гніласныя бактэрыі, якія развіваюцца ўсюды, дзе ёсць дастатковая вільготнасць, вызначаная тэмпература, пажыўнае для іх асяроддзе і недахоп святла. Для таго каб спыніць працэс гніення, трэба стварыць адпаведны рэжым. Па-першае, мы павінны падтрымліваць звычайную вільготнасць, якая не перавышае ў такім клімаце, як наш, 70 %; лепш падтрымліваць меншую вільготнасць 60 і 50 %. Гэта затрымлівае развіццё бактэрыяльнага асяроддзя, калі не спыняе зусім. Па-другое, трэба мець напагатове тыя сродкі, якія б зрабілі матэрыял аб'ектаў непрыдатным для харчавання бактэрый ці забівалі б іх. Таму неабходна пры ўсякіх працах па замацаванні рэчаў уводзіць дэзінфектар, які робіць асяроддзе неспры-

яльным для развіцця бактэрый: раствор тымола ці раствор фенолу. Для таго, каб абясшкодзіць у вялікіх маштабах і забіць ужо існыя бактэрыі, ужываецца фармалін.

Можна сабраць у адзін пакой усе рэчы, якія з'яўляюцца падазронымі ў сэнсе заражанасці іх бактэрыямі, і правесці агульную дэзінфекцыю. На кожны метр кубатуры пакоя трэба ўзяць па 25 кубікаў раствору фармаліну ў канцэнтрацыі 40 %. Змясціўшы ў пакой рэчы па магчымасці так, каб яны не былі цесна складзены і даступны ўздзеянню бактэрыцыду, выпарваюць фармалінавы раствор, шчыльна зачыніўшы вокны і дзверы пакоя, прапускаюць у замочную шчыліну дзвярэй шкляную трубку, злучаную з колбай, у якой наліты фармалін. Колбу награваюць, і пара фармаліну пранікае ў пакой. Вытрымаўшы ў зачыненым стане пакой на працягу некалькіх сутак (2–3), адкрываюць яго і праветрываюць рэчы.

Што датычыцца цвілі, то барацьба з ёю ідзе першым чынам па лініі ўсталявання звычайнай вільготнасці. Чым менш вільготнасці, тым менш падстаў для развіцця цвілі. Трэба памятаць, што цвіль ва ўмовах вільготнасці 30–40 % не гіне, а толькі замірае і пры ўзнікненні вільготнасці звыш 70 % будзе размножвацца, бо яна здольная да анабіёзу, адраджэння. Цвіль пачынае развівацца пры стварэнні спрыяльных умоў, таму яе неабходна знішчыць. Такім сродкам з'яўляецца фармалін.

Вялікую шкоду музейным рэчам наносяць кузуркі самых розных відаў, пачынаючы ад амаль мікраскапічнай кніжнай вошы. Гэта маленькая белая кузурка, якая выядае ўсе крухмальныя рэчывы з паперы і можа так абгрызці любую акварэль, любы дакумент, што яны пачынаюць сыпацца. Шмат шкоды наносяць жукі-тачыльшчыкі і інш. Барацьба з кузуркамі вельмі цяжкая. Яны не любяць сухога рэжыму, але выдатна перажываюць 30–35 % вільготнасці, а ў клімаце вельмі сухім выпрацоўваюцца адмысловыя «засухаўстойлівыя» разнавіднасці гэтых шкоднікаў. Змагацца з імі паніжэннем ці павышэннем вільготнасці нельга, трэба прымяняць хімічныя, механічныя, фізічныя ці біялагічныя сродкі.

Часткова разбураную драўніну можна апрацаваць растворамі акрылавых палімераў (ПБМА, БМК-5, 40БМ, 80БМ і інш.) у ксілоле, талуоле, іх сумесях з этанолам, у ацэтоне або найніжэйшых эфірах. Гэтыя матэрыялы даюць добры эфект, прычым фізіка-механічныя паказчыкі мадыфікаванай драўніны павышаюцца пры павелічэнні колькасці ўведзенага ў яе палімера, але маюць нязначную глыбіню пранікнення. З ростам канцэнтрацыі палімераў у растворы, яго паглынанне драўнінай павышаецца.

Аптымальнымі з'яўляюцца 10–20 %-ныя растворы. Пры гэтых канцэнтрацыях клейкасць раствораў невялікая, таму можна ажыццявіць насычэнне і ўвесці ў драўніну 15–35 % палімера, што досыць для ўмацавання часткова разбуранай драўніны. Высокімі фізіка-механічнымі паказчыкамі характарызуецца часткова разбураная драўніна пасля глыбіннага насычэння крэмнійарганічнымі матэрыяламі.

Пры археалагічных раскопках знаходзяць драўляныя прадметы рознай ступені захаванасці. Таму з'явіўся новы кірунак у рэстаўрацыйнай практыцы – распрацоўка матэрыялаў і тэхналогій іх ужывання для захавання драўніны, якая доўгі час (стагоддзі, тысячагоддзі) знаходзілася ў вадзе або ў зямлі. Значны аб'ём археалагічных раскопак, з'яўленне падводнай археалогіі стымулююць развіццё гэтага кірунку.

Археалагічная драўніна ў залежнасці ад умоў яе залягання можа быць адносна сухой або «мокрай», што вызначае характар яе апрацоўкі.

Калі пасля вымання драўніна застаецца без дагляду, яна засыхае і разбураецца. Пры высыханні драўніна страчвае вільгаць, спачатку без змены формы і аб'ёму, а затым хутка засыхае, што прыводзіць да дэфармацыі і разбурэння яе паверхні. Ссыханне драўніны адбываецца па розных прычынах неаднолькава. Невялікая ўсадка – па тангенцыяльным кірунку (да 80 %), меншая – у радыяльным кірунку. Засохшую такім чынам драўніну нельга вярнуць у першапачатковы стан ніякімі сродкамі.

Археалагічная драўніна валодае паніжанай трываласцю і меншым супраціўленнем унутранага напружання пры высыханні. Такая драўніна ўтрымлівае вялікую колькасць вільгаці, таму існуе небяспека ўзнікнення розных вільготнасных узроўняў у масе драўніны, што ў сваю чаргу вядзе да з'яўлення ўнутраных напружанняў, а затым да дэфармацыі і шчылін. У выніку недахоп лігніна, які з'яўляецца асноўным кампанентам археалагічнай драўніны, вядзе да насычэння і ўсадкі драўніны пры змене вільгаці.

Пры апрацоўцы археалагічных прадметаў з дрэва, насычаных вадой, пры любым спосабе кансервацыі галоўнай мэтай з'яўляецца прадухіленне перасыхання і расколінак драўніны. Для гэтага археолагі здаўна карысталіся ў палявых умовах гіпсам, воскам, зрэдку жэлацінам. Гэтыя спосабы не даюць неабходнага эфекту, не заўсёды надзейныя, могуць скажаць колер і форму знаходак і не выконваюць асноўныя патрабаванні музейнай кансервацыі, таму не знайшлі шырокага ўжывання. Адным з першых спосабаў кансервацыі археалагічнай драўніны можна лічыць вонкавае пакрыццё паверхні прадметаў лакамі.

Выкарыстоўваюць і метад кансервацыі вільготнай драўніны шляхам вымарожвання ў вакууме. Масавы матэрыял можна абрабіць цыклічнай папераменнай апрацоўкай у розных ваннах – гарачай (з растворам цукру і іншымі дабаўкамі) і халоднай (з дабаўкамі феноласпіртоў). У залежнасці ад памераў і ступені разбурэння, 5–7-разавая апрацоўка забяспечвае павелічэнне трываласці, стабілізацыю форм і памераў з захаваннем натуральнага колеру, тэкстуры і фактуры матэрыялу. Закансерваваныя такім чынам фрагменты вырабаў лёгка склейваюцца і таніруюцца, не патрабуюць асаблівых рэжымаў захавання. У апошнія гады шырокае распаўсюджванне атрымала сушка дрэва на марозе.

Драўляныя вырабы ці рэшткі дрэва, знойдзеныя падчас раскопак, нельга адразу даставаць з культурнага слоя. Лепш памясціць іх у вільгот-

нае асяроддзе ці ў ваду. Потым у камеральных умовах праводзіцца сушка дрэва. Для гэтага выкарыстоўваюць спецыяльныя гіпсавыя формы, якія змяшчаюцца ў вільготным пілавінні. Высушанае дрэва пакрываецца лакам на аснове льнянога алею ці каніфолі. Аднак, нягледзячы на гэта, сушка матэрыялу працягваецца, да таго ж пакрытыя лакам вырабы блішчаць.

Таксама выкарыстоўваецца спосаб сушкі, калі адбываецца замена вады ў порах дрэва на спірт і ацэтон, пасля іх выціскаюць эфірам ці бензолам. У сваю чаргу іх замяняюць парафінам, воскам ці каніфоллю. Таксама прымяняецца спосаб замены вады спіртам, з паступовым яго выпарваннем і прапіткай дрэва растворам сталярнага клею, аднак гэты спосаб вельмі пажаранебяспечны.

Лепшым спосабам кансервацыі дрэва спецыялісты лічаць выкарыстанне прапіткі сінтэтычнымі матэрыяламі і смоламі.

> Пры выпрацоўцы метаду кансервацыі вылучаецца шэраг патрабаванняў: метад апрацоўкі павінен быць нетаксічным, пажарабяспечным, недарагім, забяспечыць захаванне формы, памераў, колеру і інш., павысіць біястойкасць матэрыялу, мець магчымасць рэстаўраваць фрагменты і каб пры неабходнасці можна было вывесці састаў з драўніны без страты для матэрыялу.

Беларускія навукоўцы ў 1970-х гг. на чале з прафесарам *Віктарам Яўграфавічам Віхровым* вынайшлі новы сродак для кансервацыі археалагічнай драўніны, прычым адносна хуткі і танны. Археалагічныя драўляныя знаходкі прапітваюць манамерам – растворам фенолспіртоў. Пад уздзеяннем высокай тэмпературы манамер ператвараецца ў пластмасу-палімер. Дрэва робіцца трывалым, не губляе фактуры і свайго натуральнага колеру.

Гэты спосаб выкарыстоўваўся пры кансервацыі драўляных вырабаў з раскопак Віцебска, Мінска і Слуцка. Пасля раскопак *Пятром Фёдаравічам Лысенкам* гарадзішча старажытнага Бярэсця дзякуючы гэтаму спосабу захавана частка гарадской забудовы XIII ст.: жылыя і гаспадарскія будынкі, вулічныя маставыя і частакол. Рэшткі драўляных пабудоў маюць захаванасць да 11–12 вянкоў. У асноўным гэта былі наземныя аднакамерныя збудаванні зрубавай канструкцыі памерамі 3,6 х 3,6 м. У пабудовах выяўлены дзвярныя і аконныя праёмы. Археалагічны музей «Бярэсце» дзейнічае з 2 сакавіка 1982 г.

## 3.2. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя керамічных вырабаў

Да керамікі (ад грэч. keramos – гліна) адносяць вырабы з прыроднай гліны і яе сумесяў з мінеральнымі і арганічнымі дамешкамі, абпаленыя да камнепадобнага стану. Паводле прызначэння кераміка падзяляецца на

посуд (сталовы, кухонны, тарны), будаўнічыя матэрыялы (цэгла, пліткі падлогі, дахоўка і кафля), мастацкія рэчы (дэкаратыўныя вазы, статуэткі, цацкі, барэльефы, медальёны, пахавальныя урны) і побытавыя (прасліцы, грузілы, свяцільнікі, ліцейныя формы і інш.). Па відах матэрыялу (гліны) – на звычайную, фарфорава-фаянсавую (з белай гліны – кааліну), тэракотавую (з чыстай гліны чырванаватага колеру).

Паводле спосабу вытворчасці кераміка падзяляецца на ляпную (выробленую рукамі) і ганчарную (зробленую на ганчарным коле). Па апрацоўцы паверхні керамічны посуд бывае гладкасценны, шурпаты, штрыхаваны, храпкаваты (абляпаны), тэкстыльны (з адбіткамі тканіны), глянцавы, паліраваны, паліваны (пакрыты палівай) і інш.

Кераміка розных часоў (ад эпохі неаліту да сучаснасці) займае больш за палову ад агульнай колькасці фондаў розных музеяў, асабліва краязнаўчых. Таксама кераміка адна з самых цікавых археалагічных знаходак. Трэба ўлічыць, што археалагічная кераміка вельмі крохкая і сустракаецца ў культурным пласце ў выглядзе шматлікіх фрагментаў. Цэлы посуд археолагі знаходзяць рэдка, у асноўным пры раскопках пахаванняў [6].

Выдаленне забруджванняў з паверхні керамічных вырабаў – этап, які папярэднічае іншым відам рэстаўрацыйных работ. Своечасовае, прафілактычнае выдаленне забруджванняў дазваляе прыпыніць разбуральныя працэсы ў матэрыяле, запавольваючы яго старэнне, і тым самым прадоўжыць жыццё вырабу.

Пад тэрмінам «выдаленне забруджванняў» з паверхні разумеюць яе прафілактычную апрацоўку, якая ўключае ў сябе працэсы прамыўкі і ачысткі.

Неабпаленая ці абпаленая пры нізкіх тэмпературах кераміка звычайна вызваляецца ад бруду механічным спосабам усухую. Адбываецца гэта пры выкарыстанні шчоткі, пэндзля, скальпеля, а ў асобных выпадках і прылады для пескаструменнай апрацоўкі. Пры адсутнасці магчымасці выкарыстання розных прылад для сухой чысткі ёсць іншыя спосабы, напрыклад, тампанаванне хлебным мякішам ці працірка ім паверхні керамікі.

Пескаструменная чыстка пры пэўных умовах з’яўляецца працэсам вельмі хуткім і адносна бяспечным для помніка. Прылады для пескавання маюць розныя раструбы, напрыклад з сячэннем ад 0,1 мм. Розныя і сродкі для пескавання – пясок, карунд, вокіс алюмінію ў выглядзе гіграскапічнага парашку, карбанат кальцыю, драбнюткія шкляныя шарыкі памерам у некалькі тысячных міліметра. У Інстытуце фізікі НАН Беларусі вядзецца распрацоўка метаду лазернай ачысткі археалагічнай керамікі, які мае пры пэўных абставінах шэраг пераваг перад іншымі метадамі, у тым ліку пескаструменным, асабліва эфектыўна прымяненне яго да светлаафарбаваных аб’ектаў (белаглінянай керамікі і да т. п.).

Перад пачаткам вільготнай чысткі кераміка з археалагічных ці этнаграфічных знаходак павінна быць даследавана на ўстойлівасць да вады. Гэта надзвычай важна, таму што шмат керамічных вырабаў дагістарычных і раннегістарычных часоў былі абпалены пры нізкіх тэмпературах. Вільготную чыстку можна рабіць толькі водаўстойлівых керамічных вырабаў. Перад гэтым яны павінны быць ачышчаны ў сухім выглядзе ад незамацаваных забруджванняў і прысохлай зямлі. Часцей для мыцця выкарыстоўваецца чыстая вада. Лепшыя вынікі дае замочванне керамікі ў цёплай вадзе, якая хутчэй растварае напластаванні. Пасля кароткага апалосквання ў праточнай вадзе аб'екты ачышчаюцца мяккай шчоткай. Аднак яна не павінна пакідаць ніякіх слядоў на паверхні ачышчаемых чарапкоў. У некаторых выпадках замест шчоткі выкарыстоўваецца мяккі пэндзаль.

У рэстаўрацыю часта трапляюць вырабы, якія раней былі склееныя, у асноўным невядомым клеем. У такім выпадку неабходна раздзяленне старых злучэнняў на фрагменты з мэтай выкарыстання лепшага сродку і больш дасканалай тэхнікі склейкі. Шмат старых клеяў пасля высыхання не ўдаецца растварыць, і ў найлепшым выпадку можна іх толькі размякчыць адпаведнымі растваральнікамі, аблягчаючы расклейку. Рэшткі клею часцей выдаляюцца механічна (часам маюць выгляд эластычнай плёнкі), часта размякчаюцца пад уплывам цёплай вады.

Перад пачаткам выдалення старых склеек керамічны прадмет неабходна на некаторы час змясціць у дыстыляваную ваду з мэтай насычэння чарапка, што перашкодзіць пранікненню ў глыбіню растваральніка. Вада (асабліва цёплая) размякчае і растварае шмат клеяў, таму што яны маюць тэрмапластычныя ўласцівасці. Для расклейкі старых клеявых злучэнняў выкарыстоўваецца чыстая вада ці з дадаткамі, напрыклад, дыхлорметану ці іншых арганічных растваральнікаў.

> Склейка з'яўляецца адным з часта ўжывальных рэстаўрацыйных прыёмаў, таму што кераміка крохкая і ломкая. Асноўнай праблемай пры склейцы з'яўляецца выбар падыходзячага клею і тэхнікі выканання. Ужытак пэўнага клею залежыць перш за ўсё ад якасці і стану керамічных чарапкоў. Адно з найважнейшых патрабаванняў да клеяў – іх высокая клейкасць (адгезія).

У апошні час назіраецца відавочны крок уперад у сферы выкарыстання клеяў. Яшчэ нядаўна ўжываліся шэлак, клей глютынавы (жывёльны) ці казеінавы, воскасмаляныя мастыкі. Вядома таксама выкарыстанне вапнава-казеінавых клеяў і клеяў на аснове вадкага шкла. Сярод шэрагу пераваг клеяў з сінтэтычных смол выдзяляюцца асабліва важнае моцнае сашчэпліванне з іншароднымі матэрыяламі і ўстойлівасць да ўздзеяння знешняга асяроддзя.

У вырашэнні праблемы ліквідацыі страт можна заўважыць дзве розныя пазіцыі. Першая рэкамендуе ўжываць для гэтага матэрыялы, выкарыстаныя ў аб'екце, другая аддае перавагу выкарыстанню сінтэтычных рэчы-

ваў – неўспрымальных да ўмоў навакольнага асяроддзя, устойлівых да старэння і г. д.

Частка рэстаўратараў аддае перавагу матэрыялам, якія адрозніваюцца ад арыгінальных фрагментаў (напрыклад, белы гіпс). Некаторыя спрабуюць падкрэсліць адметнасць ад аўтэнтыкі, выкарыстоўваючы розніцу ўзроўняў, а іншыя аднаўляюць страчаныя фрагменты так, каб іх цяжка было адрозніць ад арыгінальных. Структура паверхні павінна быць падобна да арыгінала настолькі, наколькі гэта магчыма. Адна з галоўных прымет добрай рэстаўрацыі – гэта нязменны выгляд аб’екта; змены дапускаюцца толькі тады, калі таго патрабуе канчатковае захаванне аб’екта, які без гэтага будзе страчаны.

Для рэтушы вырабаў непаліванай керамікі выкарыстоўваюцца акварэльныя фарбы і так званыя плакатныя, а таксама з дысперсіяй полівінілавага спірту.

Для каларыстычнага аднаўлення паліванай керамікі прыдатны алейныя фарбы, разбаўленыя шкіпінарам, а таксама на поліўрэтанавай, эпаксіднай ці акрылавай аснове. Для рэтушы часам ужываюцца спецыяльныя фарбы, прыдатныя для абпальвання на кераміцы. Запаўненне страт палівы найчасцей праводзіцца адпаведна падфарбаванай штучнай смалой, напрыклад, бясколерным лакам, які амаль не жоўкне, на аснове поліўрэтану [13].

Рэстаўрацыя керамічнай кафлі можа праводзіцца рознымі спосабамі з выкарыстаннем розных матэрыялаў. Пашыраны два спосабы рэстаўрацыі – гіпсам і керамічнай дробкай. Перад пачаткам працы на кожны прадмет заводзіцца пашпарт, куды запісваецца асноўная інфармацыя: памеры, матэрыял, характар забруджвання, захаванасць. Абавязкова праводзіцца фотафіксацыя.

Гіпс прасцей у выкарыстанні, чым керамічная дробка, таму ім лепш запаўняць значныя страты. Для падрыхтоўкі матэрыялу гіпс разводзіцца вадой з даданнем клею ПВА. Гіпс амаль адразу дубянее, таму працаваць трэба хутка. Адліваецца спачатку знешні бок, потым румпа. Пасля высыхання гіпс апрацоўваецца скальпелем, шліфавальнай машынкай, наждачкай. Калі гіпс канчаткова высах, знешні бок і румпа пакрываюцца фінішнай шпаклёўкай альбо тэмпернай фарбай з даданнем клею ПВА.

Наступным этапам з’яўляецца таніраванне ўзноўленых элементаў фарбамі (гуаш, акварэль, акрыл). Апошняя стадыя працы – гэта пакрыццё знешняга боку акрыл-фісташкавым лакам. Ён імітуе паліву на ўзноўленых участках і кансервуе паверхню. Адваротны бок пакрываецца растворам полівінілбутыраля. Варта адзначыць, што гіпс не вельмі трывалы і даўгавечны, таму варта прытрымлівацца ўмоў захавання і транспарціроўкі.

Адным з першых рэстаўратараў беларускай керамікі і ў першаю чаргу кафлі быў *Уладзімір Вікенцьевіч Угрыновіч*, вядомы мастак-кераміст, выдатны выкладчык і даследчык народнай беларускай керамікі. З 1969 г. ён працаваў на кафедры керамікі Беларускага тэатральна-мастацкага

інстытута. Доўгі час вывучаў івянецкую кераміку і засвоіў сакрэты мясцовых майстроў. Пачынаючы з 1977–1978 гг. У. В. Угрыновіч зацікавіўся археалагічнай керамікай і пачаў вывучаць і аднаўляць керамічны посуд, кафлю і іншыя керамічныя вырабы з раскопак Лідскага, Мірскага, Крэўскага і Гальшанскага замкаў, Лагойска, Мінска, Віцебска і іншых гарадоў і мястэчак Беларусі [9]. Рэстаўратар актыўна супрацоўнічаў з археолагамі М. А. Ткачовым, В. Е. Собалем і аўтарам дапаможніка [35].

У лютым 1993 г. у Беларускім універсітэце культуры створана кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на чале з Р. Ф. Шаурам. У 2001 г. у рамках спецыяльнасці «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» была адкрыта спецыялізацыя «рэстаўрацыя твораў ДПМ».

У 2001 г. у Нацыянальным мастацкім музеі зладжана выстава «Рэстаўрацыя і рэстаўратары», да каталогу якой быў прыкладзены даведнік са звесткамі пра ўсіх рэстаўратараў, што працавалі з музейнымі артэфактамі Беларусі на працягу 1950–2000 гг.

У 2005 г. пры Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі адкрыты Цэнтр прэвентыўнай кансервацыі і Школа музейных кансерватараў [41].

### 3.3. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў са скуры, косці, шкла і антрапалагічных калекцый

*Вырабы са скуры* можна падзяліць на этнаграфічныя (XIX–XX стст.) і археалагічныя, знойдзеныя падчас раскопак. Скураныя рэчы, якія не былі доўгі час у вадзе ці зямлі, звычайна добра захоўваюцца, асабліва калі ў фондах ці экспазіцыі падтрымліваюцца належная тэмпература і вільготнасць. Пры паступленні артэфакты павінны прайсці праз дэзінфекцыю, каб знішчыць цвіль і біялагічных шкоднікаў.

Іншая справа, калі вырабы са скуры знаходзіліся ў культурным пласце. Знойдзены выраб археолагі чысцяць ад бруду, а потым прамываюць у цёплай вадзе, куды дадаюць гліцэрыну і тымол. Гліцэрына надае рэчам эластычнасць, а тымол – антысептык, які засцерагае ад мікраарганізмаў. Потым апрацаваны выраб сушаць пры хатняй тэмпературы. Перад гэтым рэч разраўноўваюць і замацоўваюць шпількамі ці размяшчаюць паміж дзвюма роўнымі дошкамі, на якія кладуць груз. Каб захаваць эластычнасць скуры, пакуль яна не зусім прасохла, яе прамочваюць у некалькі прыёмаў рыцынай ці рыбіным тлушчам. Потым выраб прасушваюць да канца. Асобныя дэталі скуранога вырабу (напрыклад, абутак) зноў сшываюць па старых швах, а пры неабходнасці перакладваюць тканінай. Калі выраб знаходзіцца ў струхнелым стане, яго замацоўваюць 2 %-ным растворам полівінілбутыралю ў этылавым спірце.

Каб забяспечыць добры стан захавання *касцяных вырабаў*, трэба вытрымліваць умовы, уласцівыя для розных рэжымаў захоўвання музейных экспанатаў. Неабходная тэмпература пры паасобным захаванні рэчаў

з косці ці рогу – 14–15 °С пры вільготнасці 55–65 %. Недапушчальна ўздзеянне прамых сонечных прамянёў на ўсе віды матэрыялаў, у тым ліку на вырабы са скуры, косці і шкла. Для гэтых экспанатаў асвятленне музейных памяшканняў павінна знаходзіцца ў межах 50–75 лк*.

Пры асвятленні музейных памяшканняў пажадана выкарыстоўваць лямпы напальвання. Яны павінны знаходзіцца на такой адлегласці, каб не награваць паверхню музейнага экспаната. Калі касцяныя вырабы захоўваюцца разам з іншымі рэчамі, зробленымі з розных матэрыялаў, то ў сховішчах вільготнасць не павінна перавышаць 50–65 %. Музейныя рэчы з косці захоўваюцца ў зашклёных шафах, дзе няшмат пылу, а памяшканне, дзе стаяць шафы – светлае. Мініяцюры на слановай косці, што намаляваны акварэллю, захоўваюцца пад шклом у аправе ці акантоўцы, што пазбаўляе іх ад уздзеяння святла і абараняе фарбы. Касцяныя вырабы нельга пазбаўляць ад пылу вільготнымі анучамі. Пыл з мініяцюр выдаляе выключна мастак-рэстаўратар.

Звычайна касцяныя вырабы ў культурным пласце захоўваюцца добра, і іх дастаткова вымыць і прасушыць. Але часам яны могуць быць пакрытыя слоем вапны. Яе выдаляюць з дапамогай раствору салянай ці мурашынай кіслаты. Потым рэшткі кіслаты з паверхні вырабу выдаляюць 1 %-ным растворам соды. Калі рэч порыстая ці крохкая, яе замацоўваюць растворамі сінтэтычных смол: 2 %-ным растворам полівінілбутыралю, полівінілацэтатнай смалы ці 5 %-ным растворам клею БФ-4 у спірце. Калі нейкія дэталі ў прадмеце адсутнічаюць, іх замяняюць масцікай з воску і каніфолі ў прапорцыі 1:1. Да музейных экспанатаў таксама адносяцца антрапалагічныя калекцыі.

*Антрапалагічныя калекцыі* складаюцца з чалавечых костак, што знойдзены пры археалагічных даследаваннях, невялікіх збораў узораў валасоў, гіпсавых злепкаў чэрапаў, масак і г. д.

Чэрапы неабходна захоўваць у шафах на паліцах і пакрываць тканінай. Найбольш каштоўныя ў навуковых адносінах і крохкія чэрапы лепш захоўваць у асобных скрынях альбо глыбокіх латках накрытымі. Пры пераносцы чэрапы нельга трымаць за вачніцы і скулавыя дугі, каб не пашкодзіць іх. Косці шкілету трэба захоўваць асобна ў скрынях. Пад цэласны шкілет скрыня павінна быць памерамі: вышыня – 25 см, шырыня – 30, даўжыня – 53 см. Пры іншых памерах шкілету трэба рабіць асобную скрыню. Для шкілетаў, якія страцілі тыя ці іншыя часткі, робяцца скрыні з прорезамі ў сценах па тарцах, у якія ладзяцца фанерныя перагародкі. У такія скрыні кладуцца два шкілеты. Дробныя косткі ступняў і кісцяў лепш захоўваць у асобных скрынках на кожную канечнасць, каб не пераблытаць левыя і правыя канечнасці. Зборы валасоў прамываюцца эфірам і захоўваюцца ў шкляных прабірках, шчыльна закарканаых з ужываннем ваты.

---

* Лк – адзінка вымярэння асвятлення. Люкс (ад лац. lux – святло).

*Шкло* вядома чалавеку з даўніх часоў. Яно падзяляецца на прыроднае (вулканічнае) і штучнае. З'яўленне штучнага шкла даследчыкі звязваюць з ганчарствам, калі пры абпале глінянага вырабу на яго паверхню магла трапіць сумесь соды і пяску, што прывяло да ўзнікнення шклападобнай плёнкі-глазуры.

Як асобная галіна вытворчасці шкларобства з'явілася прыкладна ў сярэдзіне II тыс. да н. э. у Егіпце эпохі Новага Царства, у майстэрнях каля Фіваў – сталіцы дзяржавы. Ранні перыяд шкларобства датуецца 1500–750 гг. да н. э. З непразрыстага шкла рознага колеру выраблялі пацеркі, посуд, устаўкі ў пярсцёнкі і інш. Егіпецкія пацеркі даходзілі да Беларусі (тэрыторыя Гомельскай вобласці). Акрамя Егіпта шкло існавала і ў Месапатаміі.

Другі этап шкларобства гэта VIII–I стст. да н. э. Шкло выраблялі таксама ў Сірыі, Фінікіі і Кітаі. У часы элінізму і Старажытнага Рыма навучыліся выдуваць шкло з дапамогай трубкі і павышэння тэмпературы яго варкі. Шкло было вядома таксама на Каўказе, на Брытанскіх астравах і на тэрыторыі Заходняй Еўропы.

Трэці этап шкларобства – канец I тыс. да н. э. да IV ст. н. э. У гэты перыяд з'явіліся шкладуўная трубка і тэхніка дуцця, выраблялася вялікая колькасць рознага посуду, упрыгожванні і ваконнае шкло. Плямёны, што жылі на тэрыторыі Беларусі, шляхам гандлю і абмену мелі шкляныя пацеркі розных тыпаў.

Чацвёрты перыяд умоўна называецца паслярымскім. У гэты час развівалася шкларобства Візантыі, Егіпта, Сірыі, Франкскай дзяржавы, а затым Імперыі Карла Вялікага. На тэрыторыі Беларусі распаўсюджвалася візантыйскае і арабскае шкло, пра што сведчаць археалагічныя знаходкі XI–XII стст. У XII ст. шкло пачалі вырабляць у Полацку (шкляныя бранзалеты) і, магчыма, у некаторых іншых гарадах.

Пачынаючы з жалезнага веку на Беларусі вядомы вырабы з эмалі. Эмаль – гэта шклопадобная застылая маса, часам з дамешкам металаў, якая наносіцца на металічную ці керамічную аснову.

Паводле тэхнікі нанясення эмалі бываюць выемчатыя і перагародчатыя. Выемчатыя эмалі на тэрыторыі Беларусі вядомы з II да IV–V стст. н. э. Гэта ўпрыгожванні, фібулы, ланцужкі і інш. Тэхніка перагародчатай эмалі з'явілася ў Візантыі ў VI ст. Ва ўсходніх славян яна існавала з XI да XIII ст. і мела назву ў летапісях «финифть», ці «финифты». На Беларусі вядома каля 10 рэчаў, зробленых у такой тэхніцы, у тым ліку і славуты крыж Ефрасінні Полацкай.

З Візантыі трапіла на Беларусь у XI–XII стст. і смальта – кавалачкі каляровага глушанага шкла ў выглядзе маленькіх кубікаў ці пласцін для вырабу мазаікі. У Беларусі смальта знойдзена ў Полацку і Віцебску [36].

У XIV ст. на тэрыторыі Паўночнай Чэхіі (Багеміі) і ў Польшчы з'яўляюцца першыя гуты, а на тэрыторыі ВКЛ – з сярэдзіны XVI ст. Вырабы з беларускіх гутаў і іх фрагменты масава сустракаюцца ў культур-

ным пласце нашых гарадоў і мястэчак XVI–XVIII стст. Гэта шматлікі сталовы і тарны посуд, ваконнае шкло, пацеркі і інш. [6].

Археалагічныя знаходкі са шкла (пацеркі, посуд, эмалі, смальта) знаходзяць у розным стане захаванасці. Зрэдку сустракаюцца выдатна захаваныя ўзоры, але часам шкляныя рэчы рассыпаюцца пры спробе дастаць іх з зямлі.

Асноўныя віды разбурэння шкла ў зямлі:

– механічны, вынікам якога аказваецца большая ці меншая фрагментарнасць аб'ектаў;

– хімічны (глебавая карозія). Асноўным фактарам, які абумоўлівае разбурэнне шкла пры глебавай карозіі, з'яўляюцца грунтавыя воды; такое разбурэнне ўзмацняецца пад уздзеяннем раствораў шчолачы, кіслаты і солей, якія знаходзяцца ў глебе, а таксама розных мікраарганізмаў.

Глебавая карозія шкла мае дзве формы: паверхневую і скразную.

1. Паверхневае разбурэнне абмяжоўваецца толькі верхнімі пластамі рэчыва таўшчынёй ад 0,3 да 2 мм, унутраная ж частка шкла захоўваецца без змены. Пры каразійным разбурэнні са шкла вымываюцца шчолачныя кампаненты, таму для разбуранага пласта характэрна адсутнасць шчолачных кампанентаў або малое іх утрыманне і павышанае – крэменязёма. Акрамя таго, каразійны пласт – сітаваты, што прыводзіць да лёгкага доступу вады да паверхні шкла і далейшаму яго разбурэнню. У некаторых выпадках назіраецца раўнамернае пакрыццё ўсёй паверхні прадмета слаістай плёнкай у выглядзе перламутравых лускавінак, якія даволі лёгка адслойваюцца (ірызацыя). Колер плёнкі разнастайны: серабрысты, залаціста-карычневы, шэра-чорны. Паверхневая форма карозіі можа мець лакальны характар. Таўшчыня разбуранага пласта залежыць ад складу шкла. Так, вырабы са свінцовага шкла заўсёды пакрытыя тоўстым пластом карозіі, тады як у шчолачна-вапнавага шкла ён танчэйшы. Таўшчыня каразійнага пласта на археалагічным шкле залежыць таксама ад умоў, у якім яно знаходзілася: у кіслых глебах утвараюцца тонкія і шчыльныя скарынкі, у шчолачных – тоўстыя і рыхлыя.

2. Пры скразным разбурэнні страты нясе ўся таўшчыня шкла, бо адбываецца селектыўнае выманне некаторых элементаў і замест суцэльнага маналіта ўтвараецца рэчыва, якое складаецца быццам бы са спрасаванага парашку, яно крышыцца і рассыпаецца пры лёгкім націсканні. Матэрыял губляе першапачатковую механічную трываласць настолькі, што пры спробе выняць прадмет з зямлі ён рассыпаецца. Часам нават простым вокам можна ўбачыць масу расколін, якія працінаюць шкло ў розных кірунках. У асобных месцах можа захоўвацца празрыстасць, але часцей за ўсё шкло становіцца паўпрасвечвальным, мутным, з матавай або бліскучай паверхняй.

Розная ступень захаванасці археалагічнага шкла бывае і ў аб'ектаў, якія знаходзіліся ў аднолькавых умовах. Гэта звязана са складам шкла: чым больш у шкле шчолачаў (звыш 17 %), тым горш яно захоўваецца ў зямлі.

Захаванасць шкляных аб'ектаў залежыць ад умоў месцазнаходжання: у шчолачных глебах шкло руйнуецца больш, чым у кіслых, а ў вапнавых – больш, чым у шчолачных.

Па ступені захаванасці археалагічнае шкло можна ўмоўна падзяліць на наступныя групы:

1) шкло, не закранутае працэсам карозіі; прадмет цэлы або фрагментаваны;

2) шкло з паверхневай формай карозіі; прадмет цэлы або фрагментаваны;

3) шкло, наскрозь пашкоджанае карозіяй, вынікам чаго з'яўляецца далікатнасць прадмета, які рассыпаецца пры спробе выняць яго з зямлі. У вільготным грунце колер шкла добра бачны, але па меры высыхання інтэнсіўны колер знікае і аб'ект становіцца бялявым. Гэта тлумачыцца тым, што мокры паверхневы каразійны пласт захоўвае аптычную аднастайнасць, якая па меры высыхання парушаецца.

Асноўныя патрабаванні да матэрыялаў, якія прымяняюцца для ўмацавання археалагічнага шкла:

– матэрыял павінен добра склейваць разбуранае шкло, якое часта ўяўляе сабою як бы мазаіку з кавалачкаў рознага памеру (ад пясчынкі да вельмі буйных аскепкаў);

– умацавальны састаў павінен аднолькава дзейнічаць як у сухім, так і ў вільготным асяроддзі; водныя растворы для замацавання ў палявых умовах ужываць нерацыянальна, бо плёнкі іх недастаткова вільгацетрывалыя, у вільготным клімаце яны доўга сохнуць, і працэс умацавання зацягваецца. Больш тэхналагічныя – спіртавыя растворы супалімераў з выдатнай пранікальнай здольнасцю, эфектыўныя і ў сухім, і ў вільготным асяроддзі;

– у палявых умовах пераважае сталае ўмацаванне археалагічнага шкла, якое выключае неабходнасць выдалення часовага кансерванту пры лабараторнай апрацоўцы. Для ўмацавання дэструктаванага шкла забараняецца ўжываць воскападобныя рэчывы. У якасці ўмацавальных саставаў прапануюцца сінтэтычныя матэрыялы, напрыклад клей «Цыякрын».

Упрыгожванні з эмаллю варта берагчы ад уздзеяння прамых сонечных промняў, а таксама перападаў тэмператур. Эмалевае пакрыццё можа паблякнуць і патрэскацца. Нельга дапускаць кантакту эмалі з любымі мыйнымі сродкамі, парашкамі, кіслотамі, шчолачамі і хлорам. Пашкоджанне эмалі можа адбыцца і ад узаемадзеяння з марской вадой.

Вырабы з эмаллю варта мыць у халаднаватай вадзе, з даданнем невялікай колькасці нашатырнага спірту. Чысціць эмаль можна мяккай шчотачкай і зубным парашком, пасля чаго прамыць у чыстай вадзе і працерці мяккай тканінай. Эмалевыя ўпрыгожванні рэкамендуецца захоўваць асобна, каб іх паверхня не датыкалася да іншых вырабаў, нават і каштоўных.

## 3.4. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з металу

*Рэстаўрацыя металу* – гэта комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на захаванне, папярэджанне разбурэнняў вырабаў з металаў і сплаваў, што маюць гістарычную і мастацкую каштоўнасць. Паколькі існуюць розныя вырабы з самых розных металаў і сплаваў, праца з імі патрабуе ад рэстаўратараў спецыяльных ведаў і працоўнай практыкі. Рэстаўратар мае справу з рознымі хімічнымі і таксічнымі рэчамі, таму існуюць агульныя правілы бяспекі.

1. Праца, звязаная з ужываннем шкодных для чалавека рэчываў, асабліва кіслот і шчолачаў, павінна адбывацца ў спецыяльным пакоі з вентыляцыяй і выцяжкай. Вентыляцыю ўключаюць за 20–30 хвілін да пачатку працы і выключаюць праз 20–30 хвілін пасля яе спынення.

2. Падчас механічнай і хімічнай ачысткі металаў неабходна ўжываць рэспіратары розных тыпаў і спецыяльныя ахоўныя акуляры.

3. Механічную працу з археалагічнымі знаходкамі з бронзы і свінцовымі сплавамі трэба рабіць толькі пры дзейнасці выцяжкі.

4. Калі рэстаўратар працуе з рознымі кіслотамі і растваральнікамі, ён павінен абараняць скуру рук пры дапамозе гумавых пальчатак, або карыстацца спецыяльнымі пастамі ці мазямі.

5. Хімічныя рэактывы трэба захоўваць у спецыяльным месцы, у зачыненых слоіках, шкляным ці іншым начынні.

6. Каб не атруціцца, у пакоях, дзе ідуць рэстаўрацыйныя работы, нельга есці і трымаць ежу [13; 40].

Усе вырабы з металу, за выключэннем золата і плаціны, у той ці іншай ступені падпадаюць пад уздзеянне карозіі. Карозіяй называецца разбурэнне металу, выклiканае ўздзеяннем навакольнага асяроддзя. Разбурэнне звычайна пачынаецца з паверхні металу і паступова распаўсюджваецца ўглыб. Пры гэтым метал мяняе выгляд: губляе бляск, гладкая паверхня становіцца шурпатай і пакрываецца хімічнымі злучэннямі, звычайна з металу і кіслароду, з металу і хлору і г. д.

Характар і хуткасць з’яўлення карозіі залежаць ад складу (сплаву) металу і фізічна-хімічных умоў асяроддзя. Гэты працэс можа працягвацца і ў музейных умовах. Захоўванне металічных вырабаў рэкамендуецца ў памяшканнях без рэзкіх ваганняў тэмпературы пры 15–25 °С і адноснай вільготнасці паветра да 65 %. Пры захоўванні металічных вырабаў варта выконваць пэўныя правілы: у адным памяшканні нельга захоўваць металічныя тавары і тавары бытавой хіміі. Кіслоты пры выпарэнні могуць выклікаць карозію металаў. Рэкамендуецца пазбягаць працяглага ўздзеяння прамых сонечных прамянёў на паверхню і эмаль вырабаў.

Дрэнна захоўваюцца алавяныя і алавяна-свінцовыя вырабы. Чыста алавяныя рэчы, якія знойдзены ў зямлі, практычна не падлягаюць рэстаўрацыі, таму што могуць быць пашкоджаны так званай алавянай чумой, якая

выклікаецца рознымі кіслотамі, павышанай вільгаццю і нізкай тэмпературай, і праз некаторы час ператвараюцца ў парашок.

Знаходкі з волава трэба адразу ачысціць механічна з дапамогай скальпеля і шчоткі і зафіксаваць (сфатаграфаваць і замаляваць). Крыху лепш захоўваюцца алавяна-свінцовыя прадметы. Яны пакрыты белым налётам, які можна зняць толькі хімічным шляхам.

Лепш за ўсё захоўваюцца вырабы з золата. Яны не падпадаюць пад дзеянне карозіі, іх можна адмыць у цёплай вадзе, абястлушчыць і прасушыць.

Дробныя жалезныя вырабы ў музейнай практыцы ў асноўным ачышчаюць пры дапамозе слабага раствору салянай кіслаты да поўнай ліквідацыі вокіслаў, пасля чаго добра адмываюць і падвяргаюць кансервацыі. Перш чым пачаць кансервацыю вырабаў з жалеза, неабходна ўлічыць захаванасць металічнага ядра. Па гэтым крытэрыі прадметы падзяляюць на 3 групы:

1) прадметы, пашкоджаныя карозіяй, без металічнай асновы, са скажонай формай і павялічаным першапачатковым аб'ёмам;

2) прадметы, у якіх паверхня пашкоджана іржой, але захавалася ядро, што таксама скажае форму і аб'ём прадметаў;

3) форма і аб'ём захаваліся, але ёсць тонкі слой карозіі.

Нават ачышчаныя ад карозіі і забруджванняў прадметы працягваюць разбурацца ў памяшканнях з нерэгулюемым тэмпературным рэжымам. Пры так званай крытычнай вільготнасці вільгаць з паветра кандэнсуецца на паверхні металу, утвараючы суцэльную плёнку, што і з'яўляецца галоўнай прычынай карозіі. Перад кансервацыяй вырабы з жалеза і каляровых металаў прасушваюцца ў ацэтоне або спірце 30–60 хвілін.

***Нумізматычныя калекцыі і іх захаванне.*** Старажытныя манеты са срэбных і медных сплаваў, выяўленыя ў скарбах або падчас археалагічных раскопак, часцей за ўсё паступаюць у рэстаўрацыйную майстэрню моцна каразіраваныя, а часам і цалкам мінералізаваныя. Манеты са сплаву срэбра з меддзю часта пакрытыя прадуктамі карозіі медзі. Часам срэбра пад уздзеяннем хлорыстых соляў ператвараецца ў шэра-фіялетавы хларыд – рагавое срэбра. На паветры медныя сплавы цямнеюць ад акіслення, а срэбра – у выніку ўтварэння сульфіду.

> Рэстаўратар павінен з вялікай асцярогай ставіцца да аднаўлення нумізматычных помнікаў. У прыватнасці, трэба зрабіць правільны выбар рэактыву, неабходнага для ачысткі ад карозіі. Рэактыў, прыдатны для адных манет, можа аказацца непрыдатным для іншых: прывядзе да знішчэння або сур'ёзнага скажэння выгляду.

Пажадана імкнуцца да захавання «высакароднай паціны» – своеасаблівага атэстата старажытных прадметаў. Прыступаючы да чысткі манет, варта перш за ўсё высветліць, з якога металу яны зроблены; ці маецца ў іх металічнае ядро, у якой меры яно захавалася; якімі солямі пакрытыя манеты.

Асноўнымі *спосабамі расчысткі манет* з'яўляюцца *механічны, хімічны і электрахімічны.* Пры рэстаўрацыі практыкуецца часцей за ўсё спалучэнне механічнага спосабу з іншымі. Механічная апрацоўка заключаецца ў выдаленні паверхневых напластаванняў: зямлі, пяску і асобных праяў карозіі. Яна робіцца з дапамогай розных шчотачак (са шчаціннем, латуневай і са шклянога валакна), скальпеля і зубалячэбных прылад розных памераў, але выкарыстоўваць згаданыя інструменты неабходна з асцярогай. Пры няўмелым і грубым выкарыстанні імі лёгка нанесці драпіны, якія могуць сапсаваць надпіс, малюнкі і да т. п.

Хімічным спосабам у спалучэнні з механічным ачышчаюцца манеты, пакрытыя тоўстым слоем прадуктаў карозіі, але якія захавалі металічную аснову, а таксама манеты з золата і срэбра. Каб выдаліць з медных манет вішнёва-чырвоны налёт закісу медзі, варта апусціць іх у 5–15 %-ны раствор аміяку, каб яны цалкам апусціліся ў раствор, бо пры ўзаемадзеянні з паветрам уплыў аміяку на метал аказваецца разбуральным. Рэстаўратару часта даводзіцца мець справу з манетамі цалкам мінералізаванымі, якія не заўсёды атрымоўваецца не толькі раскрыць, але і захаваць. Поспех апрацоўкі ў вялікай ступені залежыць ад таго, якія сплавы медзі замянілі метал у выніку складаных працэсаў мінералізацыі. Спачатку варта асцярожна, без фізічнага напружання, выдаліць паверхневыя напластаванні. Калі такім чынам атрымоўваецца выявіць той ці іншы арнамент, надпіс і да т. п., то гэтым варта абмежавацца. Калі механічная апрацоўка «не раскрыла» манету, ужываюць 5 %-ны раствор едкага натрыю ці вуглякіслага амонію. Пасля ачысткі манет тым ці іншым спосабам варта рабіць актыўную прамыўку («выварванне») іх у некалькіх зменах кіпячай дыстыляванай вады. Услед за прамываннем робіцца прасушка манет у ацэтоне, затым у спірце на працягу 30–60 хвілін.

Самы просты метад чысткі прымяняецца да залатых і плацінавых манет, які зводзіцца ў асноўным да прафілактычнай чысткі, г. зн. да выдалення тлушчавых рэчываў і бруду, якія ўтварыліся ў выніку доўгага знаходжання ў зямлі. Выдаляюцца тлушчавыя рэчывы з дапамогай медыцынскай ваты, намочанай ацэтонам або спіртам. Пасля прасушкі манеты неабходна закансерваваць, пакрыўшы ахоўным слоем – парафінам ці сінтэтычнымі смоламі. Для гэтага можна выкарыстоўваць 5 %-ныя растворы полібутылметакрылата ў ацэтоне, талуол або ксілолы і полівінілбутыралю ў спірце або сумесі спірту з бензолам у прапорцыі 1:1.

Пасля кансервацыі неабходна захоўваць манеты ў асобных скрыначках або латках, якія маюць адсекі. У такім выглядзе яны не будуць датыкацца і лепш захаваюць ахоўнае пакрыццё. Акрамя таго, пры аглядзе рэстаўраваных манет будзе лягчэй выявіць тыя з іх, на якіх ізноў з'явіліся ачагі карозіі.

Неабходна памятаць, што методыку, якая падыходзіць пры ачыстцы вялікіх прадметаў (сякера, лямеш, каса, шабля і г. д.), нельга ўжываць да дробных, у першую чаргу з-за памеру і матэрыялу, з якіх яны выраблены.

Пасля фіксавання месца і часу знаходкі прадмета вызначаецца метал, з якога ён выраблены, і яго стан на момант паступлення на рэстаўрацыю. Гэта дазваляе вызначыць спосаб ачысткі і кансервацыі. Калі прадмет пакрыты коркам (соль, вокіслы, гразь і іншыя наслаенні), то яго трэба апусціць у цёплую ваду, у якой прадмет адмываецца. Дробныя вырабы могуць быць з розных металаў – жалеза, медзь, бронза, волава, свінец, срэбра або золата. Яны па-рознаму захоўваюцца, і таму выкарыстоўваюцца розныя методыкі ачысткі і кансервацыі. Сярод знаходак больш за ўсё распаўсюджаны дробныя вырабы з жалеза (пярсцёнкі, бранзалеты, шыйныя грыўні, шпількі, падвескі, наканечнікі стрэл і г. д.), бронзы і медзі (розныя ўпрыгожанні, дробныя прылады працы, манеты і метралагічныя вырабы), срэбра (упрыгожанні, манеты і медалі), свінца і свінцова-алавяных сплаваў (некаторыя тыпы ўпрыгожанняў і дапаможныя прылады для працы ювеліраў). Даволі рэдка сустракаюцца прадметы з волава.

Дзеля папярэджання карозіі металу прадметы пакрываюць ахоўнымі саставамі на арганічнай аснове. Выкарыстоўваюць: алеі, змазкі і інш., якія ўтвараюць плёнку на паверхні. Выбар кансервацыйнага матэрыялу залежыць ад стану паверхні металу, умоў захавання, а таксама эстэтычных патрабаванняў.

Асноўным матэрыялам для захоўвання металічных рэчаў раней былі пластычныя змазкі (вазелін, пушачная, ПВХ), якія ахоўвалі метал ад карозіі толькі пры нанясенні іх тоўстым слоем. Пасля кансервацыі металічных прадметаў на іх наносяць тонкі слой змазкі, які забяспечвае ахову металу на тэрмін не больш за адзін год.

Шырока выкарыстоўваюць прыродны і сінтэтычны воск: пчаліны воск, парафін, цэрэзін і інш.

У музеі і прыватныя калекцыі часта паступаюць знойдзеныя выпадкова або ў выніку археалагічных раскопак дробныя рэчы: манеты, медалі, упрыгожанні, гузікі і іншыя вырабы. Калі большасць жалезных вырабаў – сякеры, сярпы, косы, нажы, розная зброя, у тым ліку і састаўная (панцыры і кірасы, мячы і шаблі, ружжы і пісталеты), і некаторыя прадметы з каляровых металаў можна ачысціць механічна, то дробныя экспанаты, якія паступаюць у дрэнным стане, патрабуюць чысткі, адмыўкі, рэстаўрацыі і кансервацыі.

* * *

*Чыстка і кансервацыя дробных вырабаў, асабліва ўпрыгожанняў, манет, медалёў, сфрагістычнага (актавыя пячаткі і гандлёвыя пломбы) і метралагічнага (вагі і гіркі-разнавагі) матэрыялу, мае важнае значэнне для даследаванняў (класіфікацыі і датавання вырабаў) і спосабу музейнага захавання.*

### 3.5. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя твораў выяўленчага мастацтва (жывапіс, скульптура, графіка)

Спецыялісты разглядаюць жывапіс як помнік мастацтва з дзвюх кропак гледжання – эстэтычнай і матэрыяльнай.

Кожны твор жывапісу пад уплывам святла, паветра, тэмпературы, вільгаці, уздзеяннем біяразбурэння паступова знішчаецца і патрабуе спецыяльных ахоўных мер захавання, кансервацыі і рэстаўрацыі. Жывапісны твор складаецца з паслядоўных этапаў яго стварэння: грунтоўка, фарбаваная і пакрыўная працы.

Некаторыя складаныя жывапісныя кампазіцыі маюць да 10 і болей розных слаёў іх стварэння, якія складаюцца як з арганічных, так і з мінеральных кампанентаў. Рэстаўратары і захавальнікі твораў жывапісу вылучаюць розныя тыпы іх вонкавага парушэння, такія як складкі, адслаенне, уздуццё і інш.

У працэсе рэстаўрацыі спецыяліст выконвае наступныя працэдуры: ачыстка ад забруджванняў ці позніх запісаў, замацаванне фарбавальнага пласта шляхам насычэння твора living рознымі матэрыяламі і таніроўка страт як апошні этап рэстаўрацыі. Таму кожны рэстаўратар вырашае, якую аперацыю ў выніку рабіць: лакальнае замацаванне ў месцах фактычнага разбурэння жывапіснай паверхні ці татальнае ўмацаванне паверхні музейнага прадмета. Звычайна татальнае замацаванне робіцца ў выпадку, калі ўвесь твор знаходзіцца ў аварыйным стане.

Перад абраннем методыкі рэстаўрацыі неабходна правесці комплексны аналіз існуючых прыёмаў даследавання з ужываннем розных прыродна-навуковых метадаў [20].

Асобную частку жывапісу складае сценапіс, роспіс фасадаў і інтэр’ераў будынкаў. У першую чаргу гэта фрэска: афрэска – роспіс па свежай (вільготнай) тынкоўцы, альсэка – роспіс па сухой тынкоўцы і казеінававапнавы жывапіс.

Найстаражытнейшыя фрэскі на Беларусі адносяцца да XI ст. (роспіс Полацкага Сафійскага сабора).

Першыя мясцовыя рэстаўратары музейных прадметаў мастацкага жывапісу (абразоў, скульптуры і графікі) працавалі ў музеях Мінска, Полацка, Віцебска і Гродна. У 2012 г. быў выдадзены каталог «Абразы XVII–XIX стст.», у якім даецца апісанне 14 твораў старажытнабеларускага іканапісу XVIII–XIX стст. з экспазіцыі мастацкай галерэі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і 12 твораў XVII–XIX стст. з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь [2].

Доўгі час рэстаўратараў фрэскавага роспісу на Беларусі не было. У 1929 г. у Полацку працавала экспедыцыя Маскоўскіх навукова-рэстаўрацыйных майстэрняў на чале з *Ігарам Эмануілавічам Грабарам*. Яны зрабілі невялікія расчысткі фрэсак XII ст. у Спаскай царкве Ефрасіннеўскага манастыра. Спецыялісты з Масквы прыязджалі ў Полацк у 1937, 1939, 1949, 1950 і 1972 гг. Рэстаўратары раскрылі 8 фрагментаў фрэсак – 5 у цэнтральнай частцы і 3 у алтары храма.

У 1969 г. з'явіліся свае мастакі-рэстаўратары ў складзе Спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў (СНРВМ) Міністэрства культуры БССР. Сярод іх былі мастакі па рэстаўрацыі абразоў, фрэсак, скульптуры, станковага жывапісу і металу. Так, у 1982 і 1984 гг. рэстаўратары СНРВМ пад кіраўніцтвам *Віктара Лукашэвіча* праводзілі расчыстку фрэсак XI ст., пакрытых вапнавай пабелкай у інтэр'ерах Полацкай Сафіі. Зробленыя імі зандажы выявілі больш за 50 фрагментаў фрэсак XI ст. у розных месцах сабора. Самыя значныя з іх знаходзіліся ў цэнтральнай апсідзе. З 1992 г. па 2006 г. рэстаўрацыяй фрэсак XII ст. Спаса-Праабражэнскага храма займаўся беларускі рэстаўратар *Уладзімір Васільевіч Ракіцкі*. У 2006 г. сюды былі запрошаны спецыялісты з Расіі на чале з *Уладзімірам Дзмітрыевічам Сараб'янавым*.

У другой палове XIX ст. інтэр'еры Спаскай царквы XII ст. распісалі алейнымі фарбамі, якія закрылі фрэскі XII ст. У. Ракіцкі распрацаваў методыку пераносу позняга жывапісу XIX ст. на спецыяльныя стэнды, якая дазволіла захаваць яго як музейны экспанат. Пачынаючы з 2010 г. працу па рэстаўрацыі фрэсак полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы працягвае *Юры Іванавіч Маліноўскі*.

У. Ракіцкі і Ю. Маліноўскі 47 гадоў назад выратавалі тры фрэскі XVIII ст. з руінаў каталіцкага кляштара ў Бялынічах. Фрэскі былі зняты са сцен кармяліцкага кляштара, які ўлады горада вырашылі знішчыць у 1978 г. Рэстаўратары паспелі зняць фрэскі разам з тынкоўкай з цагляных сцен будынка. Зараз яны ўпрыгожваюць музейную экспазіцыю.

Выбітным мастаком-рэстаўратарам абразоў і паліхромнай скульптуры быў *Пётр Рыгоравіч Журбей* – адзіны з лепшых спецыялістаў у СССР па аднаўленні драўлянай скульптуры. Менавіта яго Усесаюзны інстытут рэстаўрацыі адправіў рэстаўраваць старажытную паліхромную скульптуру ў Нікарагуа, дзе ён паказаў сябе прафесіяналам. П. Журбей таксама правёў рэстаўрацыю ўнікальнай іконы Маці Божай – галоўнай святыні мінскага кафедральнага Свята-Духава сабора.

Варта адзначыць і дзейнасць *Андрэя Андрэевіча Крапіўкі*, які ўжо некалькі дзесяцігоддзяў займаецца рэстаўрацыяй старадрукаваных кніг. Ён аднавіў шмат унікальных экзэмпляраў, у тым ліку і кнігі Францыска Скарыны, Евангелле 1600 г. з друкарні братоў Мамонічаў у Вільні. Іх можна ўбачыць у музейных экспазіцыях, у першую чаргу ў музеі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

* * *

*На сучасным этапе рэстаўрацыйныя майстэрні Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь арганізоўваюць экскурсіі для ўсіх жадаючых і прапануюць пазнаёміцца з рэстаўрацыяй алейнага жывапісу, старажытнабеларускага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і графікі.*

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ**

1. Як трэба захоўваць «этнаграфічнае» дрэва ад біялагічных шкоднікаў?
2. Як захоўваецца «археалагічнае» дрэва, насычанае вадой?
3. Раскажыце, што вы ведаеце пра Археалагічны музей «Бярэсце»?
4. Як праводзіцца вільготная чыстка археалагічнай і этнаграфічнай керамікі?
5. Пералічыце асноўныя спосабы рэстаўрацыі керамічнай кафлі.
6. Ахарактарызуйце асноўныя метады кансервацыі «археалагічнай» скуры.
7. Што такое карозія металу?
8. Назавіце імёны беларускіх рэстаўратараў твораў выяўленчага мастацтва.

## Заключэнне

Навукова-практычная вартасць матэрыялу, змешчанага ў дапаможніку, вызначаецца неабходнасцю пашырэння тэарэтычных ведаў і набыцця практычных навыкаў спецыялістамі музейнай сферы, асабліва тымі, хто працуе ў музейных фондах, а таксама экскурсаводамі.

Авалоданне тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку дазваляе падрыхтаваць спецыяліста не толькі ў галіне музейнай справы, але і ў справе аховы гісторыка-культурнай спадчыны. У працэсе знаёмства з дапаможнікам студэнты і магістранты могуць набыць веды па гісторыі еўрапейскай рэстаўрацыі, а таксама па гісторыі ўзнікнення і развіцця рэстаўрацыйнай справы на тэрыторыі Беларусі і сумежных краін. Студэнт павінен добра арыентавацца ў відах і парадку правядзення работ па кансервацыі і рэстаўрацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, ведаць прававыя паўнамоцтвы навуковага кіраўніка ў арганізацыі і правядзенні навуковых праектных і вытворчых работ на аб'екце рэстаўрацыі.

Адзначаючы важнасць курса «Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей», трэба ўзгадаць няпоўную забяспечанасць літаратурай і навукова-метадычнымі матэрыяламі ў вызначанай галіне. З мэтай паляпшэння дадзенай сітуацыі створаны дадзены вучэбны дапаможнік.

## Спіс нарматыўных прававых актаў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : 20 ліпеня 2016 г., № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрвеня 2016 г. : са змян. і дап. ад 1 студзеня 2023 г. № 201-З // ЭТАЛОН : інфарм.-пошукавая сістэма (дата звароту: 04.06.2025).

Кодекс Республики Беларусь об архитектурной, градостроительной и строительной деятельности : 17 июля 2023 г., № 289-З : принят Палатой представителей 28 июня 2023 г. : одобр. Советом Респ. 30 июня 2023 г. // ЭТАЛОН : информ.-поисковая система (дата обращения: 04.06.2025).

Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь : Закон Рэсп. Беларусь ад 9 студзеня 2006 г., № 98-З // ЭТАЛОН : інфарм.-пошукавая сістэма (дата звароту: 04.06.2025). – Страціў сілу Кодэксам Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2016 г. № 413-З.

О модельном законе «Об объектах культурного наследия» : постановление Межпарламентской Ассамблеи государств – участников СНГ, 13 июня 2000 г., № 15-12 // ЭТАЛОН : информ.-поисковая система (дата обращения: 04.06.2025).

О новой редакции модельного Закона «Об объектах культурного наследия» : постановление Межпарламентской Ассамблеи государств – участников СНГ, 17 мая 2012 г., № 37-14 // ЭТАЛОН : информ.-поисковая система (дата обращения: 04.06.2025).

Международная конвенция об охране нематериального культурного наследия : основ. тексты / Орг. Объед. Наций по вопр. образования, науки и культуры. – Париж : ЮНЕСКО, 2011. – VII, 103 с.

Аб некаторых пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны : Указ Прэзідэнта Рэсп. Беларусь ад 18 кастрычніка 2007 г. № 527 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2007. – № 252. – 1/9038.

Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021–2025 годы : утв. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь, 29 января 2021 г., № 53 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22100053 (дата обращения: 04.06.2025).

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. – URL: http://gosspisok.gov.by/?AspxAutoDetectCookieSupport=1 (дата обращения: 04.06.2025).

## Спіс выкарыстаных крыніц

*1.* Аб змяненні законаў па пытаннях культуры : Закон Рэсп. Беларусь ад 21 ліпеня 2022 г., №201-3 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12200201 (дата звароту: 06.06.2025).

*2.* Абразы XVII–XIX стст. са збораў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка : каталог / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Нац. мастац. музей Рэсп. Беларусь, Нац. Полац. гіст.-культ. музей-запаведнік. – Мінск : Рыфтур, 2012. – 47 с.

*3. Алексеев, Л. В.* Археология и краеведение Беларуси XVI – 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев. – Минск : Беларус. навука, 1996. – 206 с.

*4. Алексеев, Ю. В.* Объекты культурного наследия : учебник в 2 т. / Ю. В. Алексеев, Г. Ю. Сомов. – Москва : Проспект, 2017. – Т. 1. – 327 с.

*5. Алексеев, Ю. В.* Объекты культурного наследия : учебник в 2 т. / Ю. В. Алексеев, Г. Ю. Сомов. – Москва : Проспект, 2017. – Т. 2. – 228 с.

*6.* Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыкл. / Беларус. Энцыкл. ; рэдкал.: В. В. Гетаў [і інш.]. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1993. – 702 с. : іл.

*7. Багласаў, С. Г.* Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыі / С. Г. Багласаў // Помнікі старажытнай беларускай культуры. Новыя адкрыцці / пад. рэд. С. Марцэлева. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – С. 126–132.

*8. Багласов, С. Г.* Возрождение исторического центра Минск (1980–2016 гг.) : научно-реставрационный отчет научного руководителя объекта (документальная хроника) / С. Г. Багласов. – Минск : Изд. Змицер Колас, 2019. – 123 с.: ил.

*9.* Беларуская кафля / А. А. Трусаў [і інш.] ; пад рэд. С. А. Мілючэнкава. – Мінск : Беларусь, 1989. – 150 с.

*10. Гліннік, В. В.* Неабходнасць стратэгіі захавання архітэктурнай спадчыны Беларусі савецкага перыяду / В. В. Глііннік // Праблемы захавання архітэктурнай спадчыны савецкага перыяду. Каштоўнасці мінуўшчыны : матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 12 лістапада 1997 г. / пад рэд. С. В. Марцэлева. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 1999. – С. 45–57.

*11.* Государственная программа «Культура Беларуси» на 2021–2025 годы : утв. постановлением Совета Министров Респ. Беларусь, 29 января 2021 г., № 53 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – URL: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=C22100053&p1=1 (дата обращения: 27.10.2023).

*12. Калнін, В. В.* Мірскі замак / В. В. Калнін. – Мінск : Беларусь, 2002. – 160 с.

13. *Кимеева, Т. И.* Основы консервации и реставрации археологических и этнографических музейных предметов : учебное пособие / Т. И. Кимеева, И. В. Окунева. – Кемерово : Кемер. гос. ун-т культуры и искусств, 2009. – 252 с. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=228103 (дата обращения: 05.05.2021).

14. *Клепиков, Н. Е.* Памятники истории и культуры Беларуси (конец XVIII – первая треть XX в.). Проблемы сохранения / Н. Е. Клепиков. – Минск : Изд. центр БГУ, 2015. – 471 с.

15. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры : 20 ліпеня 2016 г. № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрвеня 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрвеня 2016 г. па стане на 6 лютага 2023 г. / адк. за вып. Н. В. Судзілоўская. – Мінск : Нац. цэнтр прававой інфармацыі Рэсп. Беларусь, 2023. – 280 с.

16. *Локотко, А. И.* Архитектурное наследие Беларуси (развитие традиций, охрана и реставрация) / А. И. Локотко. – Минск : Право и экономика, 2004. – 303 с.

17. *Мартыненко, И. Э.* Законодательство об охране историко-культурного наследия и прокурорский надзор за его исполнением / И. Э. Мартыненко. – Минск : Тесей, 2001. – 245 с.

18. *Мартыненко, И. Э.* Международная и национальная правовые системы охраны историко-культурного наследия государств – участников СНГ : учебное пособие / И. Э. Мартыненко. – Москва : Зерцало-М, 2012. – 943 с.

19. Мірскі замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеефікацыі : Міжнар. навук.-практ. канф., Мір, 4 чэрвеня 2005 г. / навук. рэд. Н. Ф. Высоцкая. – Мінск : Белпрынт, 2006. – 192 с.

20. *Миронова, А. Ф.* Экспертиза и атрибуция изделий декоративно-прикладного искусства : учебное пособие / А. Ф. Миронова. – 2-е изд. – Москва : ФОРУМ : ИНФРА-М, 2021. – 94 с.

21. *Михайловский, Е. В.* Реставрация памятников архитектуры / Е. В. Михайловский. – Москва : Наука, 1971. – 189 с.

22. Памятники всемирного наследия / В. П. Кисель [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл., 1998. – 288 с.

23. *Подъяпольский, С. С.* Реставрация памятников архитектуры / С. С. Подъяпольский. – Москва : МАРХИ, 1983. – 88 с.

24. Простейшая консервация музейных предметов в условиях музея на общественных началах : методические рекомендации / сост. А. А. Маслыко. – Минск : Госмузей БССР, 1988. – 15 с.

25. Реставрация памятников архитектуры : учебное пособие / С. С. Подъяпольский, Г. Б. Бессонов, Л. А. Беляев [и др.]. – Москва : Стройиздат, 1988. – 269 с.

26. Реставрация, исследование и хранение музейных художественных ценностей : обзорная информация / М-во культуры СССР, Гос. б-ка СССР им. В. И. Ленина, Информкультура. – Москва : Наука, 1984. – Вып. 2. Технические средства освещения музеев и реставрационных мастерских. – 48 с.

*27. Рыцарев, К. В.* Европейская реставрационная мысль в 1940–1980-е годы: пособие для изучения теории архитектурной реставрации / К. В. Рыцарев, А. С. Щенков. – Изд. 3-е. – Москва : URSS: Ленанд, 2017. – 93 с.

*28.* Рэстаўрацыя і кансервацыя музейных каштоўнасцей: праблемы і метады іх вырашэння : матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 23–24 лістапада 1999 г. / Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі ; рэд. савет : Л. А. Мяртвішчава (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Анікеенка В. П., 2000. – 83 с.

*29.* Сборник информационно-методических материалов по охране историко-культурного наследия Беларуси / сост. Г. Н. Ходор ; редкол.: С. А. Саракач [и др.] ; М-во культуры Респ. Беларусь. – Гомель : [Б. и.], 2023. – 204 с.

*30. Слюнчанка, В. Г.* Ляцеў з аблокамі я побач : нарысы, артыкулы, эсэ, вершы, успаміны, графіка, выцінанкі / В. Г. Слюнчанка. – Мінск : Артыя груп, 2015. – 207 с.

*31. Слюнченко, В. Г.* Полоцкий Софийский собор : историко-архитектурный очерк / В. Г. Слюнченко. – Минск : Полымя, 1987. – 240 с.

*32. Смолик, А. И.* Культурология : учебное пособие / А. И. Смолик, Ю. П. Бондарь, О. М. Соколова. – Минск : РИВШ, 2025. – 352 с. : ил.

*33.* Список памятников истории и культуры республиканского значения Белорусской ССР : в 2 кн. / науч. ред.: Г. И. Дайлидова [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1990. – Кн. 1 : Памятники истории. Памятники архитектуры. Памятники искусства. – 273 с.

*34.* Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя [і інш.] ; уклад. Т. В. Габрусь. – Мінск : Полымя, 1998. – 351 с.

*35. Трусаў, А. А.* Беларускія кафляныя печы / А. А. Трусаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016. – № 5. – С. 4–17.

*36. Трусаў, А. А.* Манументальнае дойлідства Беларусі XI–XVIII стст. Гісторыя будаўнічай тэхнікі / А. А. Трусаў. – Мінск : Лекцыя, 2001. – 204 с.

*37. Трусаў, А. А.* Мінулае і сучаснасць Лідскага замка / А. А. Трусаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2008. – № 6. – С. 21–23.

*38. Трусаў, А. А.* Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А. А. Трусаў. – Мінск : Харвест, 2015. – 464 с.

*39. Трусаў, А. А.* Эвалюцыя будаўнічых матэрыялаў і тэхнікі манументальнага дойлідства Беларусі XI–XVIII стст. / А. А. Трусаў. – Мінск : БДУКМ, 2020. – 306 с.

*40. Шайхутдинова, А. Р.* Основы реставрации : учебное пособие / А. Р. Шайхутдинова, Р. Р. Сафин, А. Ф. Гараева. – Казань : Казан. науч.-исслед. технологич. ун-т (КНИТУ), 2018. – 108 с. – URL: https://biblioclub.ru/index.php?page=book&id=612759 (дата обращения: 05.05. 2021).

*41.* Школа музейных кансерватараў: бытавая кераміка, этнаграфічны тэкстыль : навукова-метадычны матэрыял / Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры, Нац. музей гісторыі і культуры Беларусі ; уклад. А. Б. Сташкевіч ; навук. рэд. Л. У. Дамнянкова. – Мінск : БелДІПК, 2005. – 75 с.

*42. Шчакаціхін, М.* Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва / М. Шчакаціхін. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 336 с. : іл.

## Слоўнік
## архітэктурных і рэстаўрацыйных тэрмінаў

| | |
|---|---|
| **Аднаўленне** | сукупнасць работ або частковае паўторнае стварэнне матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (для нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей – абавязкова на месцы іх ранейшага знаходжання) |
| **Амбон** | (ад грэч. Ambon – узвышэнне) – узвышанае месца перад алтаром у бажніцы (царкве ці касцёле), звычайна багата аздобленае, адкуль чытаюць тэксты з Бібліі, казанні, прамаўляюць пропаведзі падчас набажэнства. Паводле падання, амбон сімвалізуе Ноеў каўчэг (карабель). Будаваўся ён з натуральнага ці штучнага каменю, дрэва і металу. Часта мае форму трыбуны з парапетам |
| **Анастылоз** | (вяртанне да першапачатковага стану) – метад рэстаўрацыі, накіраваны на вяртанне на свае месца аўтэнтычных блокаў і дэталяў помнікаў архітэктуры, перамешчаных у выніку разбурэнняў ці перабудовы |
| **Антаблемент** | (фр. Entablement ад table – стол, дошка) – верхняя частка будынка, якая падтрымліваецца калонамі, пілястрамі або завяршае сцяну. Антаблемент склаўся ў класічных ордарах манументальнай мураванай архітэктуры Старажытнай Грэцыі і Рыма |
| **Апсіда, абсіда** | (ад грэч. Hapsidos – скляпенне) – паўкруглая, прамавугольная альбо гранёная частка бажніцы, якая выступае за межы сцяны і мае ўласнае перакрыцце. У апсідзе знаходзяцца алтар, клір, месцы для вышэйшых духоўных і свецкіх асоб, культавыя рэліквіі ды інш. |
| **Аркатура, аркатурны пояс** | (фрыз) (ням. arkatur) – рытмічны шэраг дэкаратыўных несапраўдных арак на фасадах будынкаў або на сценах унутры памяшканняў |
| **Артэфакт** | любы выраб, зроблены штучна рукою чалавека, альбо любы прыродны матэрыял, апрацаваны ці падпраўлены чалавекам |

| | |
|---|---|
| **Археалагічныя даследаванні** | комплекс мерапрыемстваў па пошуку, выяўленні і вывучэнні археалагічных аб'ектаў і (або) археалагічных артэфактаў, ажыццяўленні археалагічнага нагляду пры выкананні работ на тэрыторыі археалагічных аб'ектаў |
| **Археалагічныя камеральныя работы** | комплекс мерапрыемстваў па ачыстцы, вывучэнні, кансервацыі і (або) рэстаўрацыі археалагічных артэфактаў |
| **Бабінец** | (прытвор) – папярэдняя частка бажніцы, частка асноўнага аб'ёму будынка пад хорамі або самастойны аб'ём храма, злучаны прамавугольнымі арачнымі праёмамі з асноўнай часткай будынка |
| **Базіліка** | (ад грэч. basilike – царскі дом) – тып антычнага, потым сярэдневяковага будынка, прамавугольнага ў плане, падзеленага ўздоўж шэрагамі калон на некалькі (звычайна – 3, радзей – 5) частак (так званых караблёў або нэфаў). Сярэдні нэф, завершаны апсідай, вышэйшы і шырэйшы за бакавыя |
| **Балясіна** | невысокі фігурны слупок, які падтрымлівае парэнчы балкона, лесвіцы парапета і інш. Робіцца з дрэва, каменю, металу, бетону. Бывае плоская, круглая ці гранёная ў сячэнні |
| **Галерэя** | (фр. galerie, ад італ. galleria): 1) бакавыя памяшканні з вокнамі, прыбудаваныя да асноўнага аб'ёму храма XI–XII стст.; 2) доўгае крытае светлае памяшканне, у якім адну вонкавую падоўжную сцяну замяняе каланада; 3) спецыяльныя зальныя памяшканні ў палацах, асветленыя суцэльнымі шэрагамі вялікіх вокнаў; 4) калідор з суцэльнымі ваконнымі праёмамі на адным з бакоў будынка. У Беларусі ў XVI–XVII стст. існавалі ў манастырах і кляштарах |
| **Гзымс** | (карніз) – гарызантальны выступ, які завяршае сцяну будынка, ваконныя і дзвярныя праёмы, падтрымлівае дах і ахоўвае сцяну ад сцёку вады, падзяляе фасад на асобныя ярусы і завяршае цокаль збудавання |
| **Гісторыка-культурная каштоўнасць** | культурная каштоўнасць, якая мае адметныя духоўныя, мастацкія, дакументальныя, архітэктурныя і (або) канструктыўныя вартасці і якой нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці |
| **Гнейс** | горная парода, якая складаецца з кварцу, палявых шпатаў і аднаго ці некалькіх цемнаколерных мінералаў |

| | |
|---|---|
| **Дапаўненне** | сукупнасць работ і мерапрыемстваў па дабаўленні адсутных частак да аб'екта, каб аднавіць яго цэласнасць альбо знешні выгляд, у тым ліку па завяршэнні нерэалізаваных аўтарскіх задум |
| **Зандаж** | абмежаванае па плошчы раскрыццё помніка архітэктуры з мэтай яго вывучэння і рэстаўрацыі. Праводзіцца такім чынам, каб нанесці будынку найменей страт. Зандажам звычайна надаюць правільныя, геаметрычныя абрысы, каб іх можна было ўключыць у музейную экспазіцыю |
| **Іонік (-авы)** | (ад лац. ovum – яйка) – арнаментальны матыў з яйкападобных пукатасцяў, завостраных уніз і зрэзаных зверху, абмаляваных хвалікамі, якія чаргуюцца з павернутымі вастрыём уніз стральчатымі лісцямі |
| **Какошнік** | паўкруглая ці кілепадобная архітэктурная дэталь, якая размяшчаецца (даволі часта ярусамі) каля асновы шатроў і барабанаў купалаў культавых будынкаў. Ужывалася таксама ў аздабленні фасадаў грамадскіх будынкаў у канцы XIX – пачатку XX ст. |
| **Кансервацыя** | сукупнасць работ і мерапрыемстваў па часовым або доўгатэрміновым забеспячэнні захаванасці тэхнічнага стану матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей |
| **Контрфорс** | (ад фр. contre force – процідзейная сіла) – у архітэктуры папярэчная сценка, вертыкальны слуп або выступ ці рабро для ўмацавання апорнай канструкцыі (пераважна сцяны). Рабіліся ўздоўж сценаў і на кутах будынка |
| **Крыжова-купальная сістэма** | архітэктурная сістэма (кампазіцыя), у якой да падкупальнай прасторы ў цэнтры храма звернутыя цыліндрычныя скляпенні галін крыжа, якія ў цэлым ствараюць крыжападобную структуру |
| **Літургія** | набажэнства, у якім выкладаецца сутнасць асноўных ідэй хрысціянскага светапогляду |
| **Маньерызм** | (італ. Manierismo, ад maniera – манера, стыль) плынь у еўрапейскім мастацтве XVI ст., якая адлюстроўвала крызіс гуманістычнай культуры Адраджэння. У архітэктуры маньерызму ўласціва імкненне да празмернага падкрэслівання асобных дэталяў дэкору |

| | |
|---|---|
| **Маскарон** | (ад італ. Mascherone – вялікая маска) – дэкаратыўны рэльеф у выглядзе чалавечага твару або галавы жывёлы. Размяшчаецца ў цэнтры арак, ваконных і дзвярных праёмаў, на франтонах, а таксама кафлі, мэблі, посудзе і інш. |
| **Мастак-рэстаўратар** | спецыяліст, які выконвае кансервацыю і рэстаўрацыю музейных прадметаў |
| **Меандр** | геаметрычны арнамент у выглядзе ламанай пад прамым вуглом лініі, якая ў цэлым глядзіцца як вузкая паласа |
| **Нервюра** | (фр. nervure, ад лац. Nervus – жыла, сухажылле) – арка з абчасаных клінападобных камянёў або спецыяльных фігурных цаглін, якая ўмацоўвае рэбры крыжовага, сеткавага, зорчатага і іншых форм скляпення |
| **Ордар** | (ням. Order, фр. orde, лац. Ordo – рад, парадак) архітэктурны – пэўнае спалучэнне апорных, нясучых частак стойкава-бэлечнай канструкцыі, іх структура і мастацкая апрацоўка. Дарычны, іанічны і карынфскі ордары ўзніклі ў Старажытнай Грэцыі |
| **Пілястра** | (італ. pilastro, ад лац. pila – калона, слуп) – плоскі вертыкальны прамакутны ў плане выступ на сцяне або слупе, які паўтарае ўсе часткі калоны архітэктурнага ордара |
| **Порцік** | (лац. porticus) – галерэя, звычайна перад галоўным уваходам у будынак, якая ўтворана калонамі ці слупамі і завяршаецца франтонам |
| **Прыстасаванне** | сукупнасць работ і мерапрыемстваў па адаптацыі матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей да патрэбнасцей і асаблівасцей сучаснага тэхнічнага ўтрымання без дапушчэння страты імі адметных духоўных, мастацкіх і (або) дакументальных вартасцей |
| **Раманскі стыль** | стыль сярэдневяковага заходнееўрапейскага мастацтва X–XII стст. Збудаванні вызначаліся манументальнасцю, масіўнасцю канструкцый, аздабляліся абстрактна-геаметрычным арнаментам і скульптурай. Спачатку будынкі мелі плоскія драўляныя перакрыцці, пазней – цыліндрычныя і нарэшце – крыжовыя |
| **Раскрыццё** | сукупнасць работ і мерапрыемстваў па пазбаўленні матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей ад пазнейшых дысаніруючых напластаванняў |

| | |
|---|---|
| **Ратонда** | (італ. rotunda, ад лац. rotondus – круглы) – круглае ў плане цэнтральнае збудаванне звычайна з размешчанымі па перыметры калонамі, завершанае купалам. Найбольш пашыраны тып храма-ратонды ўласцівы для архітэктуры класіцызму |
| **Рэгенерацыя** | сукупнасць работ і мерапрыемстваў па аднаўленні цэласнасці і агульнага кампазіцыйнага рашэння матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей (у асноўным комплексу або ансамбля) і (або) гістарычнага характару размяшчэння нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у навакольным асяроддзі |
| **Рэканструкцыя** | сукупнасць работ і мерапрыемстваў, накіраваных на выкарыстанне па новым прызначэнні нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей і (або) звязаных са змяненнем іх асноўных тэхніка-эканамічных паказчыкаў і параметраў |
| **Рэстаўрацыя** | сукупнасць работ і мерапрыемстваў па аднаўленні парушанага першапачатковага аблічча нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключаючы капітальныя пабудовы (будынкі, збудаванні), іх комплексы, часткі, якія выконваюцца на аснове спецыяльных даследаванняў гістарычнай дакладнасці і архітэктурна-мастацкай каштоўнасці |
| **Руст** | спосаб апрацоўкі каменю або імітаванага пад камень аблямовачнага матэрыялу (тынкоўкі дрэва і інш.), пры якім кожны камень ці яго імітацыя вылучаецца перыметральным кантам featured formы |
| **Сакрысція** | бакавое памяшканне ў хрысціянскай бажніцы, прыбудова з паўднёвага або паўночнага боку, што дапасуецца да апсіднай часткі храма. У ёй звычайна захоўваўся літургічны рыштунак, ксяндзы рыхтаваліся да літургічных абрадаў |
| **Скляпенне** | апорная прасторавая канструкцыя для перакрыцця ці накрыцця збудаванняў, якая мае крывалінейны абрыс. Скляпенне бывае розных форм: цыліндрычнае, крыжовае, люстраное. Разнавіднасць скляпення – купал |
| **Стука, стук** | (італ. stucco, фр. stuk, ням. stuck – апрацоўваць) – штучны мармур, матэрыял для аздобы сцен і архітэктурных дэталяў. Вырабляюць з абпаленага гіпсу ў спалучэнні з галуном і клеем, часам з дамешкамі мармуровай пудры |

| | |
|---|---|
| **Фасад** | вонкавы бок пабудовы. Адрозніваюць фасады: галоўны, бакавыя, дваровы, вулічны, паркавы і інш. |
| **Флігель** | (ад ням. flugel – крыло) – дадатковая прыбудова да жылога дома або асобны будынак, які ўваходзіў у сядзібны комплекс |
| **Франтон** | (ад лац. Frons (frontis) – лоб, пярэдні бок) – верхняя частка (звычайна ў выглядзе трохкутніка) фасада будынка альбо порціка, абмежаваная схіламі даху і гзымсам |
| **Хоры** | (ад грэч. choros – хор) – верхняя адкрытая галерэя ў інтэр'ерах храмаў, у парадных залах ды інш. На іх звычайна размяшчаюцца музыканты, пеўчыя, арган |
| **Цокаль** | ніжняя частка вонкавай сцяны будынка над падмуркам. Узнік як умацаванне гэтай часткі сцяны, часта дэкарыруецца |
| **Цяга** | цагляны, каменны або тынкавальны паясок, які падзяляе вонкавыя і ўнутраныя сцены, аблямоўвае столь і пано |
| **Шчыпец** | верхняя частка сцяны трохкутнай формы, абмежаваная схіламі даху. Не мае гзымса знізу, але часта мае складаны малюнак завяршэння |
| **Эркер** | (ням. erker – дуга, лук) – паўкруглы, трохкутны ці шматкутны выступ на плоскаці сцяны будынка з зашклёнымі вокнамі. Вырашаецца ў выглядзе прысценнай канструкцыі на кансолях |

## ІЛЮСТРАЦЫІ



Мал. 1. Полацкая Сафія. Рэканструкцыя аўтара. Мастак Р. Данчанка



Мал. 2. Полацкая Сафія. Рэканструкцыя аўтара. Мастак Р. Данчанка



Мал. 3. Полацкі Сафійскі сабор пасля рэстаўрацыі. Муроўка XI ст.



Мал. 4. Полацкая Сафія. Археалагічны музей.
Рэшткі паўкупальнага слупа XI ст. Фота І. Чарняўскага



Мал. 5. Віцебская Дабравешчанская царква XII ст.
Фрагмент муроўкі пасля кансервацыі. 1982 г.



Мал. 6. Віцебская Дабравешчанская царква. Рэканструкцыя вакна XII ст.




Мал. 7. Полацк. Вялікі сабор Бельчыцкага манастыра.
Фрагмент падлогі XII ст. Раскопкі І. Хозерава. 1928 г.



Мал. 8. Музейны павільён на рэштках храма XII ст. у Тураве




Мал. 9. Павільён пад рэшткамі будынка XII ст. Гродна. Стары замак. Фрагмент экспазіцыі. 2010 г.



Мал. 10. Рэканструкцыя цэнтральнай часткі падлогі Ніжняй царквы XII ст. Гродна. Аўтар М. Малеўская



Мал. 11. Ніжняя царква і княжацкі палац XII ст. Гродзенскі дзядзінец.
Рэканструкцыя У. Бачкова



Мал. 12. Барысаглебская (Каложская) царква XII ст. Гродна.
Рэльефны знак на тарцы плінфы



Мал. 13. Гродна. Рэшткі абарончай сцяны XII ст. на паўночным схіле
Замкавай гары. Раскопкі аўтара



Мал. 14. Рэшткі мінскага храма пасля раскопак. Паводле Э. Загарульскага



Мал. 15. Дамініканскі касцёл XVII ст. Мінск.
Байніца ніжняга бою. Раскопкі З. Пазняка



Мал. 16. Мінск. Замчышча. Раскопкі абарончых збудаванняў XI–XII стст.



Мал. 17. Мінск. Замчышча. Раскопкі абарончых збудаванняў XI–XII стст.



Мал. 18. Макет аднаўлення гістарычнага цэнтра Мінска.
Распрацаваны групай спецыялістаў пад кіраўніцтвам С. Багласава.
1979–1980 гг.



Мал. 19. Мінск. Траецкае прадмесце. 1980-я гг.



Мал. 20. Лідскі замак. Вежа Вітаўта. XIV ст. Першы паверх.
Раскопкі аўтара. 1978 г.



Мал. 21. Лідскі замак. Вежа Вітаўта. Пачатак рэстаўрацыі. 1978–1979 гг.



Мал. 22. Лідскі замак. Аднаўленне замкавай вежы. 2010 г.



Мал. 23. Рэшткі падмуркаў гродзенскага Фарнага касцёла, узарванага ў 1961 г.



Мал. 24. Выраб цэглы ў XIV–XV стст. Малюнак У. Кіслага



Мал. 25. Выраб цэглы. XVI ст. Малюнак з кнігі 1590 г.
Паводле В. Левандаўскаса



Мал. 26. Выраб вапны ў Сярэдневякоўі. Паводле В. Левандаўскаса



Мал. 27. Малюнак будоўлі ў XIV ст. Заходняя Еўропа.
Паводле В. Левандаўскаса



Мал. 28. Мірскі замак. Вежа XVI ст. да рэстаўрацыі



Мал. 29. Мірскі замак. Паўночна-ўсходняя вежа пасля рэстаўрацыі



Мал. 30. Цэнтральная частка будынка канца XVI–XVII ст.
у ваколіцах Мірскага замка. Раскопкі І. Ганецкай



Мал. 31. Старажытны тынкоўшчык. Паводле В. Левандаўскаса




Мал. 32. Замак Стэфана Баторыя. Канец XVI ст. Гродна.
Рэканструкцыя У. Бачкова



Мал. 33. Дахоўка XVI ст.



Мал. 34. Брэсцкая Мікалаеўская царква, накрытая пляскатай дахоўкай.
Малюнак 1596 г.



Мал. 35. Зграфіта на галоўным фасадзе Брыгіцкага касцёла
XVII ст. пасля рэстаўрацыі. Гродна.



Мал. 36. Гаршковая кафля XV – пачатку XVII ст.
Крэўскі замак. Раскопкі аўтара



Мал. 37. Гаршковая кафля XV ст. пасля рэстаўрацыі. Лідскі замак.
Рэстаўратар У. Угрыновіч



Мал. 38. Краціістая (зробленая ў выглядзе кратаў) кафля
XV–XVI стст. Вільня



Мал. 39. Рэканструкцыя печы з міскавай кафлі XV ст. Швецыя



Мал. 40. Паліхромная кафля канца XVI – пачатку XVII ст.
Мірскі замак. Раскопкі аўтара



Мал. 41. Паліхромная кафля-каронка. Мірскі замак. Раскопкі аўтара



Мал. 42. Кафля другой паловы XVI ст. Крэўскі замак. Раскопкі аўтара



Мал. 43. Паліхромная геральдычная кафля XVI ст. Мірскі замак.
Раскопкі аўтара




Мал. 44. Паліхромная геральдычная кафля XVII ст. Гальшанскі замак.
Раскопкі І. Чарняўскага. Рэстаўрацыя У. Угрыновіча



Мал. 45. Сцяпан Палубес (майстар з Мсціслава).
Кафля XVII ст. з выявай евангеліста. Масква



Мал. 46. Кафля. Канец XVII – пачатак XVIII ст. Мсціслаў



Мал. 47. Віцебская кафля XVIII ст. Ратуша.
Раскопкі І. Чарняўскага і І. Цішкіна



Мал. 48. Кафляная печка канца XVIII – пачатку XIX ст.
Сядзіба ў в. Жамыслаў (Іўеўскі р-н). Фота А. М. Кушнярэвіча. 1987 г.



Мал. 49. Старыя дзверы
Ішкалдскага касцёла XV ст.
Фота аўтара



Мал. 50. Разныя дзверы XVIII ст.
Полацк. Паводле А. Салаўёва



Мал. 51. Ключы XVIII ст. пасля рэстаўрацыі.
Крэўскі замак. Раскопкі аўтара



Мал. 52. Археалагічны музей «Бярэсце»

*Вучэбнае выданне*

**Трусаў** Алег Анатольевіч

**АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ МАТЭРЫЯЛЬНЫХ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ**

*Вучэбны дапаможнік*

Рэдактар В. М. Сакалова
Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік
Дызайн вокладкі М. М. Чудук

Падпісана ў друк 15.09.2025. Фармат 70х108 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Лічбавы друк.
Ум. друк. арк. 9,45. Ул.-выд. арк. 8,78. Тыраж 60 экз. Заказ 928.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск